Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ПЯТНІЦА, 29 мая 1981 г. № 22 (3068) Выходзіць з 1932 г. Цана 8 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

1 ЧЭРВЕНЯ — МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ АБАРОНЫ ДЗЯЦЕЙ

ВІЦЬКА.

Фотаэцюд А. ТАЛКАЧОВА.

АД ПЯТНІЦЫ ДА ПЯТНІЦЫ

НАРАДА МІНІСТРАЎ КУЛЬТУРЫ

25—26 мая ў Маскве адбылася нарада міністраў культуры саюзных рэспублік. Яе ўдзельнікі абмеркавалі задачы органаў і ўстаноў культуры і мастацтва, што вынікаюць са Справаздачнага даклада ЦК КПСС XXVI з'езду партыі, з якім выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў, і рашэнняў з'езда.

На нарадзе падкрэслівалася, што задачы, пастаўленыя XXVI з'ездам партыі ў галіне культуры і мастацтва, абавязваюць прынцыпова па-новаму вырашаць многія пытанні, звязаныя з актыўным удзелам работнікаў культуры ў рэалізацыі стратэгічных накірункаў партыі ў галіне эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны, ідэалагічнага забеспячэння выканання заданняў адзінаццатай пяцігодкі. Першаступеннай важнасці задача заключаецца ў тым, каб забяспечыць арганічную сувязь культуры і мастацтва з ажыццяўленнем планаў камуністычнага будаўніцтва, з ідэйна-палітычным і духоўным жыццём грамадства.

На нарадзе выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, міністр культуры СССР П. Н. Дземічаў.

ТАСС.

ПРОСТА ФАКТ

Папулярнасцю ў дзетвары Брэстчыны карыстаюцца спектаклі абласнога тэатра лялек. Вось і нядаўна артысты з поспехам выступілі ў Камянецкім раёне. Каля 1.300 юных гледачоў пазнаёміліся са спектаклем «Крок у неўміручасць» па п'есе Н. Мацяш, у якім расказваецца пра подзвіг школьніка з Пружаншчыны Ціхана Барана, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны паўтарыў подзвіг Івана Сусаніна.

М. МАМУС.

●

30-гадовы юбілей адзначыла Рэчыцкая музычная школа. За гэты час 630 навучэнцаў атрымалі тут музычную адукацыю, а некаторыя з іх, як М. Бур'ян, М. Дабрысіна, Р. Сергіенка, А. Бабчанка, закончылі кансерваторыю. Юныя музыканты былі неаднаразовымі ўдзельнікамі абласных і рэспубліканскіх конкурсаў.

Б. ЛУНЬКОЎ,
Я. ТУЛУПАЎ.

●

Сакратарыят ВЦСПС разгледзеў вынікі Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва работнікаў кінасеткі прафсаюзаў. Сярод пераможцаў — калектыў работнікаў кінасеткі Магілёўскага абласнога савета прафсаюзаў, адзначаны дыпломам ВЦСПС.

Л. АЛЕНЬКІН.

●

У Маскве ў Дзяржаўнай бібліятэцы СССР імя У. І. Леніна адкрыта выстаўка выданняў-лаўрэатаў XXII Усесаюзнага конкурсу «Мастацтва кнігі». Сталічныя кнігалюбы з задавальненнем знаёмяцца і з лепшымі кнігамі беларускіх выдавецтваў: сувенірнымі выданнямі кніг Л. І. Брэжнева «Малая зямля», «Адраджэнне», «Цаліна», работай У. І. Леніна «Задачы Саюзаў Моладзі», зборнікам «Пісьмы працоўных Беларусі У. І. Леніну» і іншымі.

А. КАСЯНКОЎ.

●

У горадзе Нежыне Чарнігаўскай вобласці на базе педагагічнага інстытута імя М. В. Гогаля праведзена студэнцкая навуковая канферэнцыя «Літаратурнае Палессе». З дакладамі на ёй выступілі студэнты Сумскага, Кіеўскага, Нежынскага педінстытутаў і Гомельскага універсітэта. Працавалі тры секцыі «Палессе ў дакастрычніцкай літаратуры», «Палессе ў савецкай літаратуры» і «Мова твораў мастацкай літаратуры».

Многіх зацікавіў даклад студэнткі ГДУ Л. Мележ «Гомельшчына літаратурная».

М. ПАПІЛЬНЮХ.

●

У клубе Барысаўскага завода трактарных агрэгатаў арганізавана выстаўка работ мясцовага мастака Валерыя Клімава. Наведвальнікі з цікавасцю знаёмяцца з яго работамі «Абарона Радзімы», «Наша будучае», «Музыка» і іншымі.

А. БЕНЯНСОН.

●

У харавым калектыве Петрыкаўскага райспажыўсаюза — 30 чалавек. Самадзейныя артысты выступілі з канцэртам на сцэне раённага Дома культуры.

А. ЖЫЖНЕЎСКІ.

●

Жыхары інтэрната Мінскага завода ацяпляльнага абсталявання сустрэліся з удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны — Героем Савецкага Саюза А. Барданавым, пісьменнікамі У. Федасеенкам і М. Скрыпкам.

Я. ЦУМАРАЎ.

●

Да маладых аршанскіх культасветработнікаў прыехаў паэт Д. Сімановіч. Ён прачытаў свае вершы, падзяліўся творчымі планамі, расказаў пра літаратурную і культурную гісторыю азёрнага краю.

К. СЕВЯРЫНЕЦ.

ДЫПЛОМ — «ПЛАЧУ ПЕРАПЁЛКІ»

Сёлета вясной лепшыя тэатры краіны паказвалі ў Маскве спектаклі, якія яны падрыхтавалі да XXVI з'езда КПСС. Беларусь на гэтым усесаюзным агляднзе была прадстаўлена Акадэмічным тэатрам імя Янкі Купалы, на сцэне якога да знамянальнай падзеі была паказана народная драма «Плач перапёлкі» Івана Чыгрынава.

Міністэрства культуры СССР падвяло творчыя вынікі агляду і назвала лепшыя работы яго ўдзельнікаў — прадстаўнікоў шматнацыянальнага савецкага тэатра. Дыпломам першай ступені адзначана пастаноўка «Плача перапёлкі» заслужанага дзеяча мастацтваў БССР В. Раеўскага (сцэнаграфія заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Б. Герлавана, музыка заслужанага дзеяча мастацтваў БССР С. Картэса). Міністэрства павіншавала калектыў купалаўцаў з гэтым творчым дасягненнем.

М. КАСАЧ.

«НЕСЦЕРКА» Ў МАГІЛЁВЕ

На гастролі ў Магілёў прыехаў Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа. Адкрыццё гастроляў адбылося ў Палацы культуры вытворчага аб'яднання «Хімвалакно» імя У. І. Леніна.

Начальнік абласнога ўпраўлення культуры А. Барадзінаў павіншаваў работнікаў мастацтва суседняй вобласці, з якой Магілёўшчына спаборнічае, пажадаў ім поспеху. Гасцям паднеслі хлеб-соль. Дырэктар тэатра Г. Асвяцінскі падзякаваў за гасціннасць і цёплы прыём, прадставіў артыстаў. Ён сказаў, што ў 1941 г. у Віцебску ўпершыню была паказана п'еса В. Вольскага «Несцерка», і цяпер, у Магілёве, спектакль адзначае сваё саракагоддзе.

З вялікім поспехам прайшоў паказ «Несцеркі» ў Магілёве. У галоўнай ролі выступіў народны артыст СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Ф. Шмакаў. У спектаклі былі заняты народная артыстка БССР З. Канапелька, народны артыст БССР І. Матусевіч, заслужаны артыст БССР Б. Левін і іншыя.

У праграме гастроляў — спектаклі па п'есах «Зацюканы апостал» А. Макаёнка, «Заставайцеся сонцам» А. Папаяна, «Стары дом» А. Казанцава, «Энергічныя людзі» В. Шукшына, «Клеменс» К. Сая.

А. ВАСІЛЬЕЎ.

САВЕЦКА-БАЛГАРСКАЙ ДРУЖБЕ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Дню славянскай пісьменнасці, балгарскай асветы і культуры была прысвечана сяброўская сустрэча, у якой прынялі ўдзел група работнікаў народнай асветы Балгарыі і актывісты Беларускага аддзялення таварыства савецка-балгарскай дружбы, што адзначае 20-годдзе сваёй дзейнасці.

Ішла размова аб развіцці сяброўскіх сувязей, аб патрыятычным і інтэрнацыянальным выхаванні падрастаючага пакалення. Удзельнікі сустрэчы азнаёміліся з выстаўкай работ мастака Сяргея Салохіна аб Балгарыі.

БЕЛТА.

ВЕЧАРЫ, СУСТРЭЧЫ

ІМКЛІВЫ МУЗЫКІ ЎЗЛЁТ

«Беларусь мая — песня», «Явар і каліна», «Ты мне вясною прыснілася», «Славім мы свой край любімы»... Хто не ведае гэтых і многіх іншых твораў народнага артыста БССР, кампазітара Юрыя Семянякі. Ціхія і задушэўныя, на дзіва мілагучныя і блізкія да фальклорнай асновы, яго пес-

ВІТАЛІ ПАЭТА ЗЕМЛЯКІ

ЧЫМ ПАРАДАВАЎ СЕЗОН

Завяршыўся пятнаццаты сезон у рэспубліканскім Доме работнікаў мастацтваў. Ён быў знамянальны тым, што праходзіў у год работы XXVI з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, і ўсе намаганні былі накіраваны на тое, каб прапагандаваць лепшыя дасягненні беларускага мастацтва.

І вось — падвядзенне вынікаў работы за сезон.

Пра тое, што зроблена за сезон, гаварыў у выступленні старшыня прэзідыума праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання, народны артыст БССР М. Яроменка. Са словамі ўдзячнасці да акцёраў звярнуліся прадстаўнік вытворчага аб'яднання «Гарызонт» П. Лаўрыновіч, старшыня Маладзечанскага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры В. Ляшковіч, прадстаўнікі ЧБВА і іншыя.

Адбыўся святочны канцэрт, у якім прынялі ўдзел народная артыстка БССР М. Захарэвіч, заслужаная артыстка рэспублікі Г. Рыжкова, артыст В. Анісенка і іншыя.

На здымку: на вечары выступае Ігар Лучанок.

Я. САЛАВЕЙ.
Фота Ул. КРУКА.

ПРЭМ'ЕРЫ

«Апошняе спатканне» — так называецца п'еса Аляксандра Галіна, прэм'ера спектакля па якой адбылася ў Акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы (пераклад Б. Сачанкі).

У спектаклі заняты народная артыстка СССР Г. Макарава, народныя артысты БССР Л. Давідовіч, Г. Аўсянікаў, П. Кармунін, заслужаныя артысты рэспублікі М. Федароўскі, Г. Талкачова і іншыя.

На здымку: у ролях Вячаслава, Марыны і Ермалаева артысты В. Манаеў, С. Некіпелава і народны артыст БССР Г. Аўсянікаў. Фота Ул. КРУКА.

У Дзяржаўным рускім драматычным тэатры БССР імя М. Горкага адбылася чарговая прэм'ера. На мінскай сцэне атрымала сцэнічнае ўвасабленне камедыя Р. Штраля «Прынц Арно фон Волькенштэйн». У ролях заняты народны артыст БССР Ю. Ступакоў, заслужаныя артысты рэспублікі В. Краўчанка, І. Ражба, А. Кашкер і іншыя.

ні зачароўваюць слухачоў розных узростаў. У набытак беларускага нацыянальнага музычнага мастацтва ўвайшлі ягоныя оперы «Калючая ружа», «Калі ападае лісце», «Зорка Венера», аперэта «Паўлінка», напісаныя на лібрэта Алеся Бачылы. Ю. Семяняка плённа супрацоўнічае і з многімі іншымі беларускімі пісьменнікамі, кожны раз знаходзячы з імі той творчы кантакт, што адразу дапамагае стварэнню клімата ўзаемаразумення.

Таму не выпадкова, што творчы вечар Юрыя Уладзіміравіча і адбыўся менавіта ў Доме літаратара. Там, дзе кампазітар часта бывае. Дзе ў яго шмат добрых сяброў сярод беларускіх пісьменнікаў.

Пра творчую садружнасць з Ю. Семянякам, пра яго ўклад у развіццё беларускага мастацтва хораша гаварыў на вечары А. Бачыла. А што творы кампазітара вартыя ўвагі, добра засведчыў канцэрт, у якім прынялі ўдзел хор Беларускага тэлебачання і радыё пад кіраўніцтвам народнага артыста БССР В. Роўды, народная артыстка БССР Н. Гайда, заслужаны артыст рэспублікі Ю. Смірноў, Т. Пячынская і іншыя.

На здымку: сябры па творчасці — сябры ў жыцці: А. Бачыла і Ю. Семяняка.

Фота Ул. КРУКА

З'ЯДНАЛА ДРУЖБА

Граніца... Пры гэтым слове ўяўляюцца паласатыя слупы, вартавыя на пастах.. А тут, на стыку трох братніх рэспублік— Расійскай Федэрацыі, Украіны і Беларусі,—зялёныя хвалі збажыны, цяністыя шаты лясоў. Адзінай, дружнай сям'ёй жывуць савецкія людзі. І штогод па ініцыятыве Гараднянскага райкома Кампартыі Украіны тут праводзяцца інтэрнацыянальныя літаратурныя вечары.

На гэты раз традыцыйнае мерапрыемства адбылося ў невялікай вёсцы Дзеравіны. Літаратурны вечар адкрыла сакратар Гараднянскага райкома КПУ Г. П. Лабада.

Прысутных віталі сакратар партарганізацыі мясцовага калгаса імя XX з'езда КПСС С. Юшчанка, прадстаўнікі Бранскай абласной пісьменніцкай арганізацыі А. Саўкін і А. Раманюк, беларускі паэт М. Янчанка, а таксама чарнігаўскія літаратары С. Рэп'ях, А. Алейнік, В. Прымостка і іншыя. Гучалі вершы і празаічныя творы на трох братніх мовах, аднолькава блізкія і зразумелыя ўсім.

П. СТРЫБУК.

У РЭПЕРТУАРЫ — ЯСЕНІН

З поспехам прайшлі ў Гомелі, Слуцку, Брэсце канцэрты лаўрэата Маскоўскага конкурсу вакалістаў спявачкі Веры Прокушавай, вядомай выканаўцы музычнай «Ясеніяны». І на гэты раз у яе рэпертуары — папулярныя песні і рамансы на вершы С. Ясеніна, арыі з оперы «Анна Снегіна».

— Я,— гаворыць спявачка, — як і мільёны людзей нашай краіны, вельмі люблю паэзію С. Ясеніна за яе чысціню і выключную шчырасць. Менавіта гэтыя рысы робяць паэтычныя радкі цудоўным матэрыялам для стварэння музычных твораў. Творчасць Ясеніна чакае свайго Глінкі, свайго Чайкоўскага.

Слонім для вядомага беларускага паэта і вучонага-філолага Алега Лойкі — самы дарагі куточак беларускай зямлі. Тут ён нарадзіўся, адсюль пайшоў у вялікі свет. Сюды часта прыязджае, калі працуе над новымі творамі, а дзе, як не ў родных мясцінах, найлепш думаецца і пішацца. Не выпадкова што і свой юбілейны вечар — а ў маі сёлетняга года Алегу Антонавічу споўнілася пяцьдзесят гадоў — ён вырашыў правесці ў горадзе свайго маленства.

У Слонімскім раённым Доме культуры сабраліся рабочыя прадпрыемстваў горада, калгаснікі, навучэнцы. Вечар адкрыў першы сакратар гаркома партыі К. І. Лушнеўскі.

Вітаць юбіляра прыехалі народны пісьменнік Беларусі І. Шамякін, пісьменнікі Р. Барадулін, Д. Бугаёў, М. Грынчык, У. Дамашэвіч, А. Жук, В. Зуёнак, В. Рагойша, Р. Семашкевіч, П. Ткачоў і іншыя.

Юбіляру былі ўручаны віншавальныя адрасы Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў СССР, землякі паднеслі А. Лойку хлеб-соль і сувеніры.

Артысты мінскіх тэатраў выканалі песні на словы юбіляра, а артысты Слонімскага народнага тэатра паказалі літаратурную кампазіцыю.

Вёў вечар сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР А. Вярцінскі.

Д. ВІКТАРАЎ.

Фота А. КАЛЯДЫ.

НЕ ТОЛЬКІ Ў ЭФІРЫ

Часцей за ўсё мы сустракаемся з гэтым музычным калектывам у радыёканцэртах, радзей — у перадачах тэлебачання. Сустрэчы з ім у філарманічнай зале зусім нешматлікія і таму — прыкметныя. Як, напрыклад, канцэрт у філармоніі 21 мая, калі сімфанічны аркестр Беларускага тэлебачання і радыё пад кіраўніцтвам заслужанага артыста рэспублікі Б. Райскага выступіў з вялікай праграмай.

Музычных прэм'ер у той вечар не было. Выконвалася Першая сімфонія Л. Бетховена, творы беларускіх кампазітараў. Гэта «апрабаваныя» ўжо, добра вядомыя слухачу вакальна-сімфанічная паэма С. Картэса на вершы Э. Межэлайціса «Попел» (саліст С. Машкоў), Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам Л. Абеліёвіча (саліст лаўрэат Міжнароднага конкурсу І. Алоўнікаў), другая сюіта з балета Я. Глебава «Выбранніца».

Вядома, сталыя наведвальнікі гэтай залы прызвычаіліся слухаць музыку ў выкананні Акадэмічнага сімфанічнага аркестра БССР: дырыжоры бываюць на гастролях у Мінску значна часцей, чым вялікія аркестравыя калектывы. А своеасаблівы бенефіс калектыву, які прапагандуе ў эфіры музыку самых розных жанраў, створаную пераважна беларускімі аўтарамі, але які вядомы нам «завочна», даў слухачам магчымасць пачуць знаёмыя творы ў свежым выкананні. А значыць, і ўспрыняць іх па-новаму. Таму і панаваў на канцэрце амаль прэм'ерны настрой.

С. ВЕТКА.

Фота Ул. КРУКА.

Дзяржаўны тэатр лялек БССР падрыхтаваў новы спектакль — пастаўлена п'еса «Гадзіннік з зязюляй» С. Пракоф'евай. Рэжысёр —В. Казлова, мастак—Л. Герлаван. Гэты казачны твор адрасаваны самым маленькім гледачам.

Фота А. ВАЙНШТЭЙНА.

У БАЛГАРСКІМ ЧАСОПІСЕ

«Картинная галерея» — так называецца літаратурна-мастацкі часопіс для дзяцей і юнацтва, які выходзіць на балгарскай і рускай мове і выдаецца саюзамі балгарскіх пісьменнікаў і мастакоў. Нядаўна чытачы атрымалі другі нумар за сёлетні год. Сярод іншых твораў у «Картинной галерее» змешчаны і вядомы верш Э. Агняцвет «Доктар Смех», перакладзены на балгарскую мову Героем Сацыялістычнай Працы НРБ Асенам Босевым.

ПІСЬМО ТЫДНЯ

ШТО ГАВОРАЦЬ РЭЛІКВІІ

Напісаць гэты ліст мяне прымусіў абед у кафэ «Вясна», што ў цэнтры Мінска. Але гаворка пойдзе не пра якасць страў ці культуру абслугоўвання. Якраз гэта тут на звычайным сярэднім узроўні. Гаворка пойдзе пра іншае. У час абеду я нечакана зірнуў на пластмасавую вазачку з папяровымі сурвэткамі і не паверыў сваім вачам. Журботная постаць старога з забітым сынам на руках, здаецца, вось-вось зробіць крок з малюнка. Набатам гуло, агнём гарэла слова—«Хатынь». І ўсё гэта на вазачцы для сурвэтак! Я ўявіў, як бяруць гэтую вазачку ап'янелыя і не вельмі ап'янелыя наведвальнікі, як побач капаюць на абрус кроплі піўной пены. Стала балюча і горка.

На жаль, ніякіх «апазнавальных знакаў» завода, дзе рабілася тая вазачка, не было. Але ж хтосьці зацвердзіў гэтую прадукцыю, яна, напэўна, прайшла і мастацкі савет. І ніхто не задумаўся над тым, што выпускаць такія рэчы з адлюстраваннем Хатыні—святога для кожнага з нас месца — блюзнерства! Не падумалі пра гэта і тыя, хто паставіў «прыбор» на стол. Але чаму, чаму не падумалі?! Напэўна ж, бывалі яны ў Хатыні, схілялі ў журбе галовы ля гэтага помніка...

Зразумела, што гэтыя вазачкі зроблены не для адной «Вясны», іх, відаць, можна ўбачыць і ў іншых кафэ і рэстаранах. Праўда, у рэстаране «Партызанскі бор», які ля самай Хатыні, гэтых вазачак не было, але і тут не разумеюць, што кожны напамінак пра мінулую страшную, крывапралітную вайну выклікае душэўны боль, смутак, што нельга спекуляваць на паняццях, звязаных з тымі векапомнымі гадамі. Хацелася б паглядзець у твар чалавека, які зацвярджаў назвы страў у гэтым рэстаране. Напрыклад, такой, як «мяса па-партызанску» (у гаршчочках з грыбамі і соўсам) ці «квас па-партызанску» (з мёдам і чарніцамі). Ці не кашчунства гэта? Хто не ведае пра партызанскае жыццё, калі на ўліку былі кожны кавалак хлеба, кожная жменька солі...

Ці не варта нам яшчэ раз падумаць пра тое, як адносімся мы да сваіх рэліквій. Давайце зазірнём у любы універмаг. Вось аддзел сувеніраў. Драўляная шкатулка з інкрустацыяй «Хатынь». Зроблена па-майстэрску, толькі што пакладзеш у такую шкатулку? Значкі розных варыянтаў—«Хатынь»? Можаце ўзяць люстраны, можаце металічны. Усе з адлюстраваннем хатынскіх званоў і Вечнага агню. Або памятныя жэтоны і наборы медалёў? Запісныя кніжкі і календары? Паштоўкі? Адлюстраванне помніка становіцца звыклым і на яго пачынаеш глядзець абыякава. Мне здаецца, што маюць права існаваць толькі буклеты і кнігі, прысвечаныя Хатыні. Як і, скажам, Брэсцкай крэпасці-герою і іншым мясцінам, дзе ўсё нагадвае жахі вайны, напісаныя ярка, публіцыстычна, яны павінны расказваць пра трагедыю народа, пра яго мужнасць. А да значка на лацкане пінжака ці да шкатулкі, падоранай на дзень нараджэння, вока настолькі прызвычайваецца, што перастаеш успрымаць сэнс самога слова «Хатынь». Ці не тут нараджаецца абыякавасць?

Такую ж абыякавасць да свяшчэнных для нас мясцін выхоўваюць, на мой погляд, і некаторыя сучасныя абрады. Не магу спакойна глядзець на паток маладых ля Вечнага агню на плошчы Перамогі. Шчаслівыя нарачоная і жаніх, якія ўзначальваюць картэж з шафераў, сведкаў, сватоў, тамады і проста гасцей, хутка кладуць ля абеліска кветкі, крыху памаўчаць, хвілін пяць займае абавязковая працэдура фатаграфавання. А далей—бягом да машыні Вяселле чакае! А да Вечнага агню ўжо спяшаецца наступная пара...

Не думаю, што ў гэты момант людзі шчыра, ад сэрца ўсведамляюць важнасць і ўрачыстасць сваіх дзеянняў. Усё праходзіць «па канвееры», што таксама выхоўвае абыякавасць. Мо варта было б прыйсці ім абодвум сюды на пачатку свайго сумеснага жыцця, ды пастаяць ціха, без картэжа і фатаграфавання? Іх кветкі тады б былі кветкамі памяці. Бо яны ж нашчадкі тых, хто не вярнуўся з вайны...

Вось так сюды пасля выпускнога балю прыходзяць учарашнія дзесяцікласнікі. Прыходзяць, каб падумаць ля Вечнага агню пра тое, што было да іх, пра жыццё, у якое яны ўваходзяць.

Рэліквія. Як многа яна гаворыць нам. Прыслухаемся. І тады не змогуць з'явіцца вазачкі з адлюстраваннем Хатыні...

Б. ГЕРСТАН,
журналіст.

ШКОЛЬНЫЯ КНІГАЛЮБЫ

Чацвёрты год у сярэдняй школе № 2 горада Барысава працуе клуб «Праметэй». Яго члены вывучаюць жыццё знакамітых людзей, літаратуру, якая расказвае аб іх дзейнасці. Кожная юбілейная дата, звязаная з імёнамі такіх людзей, адзначаецца на спецыяльных пасяджэннях клуба, на якіх вучні выступаюць з дакладамі, паведамленнямі, аглядамі кніг. Наладжваецца дэманстрацыя фільмаў аб іх жыцці.

Члены клуба «Праметэй» прынялі актыўны ўдзел у стварэнні і адкрыцці школьнага музея гісторыі камсамольскага падполля Барысаўшчыны.

Цікава прайшлі тут заняткі на тэму: «Сыны ленінскай партыі», якія юныя літаратары школы прысвяцілі жыццю і дзейнасці М. І. Калініна, А. В. Луначарскага.

Сярод школьнікаў набыў вялікую папулярнасць і клуб «Твае равеснікі», на занятках якога адбылося многа цікавых гутарак па кнігах пра піянераў-герояў, пра жыццё дзяцей у нашай краіне і за мяжой. Цікава прайшла канферэнцыя па кнізе В. Пашкевіча «Над ракой Бярэзінай». Яна прысвечана юным барысаўчанам, што змагаліся ў падполлі. На канферэнцыі прысутнічалі героі твора. Клуб рэгулярна выпускае «Літаратурны каляндар», «Экран кнігалюба».

Цікавыя формы работы выкарыстоўвае і школьны літаратурны клуб. На яго пасяджэннях вучні чытаюць вершы, праводзяць гутаркі аб літаратурных творах, абмяркоўваюць рэфераты.

Юныя кнігалюбы школы з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі аперацыі «Жыві, кніга». Сабраную літаратуру яны перадаюць дзіцячым садам, школьным кабінетам. На працягу шасці гадоў тут працуе народны кіёск.

У. КОБРЫН.

«ШЧАСЛІВАЕ ЮНАЦТВА»

Каля дваццаці гадоў у Глускай санаторна-лясной школе пад кіраўніцтвам настаўніка Васіля Лаўрыновіча працуе літаб'яднанне «Званок». Юныя паэты і празаікі сустракаюцца з беларускімі пісьменнікамі, падтрымліваюць сувязь з супрацоўнікамі Літаратурнага музея Янкі Купалы, нярэдка выступаюць на старонках раённай газеты «Сцяг Радзімы», а таксама ў газеце «Піянер Беларусі», у часопісе «Бярозка».

Нядаўна пачаткоўцы падрыхтавалі рукапісны альманах «Шчаслівае юнацтва». У ім сабраны вершы, апавяданні, замалёўкі, прысвечаныя партыі, Радзіме. Змешчаны ў альманаху і малюнкі.

У. ТРЫБУНАЛАЎ.

ВІНШУЕМ!

За вялікую работу па камуністычным выхаванні працоўных Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў калектыў мемарыяльнага комплексу «БРЭСЦКАЯ КРЭПАСЦЬ-ГЕРОЙ» Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Намесніку дырэктара мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» В. КРАЎЧАНКУ прысвоена ганаровае званне заслужанага работніка культуры Беларускай ССР, шэраг работнікаў комплексу і грамадскі актыў музея ўзнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

100

ДА ГІСТОРЫІ АДНАГО ФОТАЗДЫМКА

ЁСЦЬ У ЛІТАРАТУРНЫМ МУЗЕІ Янкі Купалы куточак, дзе экспануюцца матэрыялы, звязаныя з паездкай паэта ў Чэхаславакію. Тры фотаздымкі, некалькі копій чэшскіх газет з вершамі паэта — вось, бадай, і ўсё, чым багата экспазіцыя. Праўда, частка матэрыялаў захоўваецца ў фондах, але і яны не даюць поўнага ўяўлення пра паездку Я. Купалы ў Чэхаславакію.

Як вядома, Я. Купала тройчы наведаў гэту краіну: у 1925, 1927 і 1935 гадах і кожны раз вяртаўся з паездак з новымі ўражаннямі, вершамі, задумамі. Прагрэсіўная грамадскасць Чэхаславакіі ведала Купалу яшчэ да рэвалюцыі, а таму яго прыезды цёпла сустракаліся братнім славянскім народам. Пра апошняе падарожжа паэт пісаў: «Наша паездка ў Чэхаславакію была сапраўдным трыумфам савецкай культуры, палітыкі Савецкай улады, маніфестацыяй дружбы і супрацоўніцтва Чэхаславакіі і СССР у справе барацьбы за мір, у справе абароны агульначалавечай культуры».

Вось чаму мы радуемся кожнай новай драбніцы з жыцця і творчасці народнага паэта, кожнаму новаму факту з яго біяграфіі, вершу, рукапісу, здымку. І па сённяшні дзень Купаліяна папаўняецца ўсё новымі і новымі матэрыяламі.

Але ці задумваемся мы над тым, каму абавязаны захаванай памяццю, чые добрыя, клапатлівыя рукі стваралі і ствараюць яе, зберагалі і зберагаюць для нашчадкаў?

У пражскім часопісе «Рэвю фатаграфія-80» (№ 2) змешчаны цікавы артыкул Ірэны Блюгавай «Успаміны-разважанні аб узнікненні сацыяльнай фатаграфіі ў Славакіі». Артыкул праілюстраваны фотаздымкамі аўтара — былой журналісткі, фотакарэспандэнта, палымянага публіцыста і барацьбіта супраць фашызму.

Сярод здымкаў ёсць адзін, які асабліва прыцягвае ўвагу: дэлегацыя савецкіх пісьменнікаў і журналістаў у Браціславе ў 1935 годзе. Сорак пяць год гэтаму здымку. Першы злева — Валянтовіч, які суправаджаў дэлегацыю ў Браціславе, другі — А. Фадзееў, трэці, як называе Ірэна Блюгава, — рэдактар «Известий», прозвішча якога яна не памятае, а чацвёрты — беларускі паэт Янка Купала...

Відаць, І. Блюгава крыху памылілася: рэдактара «Известий» у складзе дэлегацыі не было. Узначальваў дэлегацыю рэдактар «Правды» Міхаіл Кальцоў, але на здымку яго няма, а з журналістаў былі: галоўны рэдактар газеты «За индустриализацию», галоўны рэдактар украінскай газеты «Вісці», рэдактар аддзела ўнутранай палітыкі «Правды», рэдактар афіцыйнага Тэлеграфнага агенцтва Савецкага Саюза і прадстаўнік Камісарыята замежных спраў СССР. Усяго 12 чалавек. З пісьменнікаў прыехалі: А. Талстой, А. Фадзееў, Г. Караваева, Я. Купала, І. Мікітэнка і С. Траццякоў.

Прыезд савецкіх гасцей і іх знаходжанне ў краіне шырока асвятлялася ў чэшскім, а таксама і ў савецкім друку. Гэта быў адказ на візіт чэхаславацкіх журналістаў у Маскву ў пачатку 1935 г.

Маршрут савецкай дэлегацыі па Чэхаславакіі быў цікавы і разнастайны. Члены дэлегацыі наведалі Карлавы Вары і Марыянскія лазні, вядомыя Мацохскія пячоры, прамысловыя прадпрыемствы ў Аламоўцы, Брно, Прасцеёва, Віковіцах, Мараўскай Астраве і іншых гарадах. І дзе б яны ні былі — усюды сустрэчы ператвараліся ў яркую дэманстрацыю чэхаславацка-савецкай дружбы.

Для членаў дэлегацыі была распрацавана спецыяльная праграма. А. Талстой і А. Фадзееў — чыталі лекцыі, Г. Караваева праводзіла гутаркі, Я. Купала выступаў з чытаннем сваіх вершаў і г. д.

Суправаджаў дэлегацыю д-р Уладо Кляменціс. Яго па чарзе змянялі Валянтовіч, друкар, былы функцыянер «Саюза сяброў СССР» у Браціславе, і Эло Шандар, пісьменнік, дырэктар банка і старшыня «Саюза сяброў» у адной асобе.

Праграма дэлегацыі была багатай і насычанай, таму існавала дамоўленасць, што кожны напіша свае ўражанні аб паездцы, абагуліць і змесціць у кнізе, якую ўзяўся скласці Сяргей Траццякоў.

С. Траццякоў звярнуўся ў камітэт «Саюза сяброў СССР» з просьбаю дапамагчы зрабіць для кнігі фотаздымкі. І камітэт даручыў гэту справу Ірэне Блюгавай, тым больш, што яна вяла кніжную выдавецкую справу КПЧ.

І. Блюгава прызнаецца, што была ў той час «самай шчаслівай, бо як фотарэпарцёр суправаджала дэлегацыю амаль увесь час». І ўсе тыя здымкі, што друкаваліся ў чэшскім друку таго часу, відаць, былі зроблены ёю.

Пры ад'ездзе дэлегацыі на радзіму І. Блюгава перадала С. Траццякову амаль усе свае негатывы (толькі з некаторых зрабіла копіі) з тым, каб выдавецтва выбрала для кнігі неабходныя, зрабіла адбіткі, а негатывы вярнула ёй.

Паколькі ганарар у той час замежным аўтарам не высылаўся, дамовіліся, што па выхадзе кнігі І. Блюгава прыедзе ў СССР, для яе будзе распрацавана праграма прабывання, аплачана дарога і г. д.

Мінула два гады, неабходныя для падрыхтоўкі і выдання кнігі. Апроч адной паштоўкі ад Траццякова, Фадзеева і Караваевай, напісанай адразу ж пасля вяртання іх на радзіму, Блюгава нічога не атрымала. Наступныя два гады — зноў ніякіх вестак. А потым пачалася вайна...

І толькі больш як праз сорак год яна, а разам з ёй і мы даведаліся пра гісторыю тагачасных фотаздымкаў і матэрыялаў. Які ж у сапраўднасці быў іх лёс?

...Праз год пасля вяртання дэлегацыі, у 1936 годзе, С. Траццякоў падрыхтаваў і перадаў выдавецтву рукапіс кнігі разам з фотаздымкамі. Кніга была надрукавана, але, на жаль, да чытачоў не трапіла...

Як пасля выявілася, усе рукапісы кнігі захаваліся, іх зберагла жонка С. Траццякова, а што да здымкаў — то не захавалася ніводнага.

Той, што І. Блюгава апублікавала ў часопісе, яна атрымала ад архітэктара Валянтовіча, бацька якога, як мы ведаем, суправаджаў дэлегацыю ў 1935 годзе.

Разбіраючы бацькаў архіў, Валянтовіч і знайшоў гэты здымак. Ён зрабіў з яго копію і перадаў аўтару — І. Блюгавай, расказаўшы пры гэтым, як бацька паказваў яму, малому хлапчуку, сваю калекцыю.

Пра кожны здымак, пра кожнага сфатаграфаванага чалавека бацька настолькі цікава расказваў, што яны назаўсёды засталіся ў яго памяці.

Захаваўся яшчэ адзін фотаздымак І. Блюгавай таго часу. Магчыма, на ім таксама ёсць Янка Купала. Але летапісец горада Пезынка ўклеіў яго ў гарадскую хроніку на ўспамін аб наведанні горада савецкай дэлегацыяй.

Так, дзякуючы чэшскім сябрам, мы маем магчымасць пазнаёміцца яшчэ з адной старонкай жыцця нашага народнага песняра.

Тамара ТАРАСАВА.

Сярод шматлікіх выданняў, якія выходзяць у рэспубліцы да 100-годдзя з дня нараджэння народных песняроў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа, дастойнае месца зойме і гэтая кніга, што пабачыла свет у выдавецтве «Юнацтва». Мастак В. Шаранговіч, глыбока пранікнуўшы ў сутнасць купалаўскай задумы, па-мастакоўску выразна і ўдумліва прачытаў адзін з самых значных твораў песняра — паэму «Адвечная песня».

Ілюстрацыі В. Шаранговіча да «Адвечнай песні» — мастацтва высокай творчай думкі і шчодрай фантазіі. Іх можна разглядаць падоўгу, разпораз спыняючыся на тым ці іншым сюжэце, узнаўляючы ў памяці тыя ці іншыя радкі любімага песняра.

Фота Ул. КРУКА.

І. НАВУМЕНКА. Янка Купала. Выданне другое, дапоўненае. Мінск, «Вышэйшая школа», 1980.

Першае выданне кнігі выйшла ў 1967 годзе. Цяпер І. Навуменка дапоўніў манаграфію, напісаўшы раздзел «Ад прадзедаў, спакон вякоў...», у якім звяртаецца да яшчэ слаба даследаваных старонак спадчыны Я. Купалы.

З густам аформленая мастаком Я. Зельскай, выдадзеная на высокім паліграфічным узроўні манаграфія «Янка Купала» І. Навуменкі зойме належнае месца сярод выданняў, што выходзяць у рэспубліцы да 100-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа.

А. ВІШНЕЎСКІ.

У ЛУЧНАСЦІ БРАТНЯЙ

Сувязі

Талрыдс РУЛІС

ЗНАЁМСТВА латышскіх чытачоў з беларускай літаратурай пачалося трыццаць гадоў назад, калі ў нас у 1950 г. выйшла аповесць Тараса Хадкевіча «Вяснянка» (пераклала з рускай мовы Х. Калніня). Зразумела, былі асобныя пераклады апавяданняў і вершаў у перыёдыцы, але мы не будзем засяроджваць нашу ўвагу на гэтых публікацыях, пагаворым толькі пра кнігі, каб ясней акрэсліць магістральныя лініі літаратурных сувязей, якія больш чотка выяўляюць агульныя тэндэнцыі.

Амаль усё першае дзесяцігоддзе мы перакладалі кнігі з рускай мовы, не заўсёды прыцягвалі да гэтай справы лепшых перакладчыкаў. Вялася як бы разведка подступаў да беларускай літаратуры. Пра гэта сведчаць і самі выдадзеныя кнігі: п'еса Кандрата Крапівы «Пяюць жаваранкі» (пер. Э. Залітэ), раман Івана Шамякіна «Глыбокая плынь» (пер. Т. Ярмалінская, 1953 г.), апавяданні Янкі Брыля «У Забалоцці днее» (пер. А. Біркертс, 1954 г.), аповесць Міхася Лынькова «Міколка-паравоз» (пер. К. Плорыня, 1958 г.), раман Петруся Броўкі «Калі зліваюцца рэкі» (пер. О. Балодзітэ, 1959 г.). Але ў той жа час паявілася і невялікая кніжка, перакладзеная з арыгінала: Арыя Сілабрыедэ пераклала верш Янкі Купалы «Хлопчык і лётчык» (1954 г.); Кнутс Скуеніекс пераклаў аповесць для дзяцей Янкі Маўра «ТВТ» (1957 г.).

У гэтым пераліку, калі разгледзім яго ўважліва, мы ўбачым ужо арыентацыю на добрую літаратуру; для першага дзесяцігоддзя гэта была харошая заяўка: выбраны творы значных пісьменнікаў, у розных жанрах, і з дарослай і з дзіцячай літаратуры.

Спантанны ўзлёт пачаўся ў канцы пяцідзесятых гадоў. У адным толькі 1960 годзе выйшла сем кніг — бліскучае завяршэнне дзесяцігоддзя! Праўда, гэта, здаецца, было звязана з дэкадай беларускай літаратуры ў Латвіі. Выйшлі наступныя кнігі: першы пераклад беларускіх фальклорных твораў — «Беларускія народныя казкі» (пер. Ю. Ванаг), ёмістая анталогія паэзіі «Беларуская сасна» (калектыўны пераклад), зборнік апавяданняў «Дом з сонечнага боку» (пер. Р. Эззра, Ч. Кіндзуліс), камедыя класіка з XIX ст. Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта» (гэты твор выдаў Дом народнай творчасці імя Э. Мэлнгайліса ў перакладзе Ч. Кіндзуліса), дзіцячыя вершы Эдзі Агняцвет «Залатыя рукі» (пер. Я. Османіс) і два зборнікі паэзіі вядучых беларускіх паэтаў: Пімена Панчанкі — «Знойдзеныя зоркі» і Максіма Танка — «Сляды гадоў».

1960 год вылучаецца не толькі колькасцю перакладаў, але, галоўным чынам, новым якасным скачком у папулярызацыі беларускай літаратуры, пашырэннем далягляданў. Анталогія паэзіі адкрыла нам шмат новых імёнаў, пазнаёміла з вялікім абшарам тагачаснай паэзіі, зборнік апавяданняў таксама адкрыў многіх маладых празаікаў, паказаў узровень развіцця жанру апавядання. З гэтага года распачалася асноўная папулярызатарская праца — уклад у гэту справу Юлія Ванага і Чэслава Кіндзуліса нельга пераацаніць. І, што на мой погляд галоўнае — з гэтага года пераклад цалкам перайшоў на новыя шляхі, якія адпавядалі запатрабаванням часу, — на працу з арыгіналам. У наступным дзесяцігоддзі мы сустракаемся ўжо толькі з трыма эксцэсамі, калі пераклад рабіўся з іншага перакладу (камедыя Андрэя Макаёнка «Лявоніха на арбіце», пер. А. Баўга, 1962 г.; раман Івана Шамякіна «Сэрца на далоні», пер. Х. Рукшанс; аповесць для дзяцей Валянціна Зуба «Таямнічы надпіс», пер. О. Штале, 1966 г.), але гэта ўжо мела характар выпадковасці.

У сямідзесятых гадах, калі мы ўжо мелі знаўцаў беларускай мовы і літаратуры, пачалося сістэматычнае азнаямленне латышскіх чытачоў з найноўшымі і самымі значнымі дасягненнямі беларускай літаратуры.

Нават у мала спрактыкаванага чытача выклікаюць павагу імёны такіх пісьменнікаў, як Якуб Колас (пераклад аповесці «Дрыгва» Юліем Ванагам быў падрыхтаваны да 80-годдзя народнага пісьменніка ў 1962 г.), Васіль Быкаў (шырока вядомая аповесць «Трэцяя ракета» перакладзена Ч. Кіндзулісам, 1966 г.), Рыгор Барадулін (зборнік вершаў «Сенакос» пераклаў В. Ліўземніекс, 1967 г.), Янка Брыль (раман «Птушкі і гнёзды» ў 1968 г. выйшаў у перакладзе Ю. Ванага).

Важнейшым дасягненнем другой паловы дзесяцігоддзя стаў пераклад і выданне «Палескай хронікі» Івана Мележа («Людзі на балоце» — 1966 г., «Подых навальніцы» — 1969 г.). Вельмі высокай ацэнкі заслугоўвае гэта праца Юлія Ванага.

Раманы народнага пісьменніка Беларусі паявіліся на латышскай мове якраз у той час, калі пра іх загаварыў увесь Савецкі Саюз, калі амаль у кожным аглядзе найлепшых дасягненняў літаратур нашай зямлі ўпаміналася і «Палеская хроніка». Незвычайна вялікай аказалася цікавасць латышскіх чытачоў да гэтага твора. Трыццаць тысяч экземпляраў тыражу былі прададзены і галоўнае — прачытаны. І дагэтуль няма ніякіх знакаў аслаблення цікавасці чытачоў да раманаў. Пра гэта сведчыць такі факт.

Прыкладна з год таму назад адна старая жанчына, даведаўшыся, што я займаюся пытаннямі беларускай літаратуры, сказала мне:

— Вы часам ці не ведаеце, як там з тымі раманамі пра Палессе, якія напісаў адважны беларускі пісьменнік? Нядаўна я яшчэ раз іх перачытала і так хочацца ведаць, што там далей. Краем вуха я чула, што ёсць працяг. Ці выйдзе ён па-латышску? Каб толькі хутчэй, бо я ўжо ў гадах, але хацелася б дачакацца. Гэта вельмі добры пісьменнік!

Такія словы могуць толькі радаваць. Я хацеў сказаць, што сапраўды ёсць трэцяя кніга «Завеі, снежань», што дакладна не ведаю, але, здаецца, у выдавецкіх планах кніга значыцца, што жанчына зможа сустрэцца з Ганнай і Апейкам. Шкада толькі, што пісьменнік не паспеў закончыць свой расказ, хоць і працаваў над ім да апошняга дня свайго жыцця.

Так, лаўрэат Ленінскай прэміі не паспеў закончыць сваёй Галоўнай кнігі, якая жыве не толькі ў сэрцы яго народа, але і іншага. Іван Мележ у сваёй творчасці дасягнуў высокіх вяршынь, паяднаўшы вострае мастакоўскае адчуванне з глыбокім даследчыцкім веданнем народнага жыцця. Яго кнігі населены яркімі вобразамі прадстаўнікоў народа, ім уласцівы эпічны размах, сацыяльная шырыня, суровы жыццёвы драматызм, псіхалагічная праўдзівасць і высокі патрыятычны пафас. З выхадам трэцяй кнігі «Палескай хронікі» ярка акрэсліўся шырокі этап жыцця беларускага народа.

У сямідзесятых гадах папулярызацыя беларускай літаратуры ў Латвіі працягвалася з яшчэ большым размахам. Значна пашырылася кола перакладзеных аўтараў, паралельна з творамі лепшых сучасных пісьменнікаў чытачам рэгулярна прапаноўваліся і каштоўныя здабыткі з залатога фонду класікі: аповесць Змітрака Бядулі «Салавей» (1977 г.), раман выдатнага празаіка Кузьмы Чорнага «Трэцяе пакаленне» (1977 г.), запіскі літаратуразнаўца-энцыклапедыста, гісторыка літаратуры, фалькларыста, мовазнаўца і празаіка Максіма Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» і «Віленскія камунары» (абодва творы ў адной кнізе, 1978 г.)*.

Кожны з гэтых пісьменнікаў заслугоўвае таго, каб пра яго сказаць латышскаму чытачу крыху больш наваг у памерах гэтага артыкула, бо яны належаць да кагорты заснавальнікаў беларускай нацыянальнай літаратуры і з'яўляюцца яе яркімі прадстаўнікамі, яны закладалі і паглыблялі традыцыі беларускай мастацкай прозы.

Змітрок Бядуля пачаў пісаць на яўрэйскай і рускай мовах, пазней перайшоў на беларускую. З. Бядуля — пісьменнік рамантычнага напрамку, пра што ярка сведчыць выдадзеная на латышскай мове аповесць «Салавей», напісаная ў 1927 годзе. Гэта адзін з самых выдатных твораў савецкай юнацкай літаратуры. З іншых твораў пісьменніка, мабыць, варта было б перакласці і выдаць казку «Сярэбраная табакерка» (упершыню надрукавана пасля смерці аўтара) і апавяданні для маленькіх чытачоў.

Кузьма Чорны самы буйны беларускі празаік, самы беларускі як па мове, так і па веданні побыту і гісторыі свайго народа.

Творчасць Кузьмы Чорнага ў нас амаль невядомая, а між тым на яе абапіраецца ўся пазнейшая, у тым ліку і сучасная беларуская проза, яна — гэта той крытэрый, якім вымяраецца ўзровень творчасці кожнага беларускага пісьменніка. Найвышэйшая ацэнка — твор, напісаны ў традыцыях К. Чорнага.

Пра К. Чорнага можна гаварыць бясконца. Можна сказаць, што яго «Зямля» — самы лірычны раман, што «Млечны Шлях» — раман філасофскі і глыбока псіхалагічны, але аналіз не ўваходзіць у задачы гэтага артыкула. Адзінае, што хацелася б падкрэсліць, гэта — як многа яшчэ трэба зрабіць у перакладзе, каб творы гэтага пісьменніка дайшлі да латышскага чытача. Трэба думаць і будзем спадзявацца, што яны стануць з цягам часу здабыткам нашай літаратуры. (Між іншым, у перспектыўных планах выдавецтва «Ліесма» стаяць раманы Чорнага «Сястра» і «Зямля»).

Трэці пісьменнік, які расшырыў далягляды беларускай прозы даваеннага часу і які пакінуў глыбокі след у гісторыі культуры, гэта — Максім Гарэцкі.

М. Гарэцкі — яркі, бліскучы апавядальнік. Ужо першая яго кніжка апавяданняў, якая паявілася ў 1914 годзе, — адна з самых значных у беларускай дакастрычніцкай прозе. Яго творчасць захапляе пастаноўкай складаных грамадскіх і філасофскіх праблем, псіхалагічнай дакладнасцю і глыбінёй аналізу, высокім майстэрствам адлюстравання чалавека і багаццем жывой народнай мовы.

Па розных прычынах жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага доўга чакаў дастойнай ацэнкі. Але вось паявілася грунтоўнае даследаванне Алеся Адамовіча «Браму скарбаў сваіх адчыняю...», апублікаванае ў часопісе «Полымя» (№№ 9—11, 1975 г.). Праўда, яшчэ ў 20-х гадах крытыка высока ацаніла запіскі «На імперыялістычнай вайне», якія папярэднічалі падобным творам А. Барбюса — «Агонь», Л. Франка — «Чалавек — добры», Л. Рэна — «Вайна», перакладзеным на многія мовы яшчэ да другой сусветнай вайны, аднак поўны рэнесанс настаў у шасцідзесятых гадах, калі ўпершыню быў апублікаваны поўным тэкстам раман «Віленскія камунары». Гэта была падзея ў жыцці беларускай літаратуры.

Апрача двух ужо апублікаваных твораў, латышскаму чытачу было б цікава пазнаёміцца з апавяданнямі і аповесцямі «Меланхолія» і «Ціхая плынь», а таксама з шырока задуманай, але не закончанай эпапеяй «Камароўская хроніка».

Як класіка названымі аўтарамі, так і старэйшае пакаленне беларускіх сучасных пісьменнікаў прадстаўлена ў Латвіі ў сямідзесятых гадах творамі трох пісьменнікаў. Гэта: кніга выбраных вершаў народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі «Дабрадушнасць» (калектыўны пераклад, 1979 г.), перакладзеная з падрадкоўніка кніга дзіцячага пісьменніка, лаўрэата прэміі імя Г. К. Андэрсена Васіля Віткі «Стракатая кніга» (пер. І. Ласманіс, 1977 г.) і аповесці Івана Шамякіна «Гандлярка і паэт» і «Шлюбная ноч» (пер. Ю. Ванаг, 1979 г., абедзве аповесці ў адной кнізе). З улікам гэтай апошняй кнігі творчасць Івана Шамякіна прадстаўлена латышскім чытачам найбольш поўна — кожнае дзесяцігоддзе па кнізе. Гэта сведчыць пра пісьменніцкую сілу, якая ўтрымлівае І. Шамякіна на высокай мастацкай хвалі.

Як значную падзею можна разглядаць і выданне ў нас у 1976 г. трох аповесцей народнага пісьменніка Васіля Быкава.

Чатырма кнігамі ў сямідзесятых гадах прадстаўлены беларускія пісьменнікі сярэдняга пакалення; гэта — псіхалагічна глыбока аналітычная, створаная на ўзроўні сучасных патрабаванняў драматычная аповесць Івана Пташнікава «Тартак» (1972 г.), кніга апавяданняў і навел Уладзіміра Караткевіча «Чазенія» (пер. М. Абала, 1976 г.), напісаная з сур'ёзнай усмешкай аповесць Івана Сяркова «Мы з Санькам у тыле ворага» (1973 г.) і раман Івана Чыгрынава пра падзеі на ўсходзе Беларусі ў першыя месяцы фашысцкага нашэсця «Плач перапёлкі» (1980 г.).

І. Пташнікаў, застаючыся верным сваёй пісьменніцкай манеры, прадоўжыў «вясковую трылогію» раманамі «Мсціжы» і «Найдорф», якія высока ацэнены беларускай крытыкай, вытрымалі шмат выданняў і перакладзены на многія мовы. І. Чыгрынаў таксама напісаў працяг — раман «Апраўданне крыві», а І. Сяркоў — «Мы — хлопцы жывучыя».

З творчасцю Уладзіміра Караткевіча варта пазнаёміцца бліжэй, таму што ён заняў самастойнае, сваё месца ў сучаснай беларускай літаратуры. У. Караткевіч не толькі празаік, але і вельмі самабытны паэт, драматург, навеліст, эсэіст і публіцыст. З яго вершамі ў перакладзе Е. Стулпана і ў анталогіі (а таксама па кнізе «Хлеб-соль», 1975 г.), і ў перыёдыцы мы ўжо мелі магчымасць пазнаёміцца. З вялікай прозай сустрэча яшчэ наперадзе, і пра гэта трэба загадзя падумаць.

У прозе У. Караткевіч — самы значны прадстаўнік беларускага гістарычнага рамана. Цэнтральнае месца займае яго раман «Каласы пад сярпом тваім», перакладзены на многія мовы, а на рускай мове ён ужо вытрымаў чатыры выданні. Гэта аб'ёмісты расказ пра грамадскую атмасферу ў Беларусі напярэдадні народнага паўстання 1863—64 гг. пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Пачаўшы расказ з дзяцінства будучага паўстанца, малюючы розныя пласты жыцця народа, аўтар даводзіць чытача да пачатку актыўнай працы героя ў падрыхтоўцы паўстання. Раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» («Евангелле ад Іуды») — напружаны расказ пра змрочнае сярэднявечча, калі народ быў пад прыгнётам царквы і феадалаў. Пра таямнічыя падзеі, якія адбыліся ў старадаўнім замку сярод непраходных балот і лясоў, пра шчырае каханне напісана аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха», экранізацыю якой мы нядаўна мелі магчымасць паг-

(Працяг на стар. 6).

(«Літэратура ун Максла», № 18 (1901). 1.5.1981 г.).
(Артыкул друкуецца з некаторымі аўтарскімі скарачэннямі).

* Кнігі, у якіх не памечан перакладчык, пераклаў аўтар гэтага артыкула.—Заўвага рэдакцыі.

КРЫТЫКА, БІБЛІЯГРАФІЯ

„Ў ёсць жыццё...“

«Калі пытаюцца ў мяне, якая мая паэзія, мушу адказаць: не ведаю. Але калі запытацца ў маёй паэзіі, яна адкажа — які ёсць я».

Пабла НЭРУДА.

Тонкі, адухоўлены профіль. Высокі лоб. Вялікія, з лёгкай зажурынкай, праніклівыя вочы. Гожа акрэсленыя мяккія вусны. Аблічча свеціцца ўсёразуменнем і дабрынёй.

Поль Элюар:

«Зло павінна быць ператворана ў дабро. І ўсімі сродкамі, нават пад страхам страціць усё. Насупор любой маралі пакорлівасці мы збавімся ад гора і непамыснасцей. Таму што мы пранікліся даверам. Я хацеў адпрэчыць, зніштожыць чорныя сонцы хвароб і галечы, непраглядныя трапічныя ночы, усе клаакі цемрадзі і выпадковасцей, памылкі зроку, слепату, рэзрух, запеклую кроў, магілы. І калі б за ўсё жыццё мне выпаў на долю толькі адзін адзіны міг надзеі, я ўсё роўна даў бы гэты бой. Нават калі мне наканавана прайграць, бо выйграюць іншыя. Усе астатнія».

Гэта выдыхнута паэтам за тры гады да смерці: знойдзенае найменне зместу ўласнага пражытага жыцця.

14 снежня 1895 года — 18 лістапада 1952 года.

Якая прорва падзей, якое фантастычнае знітаванне пакут і шчасця, роспачы і акрэсленасці, памылак і веры, пошукаў і здзяйсненняў стоена ў атаме злучка паміж гэтымі дзвюма каляндарнымі датамі!.. Хвароба лёгкіх, першае каханне, удушлівыя газы ў акопах 1914—1917 гадоў, штандары дадаістаў і сюррэалістаў, раптоўныя ўцёкі з Парыжа на выспы Акіяніі, разрыў з былым другам, важаком сюррэалізму Андрэ Брэтонам, другая сусветная, Супраціўленне, страшная душэўная траўма — смерць каханай жонкі, барацьба за мір, надзея, лёс... А над усім, і ўва ўсім, і праз усё — паэзія, песня.

У натуры чалавека самой прыродай закладзены бунт супраць усялякай брыды і несправядлівасці, — самі пакуты правакуюць гэты бунт. У пакутах паэт і чэрпае сілу, каб спяваць.

Поль Элюар:

«Дазвольце мне самому судзіць пра тое, што памагае мне жыць: я даю надзею стомленым людзям...»

«...Буду стукаць я ў дзверы агню».
(«Мой апошні верш»).
«...І полымя аголенага сіла
Пяшчотную і жорсткую дае
мне дужасць».
(«Крычаць»).
«...Агонь пладаносны зярнят,
далоняў і слоў.
Полымя радасці ўспыхнула,
і горача кожнаму сэрцу».
(«Аблічча міру»).

Уся паэзія Элюара скрозь у перабліскаx гэтага вобраза агню. Так суладна з праметэеўскай марай: «Каб святло знітавала...» («Сем паэм аб любові на вайне»). Толькі Праметэй выкраў агонь у багоў. Агонь Элюара — гэта крыніца жыцця, створаная ўласнымі рукамі: «Мы кідаем цемры бярэма ў агонь, мы ўзломваем замкі няпраўды ржавай» («Апошняя ноч»).

Чалавек, умыты сонцам,
Набывае прагу да жыцця:
Гэта прага ствараць жыццё,
Гэта прага любові і будучыні.
(«Аблічча міру»).

Поля Элюара можна цытаваць бясконца, настолькі вобразныя і афарыстычныя радкі ягоных вершаў. У прадмове да яго беларускага «Выбранага» Б. Міцкевіч слушна заўважае, што «Элюар — не лёгкі для чытання паэт. Як ні парадаксальна, адна з прычын гэтага — прастата, надзвычайны лаканізм элюараўскага верша. Імкнучыся пазбегнуць лішніх слоў, паэт нярэдка даводзіў свае вершы да такой сцісласці, што паасобныя радкі ўяўляюцца нам загадкавымі». Але ж вершы не ўзнікаюць на пустым месцы, з нічога. Разуменне абумоўлена веданнем. Паэт — уладар над словамі, ён напаўняе іх тым, што любіць, што ён ёсць сам.

Паэтычная памяць зберагае ўсё. Чым болей ведаем мы пра жыццёвы шлях паэта, тым больш даступнымі робяцца нам яго думкі і вобразы. Поль Элюар — адзін з самых любімых і шаноўных у Францыі паэтаў. Ім зачытваюцца, пра жыццёвы і творчы лёс паэта шмат ужо напісана ў яго на радзіме. Ёсць падобныя даследаванні і ў савецкім друку: працы Еўнінай, Балашова, Ваксмахера, Велікоўскага і інш. Неаднаразова, не кажучы ўжо пра паасобныя паэтычныя падборкі-публікацыі, выдаваліся зборнікі вершаў Элюара на мовах саюзных рэспублік. Цяпер гэту бібліятэчку папоўніла і беларускае выданне выбранага з творчасці выдатнага французскага паэта.

«Найлепшае выбранае з вершаў тое, што выбіраецца для сябе», — сцвярджаў Элюар. Не што **трэба**, а тое, што люблю я, што падабаецца мне. Гэта надзвычай слушна пры ўласнаручным складанні выбранага з уласных твораў. Перад беларускай перакладчыцай стаяла болей складаная задача: прадставіць нашаму чытачу французскага паэта не проста такім, якога яна сама любіць, але, па магчымасці, паказаць яго ў творчым поступе, стварыць паэтычнае аблічча Элюара, па рысцы, па штрыху ўзнаўляючы яго творчы свет у розныя жыццёвыя перыяды. Безумоўна, выбар вершаў для перакладу быў індывідуальны, — без любові немагчыма абысціся, калі пераклад — патрэба і справа душы. З дазволу Эдзі Сямёнаўны хочацца прыгадаць словы з яе ліста да аўтара гэтых радкоў: «Паэт складаны, што і казаць. А ўсё пачалося з яго «Liberté». Прачытала і адчула, што ўжо не змагу адступіцца ад яго. Гэта было нейкае насланнё!»

«Насланнё» запатрабавала адданасці і карпатлівай працы, а ў выніку — спелы, вагомы плод на чытацкім стале беларусаў: кніга «З табою». Вядома ж, нельга прэтэндаваць на поўны ахоп у ёй усіх перыядаў 40-гадовай працы Элюара ў паэзіі. Аднак укладанне вершаў грунтоўнае. Яскрава ўвасоблена не толькі скразная тэма Элюара — адмаўленне несправядлівасці, ува ўсім — у сацыяльным, у бытавым, у інтымным. Хораша прасочваецца і тое, як мяняўся почырк паэта, як багацеў ягоны голас. Асабліва па апошніх вершах відочна, як робяцца болей крылатыя словы, вязьмо радкоў набывае глыбейшую песеннасць і пяшчотнасць. Нездарма шмат пазнейшых вершаў пакладзены французскімі кампазітарамі на музыку, хоць бы знакамітая «Свабода», «Не, немагчыма...», «Апавяшчэнне» і інш.

Тут просіцца толькі вось якая думка. Праца перакладчыка, вядома ж, адрасуецца народу той мовы, на якую перакладаецца іншамоўны твор. Беларусам важліва ўбачыць французскага паэта ў сапраўдным яго абліччы. І, прынамсі, дзіўна было прачытаць у прадмове да зборніка такое: «Як і большасць яго сучаснікаў у Францыі, Элюар па прыкладзе Г. Апалінэра адмовіўся ад знакаў прыпынку, лічачы, што яны разбіваюць рытм верша і звужаюць яго лагічна. Але падобная практыка не характэрная для беларускай і ўвогуле славянскай паэзіі».

Ну дык і што з таго, калі — не характэрная? Але ж яна характэрная для паэта! Хіба вершы Элюара ў рускіх выданнях, надрукаваныя без знакаў прыпынку, горай успрымаюцца, чытаюцца цяжэй? Хіба тыя выданні ўнеслі нейкую дысгармонію ў славянскую паэзію?..

Але вернемся да разглядаемага намі «Выбранага». Эдзі Агняцвет даўно прывівае галінкі французскай паэзіі на дрэве беларускай літаратуры. Чатыры асобныя кнігі: «Краіна Паэмія» (1962), «П'ер Ж. Беранжэ» (выбраныя песні, 1960), «Маленькі прынц» Антуана дэ Сент-Экзюперы (1969), «Зялёны акіян» Г. Апалінэра (1973). І вось гэта, апошняя па часе, пятая, вартасная паэтычнай цэласнасцю, шматлікімі дасканалымі перастварэннямі першакрыніц.

Грузінскі крытык Г. Маргвелашвілі (у кн. «Несгорающий костер») мяркуе, што перакладчыку неабходна веданне: 1) атмасферы бытавання арыгінала, 2) комплексу яго «выпраменьванняў» і 3) развіцця «асэнсаванняў» арыгінала на радзіме паэта. Слушна, неабходна ўсебаковае вывучэнне арыгінала. Напэўна ж, не пашкодзіць і вывучэнне «асэнсаванняў» арыгінала іншымі перакладчыкамі — там, дзе яны маюцца і дзе гэтаму вывучэнню не замінаюць моўныя бар'еры. Толькі сам перакладчык з пэўнасцю можа меркаваць, якім коштам дастаецца яму сатворчая ўдача. Як бы там ні было, чытач судзіць па выніках. Зборнік «З табою» багаты моцнымі перакладамі, што дыхаюць элюараўскай першароднай свежасцю і сілай. «Дзяўчына ў Парыжы...», «Верны», «Лянота», «Неабходнасць», «Гэта яна», «Адзінокі», «Свабода», «Апавяшчэнне», «Баланс ворага», «Немагчымае жаданне»... — пералік можна доўжыць.

Цікавей паглядзець, як адзін і той жа твор перакладзены рознымі майстрамі. Вось хоць бы «Зацямненне» — у арыгінале верш гэты называецца «Каменданцкая гадзіна». Напачатку падрадкоўнік: «Што вы хочаце дзверы вартаваліся //. Што вы хочаце мы сядзелі пад замком // Што вы хочаце вуліца была перакрыта // Што вы хочаце горад быў паняволены // Што вы хочаце мы галадалі // Што вы хочаце мы былі абяззброены // Што вы хочаце нагарнулася ноч // Што вы хочаце мы кахалі адзін аднаго». У кнізе «Сузір'я французькоі поезіі» Міколы Тэрэшчанкі гэты верш «Затемнення» гучыць так: «Що треба вам? Пильнують вартові. Що треба вам? Мы замкнуті всі дні. Що треба вам? Все місто у ярмі. Що треба вам? Погасли всі огні. Що треба вам? Голодні ледь живі. Що треба вам? Бе?

Поль Элюар. З табою. Выбранае. Пераклад з французскай мовы Э. Агняцвет. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1980.

СУВЯЗІ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5).

лядзець. Апошні раман «Чорны замак Альшанскі» спалучае ў сабе гістарычны матэрыял з падзеямі часоў Вялікай Айчыннай вайны і нашых дзён.

Уладзімір Караткевіч — яркі рамантык, сапраўдны гуманіст. Гістарычныя падзеі — яго стыхія. Энцыклапедычныя веды і майстэрства апавядальніка сплятаюцца ў яго ў захапляючую інтрыгу, што надае творам непаўторны водар.

Некалькі слоў пра тоненькую кніжку, якую латышскія чытачы адразу заўважылі, раскупілі і прачыталі. Гэта выдадзеная ў 1974 годзе аповесць празаіка маладзейшага на той час пакалення Анатоля Кудраўца «Раданіца». Праз дзесяць год пасля апублікавання гэтай кнігі на мове арыгінала крытык Юлія Канэ пісала ў газеце «Літаратура і мастацтва» (18.1.1980): «Сур'ёзным, бадай, этапным дасягненнем гэтага напрамку была аповесць «Раданіца». Упершыню з'явіўся герой, здольны асэнсаваць і сваю настальгію, і сваю душэўную сувязь з вёскай, дзе нарадзіўся, дзе жывуць яго блізкія, і наогул сувязі цяпершаняга і мінулага часоў жыцця».

У сямідзесятых гадах пісьменнік працягвае працаваць у жанры апавядання, з некалькімі ўзорамі якіх латышы пазнаёміліся па публікацыях у перыёдыцы.

Можна і абмежавацца кароткай ацэнкай той часткі беларускай літаратуры, якая нам ужо вядома па перакладах.

Але гэтыя славутыя пісьменнікі і іх творы — яшчэ не ўся беларуская літаратура. Само сабой зразумела, што ў перакладах ніколі нельга было і не будзе магчымасці адлюстраваць увесь літаратурны працэс іншага народа. Ды гэта зусім і не трэба, бо ў такім працэсе ёсць і менш значныя творы, якія застаюцца толькі літаратурнымі фактамі і не ствараюць руху і дынамікі працэсу.

Хочацца спыніцца на творчасці тых пісьменнікаў, перад якімі мы, умоўна кажучы, даўжнікі. Умоўна таму, што ў перспектыўных планах выдавецтва значацца не проста тыя ці іншыя творы. У гэтых планах ёсць свая дынаміка, яны могуць мяняцца, могуць дапаўняцца. Урэшце выдавецтва мае права выбіраць для выдання творы, якія ўкладваюцца ў цэласную панараму перакладаў з літаратур народаў Савецкага Саюза, якія дапаўняюць яе, уносяць у яе сваю самабытную рысу. Зрэшты, у цяперашні час вельмі прыкметны высокі ўзлёт эстонскай і грузінскай літаратур і, зразумела, мы павінны адвесці ім у сваіх планах належнае месца.

У 1982 годзе па рашэнні ЮНЕСКА ва ўсім свеце будзе адзначацца стогадовы юбілей двух карыфеяў беларускай літаратуры: Янкі Купалы і Якуба Коласа. Выдавецтва «Ліесма» мае намер выдаць выбраныя вершы Янкі Купалы і трылогію Якуба Коласа «На ростанях». Гэтыя выданні засведчаць і цесныя сувязі нашых народаў і адначасова ліквідуюць нашу запазычанасць перад гэтымі вялікімі пісьменнікамі.

Разглядаючы літаратуру шасцідзесятых і сямідзесятых гадоў, прыходзіш да ўражання, што асноўныя, ключавыя творы гэтага перыяду перакладзены. Засталіся, бадай што, толькі бліскучыя аповесці Васіля Быкава «Жураўліны крык» (1960 г.) і «Здрада» (1962 г.). Можна яшчэ назваць трылогію Міколы Лобана «Шэметы» — дзве першыя кнігі «На парозе будучыні» і «Гарадок Устронь», якія адлюстроўваюць той жа перыяд часу, што і творчасць выдатных майстроў К. Чорнага, М. Зарэцкага, Я. Скрыгана, І. Мележа і П. Галавача. Прычына запозненасці з перакладам — у чаканні апошняй часткі трылогіі. У часопісным варыянце яна з'явілася толькі нядаўна. Пра гэты твор і яго аўтара можна сказаць словамі беларускага крытыка Барыса Бур'яна: «...сёння, у сямідзесятых гадах, проста немагчыма разглядаць шляхі беларускай савецкай прозы без вопыту і дасягненняў Міколы Лобана».

У літаратуры сямідзесятых гадоў ёсць вельмі своеасаблівая, але яшчэ недастаткова ацэненая нават сваёй крытыкай аповесць Аляксея Карпюка «Вершалінскі рай» (1974 г.), мастацка-гістарычнае даследаванне эпідэміі сектанцтва, якая была ахапіла Заходнюю Беларусь на пачатку дваццатых гадоў. Латышскаму чытачу, магчыма, былі б цікавыя такія творы, як аповесць Міхася Стральцова «Адзін лапаць, адзінь чунь», аповесці Янкі Сіпакова «Крыло цішыні» і «Усе мы з хат» (між іншым абодва пісьменнікі — бліскучыя паэты), напоўненая вялікім на-

зброі ми в борні. Що треба вам? Страшні часи нічні. Що треба вам? Ми любим і в пітьмі». Ідэйная, сэнсавая дакладнасць перакладу бясспрэчная. А ўсё ж муляе гэтае «Що треба вам?»: выклік — невядома каму, які адсутнічае ў арыгінале.

М. Ваксмахер таксама назваў свой пераклад «Затемнение», «Ну что поделаешь, мы жили как в могиле // Ну что поделаешь нас немцы сторожили // Ну что поделаешь в тоске бульвары стыли // Ну что поделаешь сердца от горя ныли // Ну что поделаешь нас голодом морили // Ну что поделаешь мы безоружны были // Ну что поделаешь ночные тени плыли // Ну что поделаешь друг друга мы любили». Мужная інтанацыя надзвычайнага, аднак стрыманага болю, беспрасветнасці: «мы жили как в могиле», але — не разгубленасці, выйсця не было толькі часова: «мы безоружны были»; затое мелася іншая зброя — тая, што ніколі не дасць чалавеку прапасці: любоў да чалавека, вера ў яго. Рускі перакладчык адным слоўкам кінуў промнік і на «нацыянальнасць» арыгінала: «в тоске **бульвары** стыли», — якія ж бульвары без Францыі?!

На беларускую мову гэты верш перакладаў ужо А. Зарыцкі. Ён змешчаны ў кнізе паэта «У свет па песні» пад назвай «Чорная часіна»: «Што зробіш гібелі і мы пры нямецкай навале // Што зробіш нас ворагі ўдзень і ўначы пільнавалі // Што зробіш турмою нам родныя вуліцы сталі // Што зробіш жалоба і смутак на іх панавалі // Што зробіш і холадам-голадам нас мардавалі // Што зробіш без зброі ці мала мы дзён змарнавалі // Што зробіш панура цямнелі вячэрнія далі // Што зробіш адно аднаго мы пяшчотна кахалі». Інтанацыя першакрыніцы ўвасоблена проста беззаганна, і мне ўжо давялося аднойчы гаварыць пра гэта ў друку ў сваім слове пра кнігу выбраных перакладаў А. Зарыцкага. Гранічна ясная вобразнасць, рытмічная дасканаласць элюараўскага верша бясспрэчныя.

А вось варыянт «Зацямнення» ў перакладзе Э. Агняцвет. Прыходзіцца найперш зазначыць, што ў зборніку «З табою» гэта васьмірадкоўе стала сямірадкоўем: відаць, адзін радок — трэці знізу — згубіўся пры перадруку. У двухтомніку Э. Агняцвет на стар. 262 (2-гі том) пераклад надрукаваны правільна: «Чаго вы хочаце? Пад варту ўзялі дом. Чаго вы хочаце? Жылі мы пад замком. Чаго вы хочаце? Былі мы ў акружэнні. Чаго вы хочаце? Быў горад у зняменні. Чаго вы хочаце? Нас голадам душылі. Чаго вы хочаце? Па зброі мы тужылі. Чаго вы хочаце? Нас многія забылі. Чаго вы хочаце? Мы і тады любілі».

Роздумнасць першакрыніцы яскравая. А. Зарыцкі ўвёў у свой пераклад адсутны ў арыгінале вобраз нямецкай навалы, і гэтым удакладніў атмасферу твора. Самастойнасць пошукаў вобразных сродкаў Э. Агняцвет відавочная. І верыш гэтаму строгаму і даверліваму голасу. Не выглядае іншародным і радок «нас многія забылі», хоць ён і выклікае подумку: што тут маецца на ўвазе, хто каго забыў? І ўсё ж, паўтараю, вялікага пярэчання гэтая вольнасць не выклікае, таму што ёсць наступнае, вельмі важнае прызнанне, якое падагульняе ўсё раней сказанае: «мы і **тады** любілі». Тая ж, элюараўская неўміручасць чалавечнасці, Чалавека. Хоць і ўвасоблена іншымі моўнымі сродкамі. Бо ад чаго ж залежыць рознамаітасць перастварэнняў аднаго і таго ж твора, як не ад таго, што кожны чалавек па-свойму рэагуе на канкрэтную сітуацыю, па-свойму ўспрымае розныя з'явы жыцця, у тым ліку і слова.

Па сутнасці, усе пераклады Э. Агняцвет адзначаны сэнсавай, рытмічнай, стылявой дакладнасцю. Да прыкладу, верш «Апавяшчэнне», не кажучы пра ідэйную ідэнтычнасць з арыгіналам, і па форме зроблены бездакорна. Захавана нават разбіўка радка: «Ён пад цяжарам цела ўласнага // Стагнаў, ён сілу ўласную адводзіў». І калі параўнаць з рускім варыянтам (пер. М. Ваксмахера), верш гэты напоўнены большай эмацыянальнасцю. Праўда, часам якраз эмацыянальнасці і не хапае беларускай інтэрпрэтацыі элюараўскіх твораў. Пэўна, таму, што Э. Агняцвет не заўсёды ўдавалася знайсці раўназначнае ўвасабленне роднай моваю вобразнасці французскага паэта. Французская крытыка параўноўвала вобразы Поля Элюара з чорнымі дыяментамі, якія— нечаканыя, яркія, вытанчаныя —аж асляпляюць нас і прыводзяць у захапленне. Не можа не ўражваць «шолах сонца», «белая ружа твайго малака», «гушчар утульных няшчасцяў», «пяшчотны луг цеплыні тваёй...». Сходных дыяментаў шмат у перакладным зборніку. Таму й засмучае трошкі, калі яны пад пяром перакладчыцы часам страчваюць сваю зіхоткую незвычайнасць. «Le cristal d'un jour de pluie» —«крышталік дажджлівага дня» ператварыўся ў звычайныя «струмені дажджлівага дня»; «dans le golfe d'une source Tourne la clé d'un fleuve enirouvrant la verdure» — «у заліве крыніцы варочаецца ключ ракі, прыадмыкаючы зелень», — беларускае ўвасабленне першай часткі гэтай разгорнутай метафары болей спрошчанае: «крыніца — пачатак ракі — ключом адмыкае лістоту і травы». Дарэчы, рускі пераклад М. Ваксмахера багацейшы: «...в заливе ручья река поворотом ключа завесу листвы приоткрыла...» («Мэтай паэзіі павінна быць практычная ісціна»). Альбо ўзяць вобраз з верша «Я сказаў табе гэта для хмарак» — «fes cailloux du bruit» — «каменьчыкі шуму». Перакладное «для перастукування каменьчыкаў» спыняе ўвагу сваёй зацемненасцю, узнікае міжвольнае пытанне: якіх каменьчыкаў, дзе, хочацца ўдакладнення, якога кантэкст верша не дае; арыгінал жа — ясны, празрысты; «...вока, якое становіцца тварам і краявідам, // бо сон яму вяртае неба яго колеру»: чаму — бо? Чаму не першакрынічнае «...і сон яму вяртае...»? У арыгінале ж увасоблена думка — напэўна ж!— пра тыя вочы, што — люстэрка душы. Пераклад зацямняе сэнс, атрымліваецца, што вока заплюшчанае, у сне, «становіцца тварам і краявідам» для лірычнага героя верша...

І ўсё ж з такой усхваляванай удзячнасцю чуе і прымае душа жывы, трапятлівы голас Элюара, які да канца застаўся верны сабе, сваёй мужнай і пяшчотнай душы: упарта збіраў—і дагэтуль збірае!— людзей ля вогнішча творчасці, пераўтваральнай працы і братэрства:

Няма на свеце непраглядной цемры.
Паверце мне, калі я вам кажу,
Калі сцвярджаю,
Што нават у пякельнай той журбоце
Ёсць светлае акно, адчыненае насцеж,
Напагатове мара ёсць на свеце,
Жаданне ёсць, якое здзейсніць трэба.
На свеце сэрца ёсць праўдзівае,
І поціск рук надзейных,
І ўважлівыя вочы,
І ёсць жыццё, якое хоча
Святлом дзяліцца з іншымі людзьмі.

Ніна МАЦЯШ.

САВЕЦКІЯ — ГУЧЫЦЬ ГОРДА!

«САВЕЦКІ чалавек, — гаварыў на XXVI з'ездзе КПСС Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў, — гэта добрасумленны працаўнік, чалавек высокай палітычнай культуры, патрыёт і інтэрнацыяналіст. Ён выхаваны партыяй, гераічнай гісторыяй краіны, усім нашым ладам жыцця. Ён жыве паўнакроўным жыццём стваральніка новага свету». Кніга журналіста Мікалая Зяньковіча «Мы — савецкія!», якая на рускай мове выйшла ў выдавецтве «Беларусь», і паказвае савецкага чалавека як асобу, народжаную новымі сацыяльнымі ўмовамі, асобу, што ў эпоху развітога сацыялізму раскрываецца ўсімі сваімі лепшымі якасцямі, становіцца актыўным будаўніком камуністычнага грамадства.

«Сацыялагічныя партрэты»— такі падзагаловак мае гэты зборнік публіцыстычных нарысаў. Сапраўды, аўтар не проста стварае прывабныя воблікі сваіх герояў, а заглыбляецца ў сутнасць іхніх характараў, інтарэсаў, запатрабаванняў на аснове канкрэтных сацыялагічных даследаванняў, тым самым гаворка набывае важкі сацыяльна-грамадскі рэзананс, а партрэты асобных людзей становяцца пэўнымі штрыхамі да своеасаблівага «мікрапартрэта» савецкага грамадства ў цэлым.

Перад чытачом праходзяць прадстаўнікі асноўных сацыяльных і прафесійных груп нашай краіны. Сучасны рабочы клас, як вядома, уключае ў сябе індустрыяльных рабочых, аграрных рабочых і тых, хто працуе ў сферы абслугоўвання. Пра іх расказваецца на прыкладзе жыццёвых і працоўных лёсаў стругальшчыка Гомельскага станкабудаўнічага завода Анатоля Бедрыкава, механізатара саўгаса «Гарадзішча» Шклоўскага раёна Віктара Кароткіна, прадаўшчыцы Цэнтральнага універмага «Мінск» Леаніды Разборскай.

У эпоху развітога сацыялізму непазнавальна змянілася і савецкае сялянства. Змены гэтыя тычацца як умоў працы, так і адносін да яе, павышэння сацыяльна-палітычнай дзейнасці, духоўных запатрабаванняў і ідэалаў чалавека. Аператар машыннага даення кароў з калгаса «Нёман» Стаўбцоўскага раёна Алена Дорах таму і зацікавіла М. Зяньковіча, што яе жыццё — гэта жыццё соцень, тысяч сённяшніх вясковых жанчын.

Расказваецца ў кнізе і пра асноўныя атрады народнай інтэлігенцыі — вытворчы, педагагічны, медыцынскі, навуковы, упраўленчы. Тут аўтар таксама выбраў людзей цікавых, апантаных сваёй справай, якія з'яўляюцца носьбітамі лепшых рыс савецкіх людзей,— намесніка начальніка цэха гродзенскага вытворчага аб'яднання «Азот» імя С. В. Прытыцкага Уладзіміра Мінкевіча, настаўніцу з Нясвіжчыны Галіну Тычко, участковага тэрапеўта з Кобрына Людмілу Ілюкевіч, начальніка міжведамаснага канструктарскага аддзела Інстытута фізікі АН БССР Аляксея Шкадарэвіча і першага сакратара Карэліцкага райкома партыі Аляксея Яновіча.

Дзевяць нарысаў (дарэчы, яны публікаваліся на старонках газеты «Звязда» ў 1978—1980 гадах і былі ўдастоены прэміі Саюза журналістаў СССР) М. Зяньковіча, аб'яднаныя назвай «Мы — савецкія!» — цікавыя для самага шырокага чытача, паколькі ўслаўляюць зместам сваім савецкі лад жыцця, апяваюць характаро чалавека — працаўніка і стваральніка. А яшчэ, як слушна заўважаюць у прадмове старшыня праўлення Саюза журналістаў БССР, рэдактар газеты «Звязда» А. Тоўсцік і старшыня Беларускага аддзялення Савецкай сацыялагічнай асацыяцыі, доктар філасофскіх навук Г. Давідзюк, кніга гэтая — адна са спроб сінтэзу публіцыстыкі і сацыялогіі і яна «насычана багатым фактычным матэрыялам, які дае ўяўленне аб дзейнасці партыйнай арганізацыі рэспублікі па выкананні, грандыёзнай сацыяльнай праграмы, намечанай XXV з'ездам КПСС».

С. ВІРЗОЎСКІ.

родным жыццялюбствам аповесць Янкі Брыля «Ніжнія Байдуны», апавяданні і навелы Янкі Скрыгана, Барыса Сачанкі, Алеся Наўроцкага.

З лепшых дасягненняў беларускай літаратуры апошніх гадоў асобна вылучу раман Вячаслава Адамчыка «Чужая бацькаўшчына» (1978 г.), раман Віктара Карамазава «Пушча» (1979 г.) і аповесці Віктара Казько (адну з самых яркіх — «Суд у Слабадзе» — выдавецтва плануе выдаць у 1982 годзе).

Вячаслаў Адамчык ужо быў вядомы навеліст і апавядальнік, калі апублікаваў свой першы раман «Чужая бацькаўшчына». Гісторыя кахання маладой жанчыны выяўлена ў духу традыцый Кузьмы Чорнага, ярка адлюстроўвае ідэю «ўлады зямлі і ўлады над зямлёй». Дзеянне адбываецца ў 1937—1938 гг. у Заходняй Беларусі, якая тады была пад уладай Польшчы. Шкада, што напалову скарочаны перакладны варыянт на рускай мове ў часопісе «Дружба народов» не дае ўяўлення пра гэты твор тым, хто хацеў бы з ім пазнаёміцца.

Віктар Карамазаў таксама прыйшоў у прозу, доўгія гады выступаючы ў жанры апавядання. Актуальнасць «Пушчы» не фармальная для нашага і будучага часу. У цэнтр увагі рамана пастаўлены экалагічныя праблемы. Да тэмы людзей у працы і працы ў жыцці людзей пісьменнік звяртаўся яшчэ тады, калі пра гэта амаль не гаварылі. У рамане шырока абагулены і аб'яднаны ўвесь той матэрыял, які аўтар доўга і рупліва даследаваў у апавяданнях: творчыя і фармальныя адносіны да працы, у дадзеным выпадку — у чалавеку, праца якога звязана з лесам.

Некалькі слоў пра самых маладых.

Алесь Жук ужо заняў стабільнае месца ў беларускай літаратуры сучасным поглядам на рэчы і з'явы, дзівоснай аповесцю пра лёс старой жанчыны «Халодная птушка» і апавяданнямі.

Другі аўтар трох цікавых кніг Васіль Гігевіч.

Вядома, у выбар аўтараў мог украсціся пэўны суб'ектывізм. Іншы, можа, выбраў бы для перакладу іншыя творы, іншых аўтараў, гэтак жа выпадкова можа быць забыты той ці іншы пісьменнік, той ці іншы раман. Але галоўным крытэрыем выбару твораў для перакладу служылі ў нас мастацкасць, актыўная грамадская пазіцыя пісьменніка, улічвалася таксама мэта паказу тэматычнай шырыні і багацця беларускай літаратуры.

●

Пазнаёміўшыся з агульным станам (у дадзеным выпадку толькі прозы) літаратуры ў тым аб'ёме, які прадстаўлены ў перакладах, мы можам коратка падсумаваць нашы перакладчыцкія вынікі за трыццаць гадоў.

Відавочны і неабвержны той факт, што выданне твораў беларускай літаратуры на латышскай мове вялося мэтанакіравана і заняло сталае месца ў выдавецкіх планах. І гэта рабілася не для фармальнага кухоннага разліку, а планамерна, прадумана, сістэматычна. Нельга назваць ніводнага аўтара, ніводнага твора, які быў бы выдадзены выпадкова. Былі ахоплены і вялікая і малая проза, і драматургія, і паэзія, не забыта дзіцячая і юнацкая літаратура. (Толькі адна горкая кропля — прагал у публіцыстыцы, а між тым беларусы могуць ганарыцца унікальным творам, калектыўнай кнігай трох пісьменнікаў Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка, у якой сабраны жывыя галасы людзей, што былі расстраляны і спалены і якія засталіся жывыя, — трагічнай кнігай «Я з вогненнай вёскі...». Праз гэту кнігу робіцца ясней, чаму ў беларускай літаратуры няма пісьменніка, які б не пісаў пра вайну, ясней відны тыя пакуты, якія ў час вайны вынес на сваіх плячах беларускі народ).

Сёння стала магчымым пашыраць і паглыбляць тэматычныя абсягі выдаваемых намі беларускіх кніг. Але самая важная задача — падтрымліваць вялікі прэстыж праўдзівай, багатай беларускай літаратуры. Гэта задача і перакладчыкаў і выдавецтваў.

●

Калі сваю перакладчыцкую працу мы ацанілі так высока, а яна сапраўды можа вытрымаць строгую крытыку, з горыччу даводзіцца канстатаваць сітуацыю «пазіцый партнёрства». Якая доля латышскай літаратуры на беларускай мове, у Беларусі? Няўжо і сапраўды, напрыклад, «Агню і начы» Я. Райніса трэба чакаць выдання, калі прыняць пад увагу, што твор перакладзены яшчэ, прынамсі, дванаццаць гадоў таму назад? Няўжо сапраўды ў беларусаў няма аніякай магчымасці паўней загрузіць тых перакладчыкаў, пісьменнікаў і паэтаў, якія валодаюць латышскай мовай і ўжо зрабілі свой уклад у справу ўмацавання нашых літаратурных сувязей? Гаворачы пра гэта, я маю на ўвазе Рыгора Барадуліна і Васіля Сёмуху.

Пераклад з латышскай мовы.

ПРОЗА

Ніна МАЕЎСКАЯ

Таня позняя вясна

АПАВЯДАННЕ

ЯНА АМАЛЬ НЕ ЗАДРАМАЛА ЎНАЧЫ: прахоплівалася, бо плакала малое. Насіла яго па хаце, журботна мармытала бясконцае «а-а—а-а...» Потым клалася ў пасцель, прыслухоўвалася да яго дыхання, ціхага, як шоргат маладзенькай лістоты. Часам ёй здавалася, што яно зліваецца з цішынёй, і, страпянуўшыся душою, прыпадала да самага тварыку дзіцяці, палохалася сама, трывожыла і малое.

Затое Хведар соп на поўныя грудзі, то перарывіста, бы перапоўнены нейкім пачуццём, то цяжка і часта, бы ад некага ўцякаў. Ён спаў моцна, толькі адзін раз, калі доўга не ўціхала малое, прыўзняўся.

Раніцою, калі маладое веснавое сонца выжаўціла панадворак, яна кранула Хведара за плячо, але ён не варухнуўся. Страсянула. Ён глянуў на яе, бы адразу не пазнаў, потым, злавіўшы руку, пацягнуў да сябе. Яна настойліва выслабанілася.

— Не чапай! Як гаварыць з табою пасля ўсяго: нап'ешся...

— Ну, ідзі сюды,— працягнуў ён руку.— Ты думаеш, мне лягчэй? Галава гудзе...— Хведар закрыў твар рукамі.— Мо расол які ёсць? — папрасіў мякка, каючыся.

«Халеры табе, а не расолу»,— пажадала ў думках яна, але пайшла на кухню, пагрымела посудам і вярнулася з кубкам. Ён прыгарнуў яе да сябе.

— Ну, не ўпарціся,— сказаў прымірэнча-лагодна.— Паедзем, Аксеня, адсюль, паедзем,— прашаптаў ён, абдымаючы яе.

Яна холадна выслабанілася:

— Старыя мы па свеце цягацца,— адказала сурова. — Толькі свой куток займелі, а ўжо некуды ехаць. І тут людзі жывуць, не п'юць...

— А я не магу, не магу болей! — амаль закрычаў ён, б'ючы сябе ў грудзі.

Ад гэтых слоў у Аксені быццам нешта адарвалася ўнутры, аслабелі ногі.

— І я не магу,— ціха сказала яна і села на ложак каля дзіцяці. Маланкава пранізала думка: «Ліда! Ён не можа забыць яе». Адразу зрабіліся млявыя рукі, адчула, як цяжка леглі яны на падол: здалося, ужо не падняць, а столькі работы з дзіцем.

— Абрыдлі мне і гэты «Рамбуд», і Ладуцька! — не ўнімаўся Хведар.

«Усё яму цяпер не ў лад»,—падумала яна, а ўслых папікнула:

— Гэта ж сабутэльнік твой, разам па забягалаўках лахкаеце.

Упікнула не зласліва, а з нейкім жалем і шкадаваннем. А сама падумала: «Хаця б і Ладуцька — стары чалавек, а водзіцца з Хведарам. Ці раўня ён яму?»

— Чхаў я на гэтыя рублі яго! Усё жыццё толькі ведае, што над імі трасецца. Слізняк...— з агідаю сказаў Хведар. — Паслухай, а і праўда, паедзем, паедзем куды на будоўлю. Вялікую...

Хведар памкнуўся да яе, нібы хацеў абняць, але яна торкнула ў рукі яму малое.

— На, патрымай, пакуль я пялёнкі развешу...

...Дзень праходзіў, як звычайна, у клопатах аб дзіцяці.

Мыла бялізну, гатавала ежу — усё думала, думала пра жыццё сваё, пра Хведара. І ні ў чым не знаходзіла ўцехі. У пярэстую блытаніну думак востра ўрываліся словы яго: «Не магу я, не магу болей...» Яна ўздрыгвала, як ад нечаканай бліскавіцы. Хацелася зараз жа звязаць клунак, узяць дзіця на рукі ды пайсці да маці. Парывалася да шафы, хапатліва кідала на ложак бялізну, дзіцячыя рэчы, намервалася зняць з плечыкаў сукенкі, але спынялася, праводзіла рукою па рукаве Хведаравага касцюма, які вісеў тут жа, здымала парушынкі. Паціху надыходзіў одум. Нейкі чужы, нутраны голас пытаў: «Куды? Да маці? А хіба мала нагаравалася яна, гадуючы вас без бацькі? Ці з дабра ты паехала на лесараспрацоўку? Мо па кавалак хлеба, якога не ставала ў хаце? А мо ад яго, ад Хведара?..»

Падавала голас малое. Яна распавівала пруткія ўжо ручаняты, карміла яго, забаўляла, песціла. І памалу адступалася ад свайго намеру. Угаворвала сябе: «Дзіцяці трэба бацька, пакуль яно малое, нямоглае... І потым...»

Але супярэчлівая думка, як вельмі знаёмы, але даўно не чуты голас, насцярожвала: «А навошта? Чакаць, пакуль ён забудзе яе, Ліду? Відаць, не так проста гэта, столькі гадоў пражыўшы. Кот, сабака, што ля дому жылі, і тыя не скора забываюцца...»

На памяць прыйшла сустрэча з Хведарам. Прыехала яна якраз дадому: напісала сястра Ганька, што ў іх у мястэчку льнозавод будаваць будуць, рашыла — работа знойдзецца, ды і жыла яна, нібы пералётная птушка ў выраі. Замуж не выйшла: пераседзела вельмі, а потым душа ні да каго не гарнулася, ды і прапаноў не было.

Родны дом, з дзяцінства блізкія мясціны неяк адразу перайначылі яе, абудзілі прытоеныя пачуцці пяшчоты і даверу. Не магла нарадавацца, што зноў з маці, нагледзецца на Ганьку. Усё знаходзіла ў ёй новае: заўважыла, як выгнала яе ўгору, як цавіну, а відно, што падлетак, вунь грудзі яшчэ, як слівы.

Нібы адступілі гады: і яна, Аксеня, зрабілася бы равесніцай Ганькі, калі ішлі да клуба, узяўшыся подручкі. Здалёк яшчэ шчымліва кранула сэрца мелодыя «Амурскіх хваль». Усё было, як у яе шаснаццаць: і гэта мелодыя, і вуліца з утоўчанымі па баках сцежкамі, з процьмай кветак за платамі ў гародчыках, і ўсё тыя ж дзядзькі з цыгаркамі ў зубах, і цёткі ў стракатых хустачках сядзелі на лаўках ля сваіх двароў. Усё здавалася Аксені, што гэта свята, свята яе вяртання дадому. Вось гэтыя бабкі, што сядзяць ля двароў і вядуць нетаропкую гаворку, і моладзь, што спяшаецца да клуба,— усе запрошаны на яе свята. Каб яны ведалі, якое шчасце вярнуцца дадому, які адразу спакой і неспакой на сэрцы!

Білетаў у кіно не было, і яны спыніліся непадалёк ад купкі дзяўчат і хлопцаў, якія гучна смяяліся, жартавалі. Не хацелася ісці дадому, ды і гэты гаманлівы натоўп не спяшаўся заходзіць у клуб, хаця да пачатку сеанса заставаліся хвіліны. Аксеня разглядала людзей. Зазначыла сабе, што многія змяніліся, шмат моладзі. Крышку стала самотна, як бы пашкадавала, што за трыццаць ёй, ці пазайздросціла, што не было ў яе шаснаццаць вось такога клуба ў іх мястэчку, цаглянага, з высокім ганкам. Прызыўна празвінеў званок, і Ганька кранула Аксеню за руку: «Чаго стаяць? Лепш пройдземся». Яны пайшлі вуліцаю ўсё гэтак жа, подручкі. Тады і падышоў Хведар. Усё было даўно вырашана, выкінута, здаецца, з душы. Ён для яе не існаваў. Але як захвалявалася яна, затрымцела, нібы асіна, а ногі, здалося, прыраслі да зямлі. «Няўжо яно яшчэ жыве, гэта пачуццё?» — падумала і здзівілася. А толькі і было, што раз правёў дадому, хацеў пацалаваць, а яна, баронячыся, грабянула яго з усяе сілы (маладая, дзікаватая), потым пакутавала, калі пачула, што ажаніўся, з'ехала ў Карэлію.

«Пойдзеш са мною ў кіно?!» — ці то запытаў, ці то загадаў Хведар. Яна на момант завагалася, не знайшла, што яму сказаць, маўчала. Ганька тузанула яе за руку: «Хадзем, чапляюцца ўсякія».

«Я сур'ёзна, у мяне білеты прападуць...» — настойваў ён, быццам гэта было для яго вельмі важна.

Аксеня глянула яму ў вочы: у іх была заклапочанасць, якая нагадвала разгубленасць, і нейкія яшчэ затоеныя пачуцці, якія хацелася разгадаць. Ганька зноў тузанула за руку. Ён перахапіў позіркам гэты рух.

«А ты, куранё, давай дадому, спаць пара»,— строга, без усмешкі сказаў ён да Ганькі.

Яна здзіўлена глянула на Аксеню, і, калі тая зрабіла крок насустрач Хведару, як ад чагосьці вельмі гарачага адхапіла сваю руку і хутка-хутка пайшла па вуліцы.

— Як ты магла з чужым, незнаёмым чалавекам пайсці ў кіно вось так проста? — дакарала яе потым Ганька.— Ты ж пра яго нічога не ведаеш...

Аксені ж чамусьці было лёгка, і гэта яе ніколечкі не палохала.

— Не ведаю, дык от заўтра і ўведаю,— адказала бесклапотна яна.— Я ж дома, Ганька!

Ганька сядзела на ложку. Пад кашуляй вытыркаліся яе худыя, вострыя плечукі, доўгія рукі ляжалі на коўдры, а на твары было абурэнне, якое яна, відаць, не ведала, як выказаць, толькі чырванню ўспыхвалі шчокі ад хвалявання.

Аксеня хуценька распранулася і легла побач з ёю. Ганька адвярнулася тварам да сцяны. Яны маўчалі.

— Не асуджай мяне,— ціха папрасіла Аксеню, гладзячы яе, як малую, па плячах. Ганька не азывалася, яна затаілася, як мышаня.

— Табе добра, вунь хлопцаў колькі, не тое, што ў мае гады. Ды хлопцы якія—высокія, вясёлыя,— гаварыла Аксеня, усё яшчэ гладзячы яе па плячы.

Яны доўга ляжалі моўчкі. У кожнай былі свае думкі.

У Аксені яны былі маладыя і радасныя, як зіхатлівыя сонечныя водсветы.

...Яна спавіла малое, загарнула яго ў ружовую коўдру і выйшла на вуліцу. Стала пад страхою ў зацішку на сонцы, глядзела, як гуляюць дзеці ля гаманкога раўчука, але міжволі пазірала ўздоўж вуліцы. Даўно праскочыў рамбудаўскі аўтобус, які возіць рабочых, а Хведара ўсё не было. Цьмяная трывога павяла яе вуліцаю да павільёна «Ветрык», які пасялкоўцы называлі проста забягалаўкай.

Хведар быў з дружбакамі: згорбленым, маршчыністым Гаўрылавічам і заўсёды ўзмакрэлым, ён усё выціраў насоўкай пот з ілба, Іванам Ладуцькам.

Хведар прыкмеціў Аксеню яшчэ здалёк і глядзеў на яе з ухмылкай, маўляў, падыдзі, пагляджу я, што з цябе будзе. І сябры кідалі позіркі то на яго, то на яе: на яе — цікаўныя, на яго — падбухторніцкія.

У вачах у Хведара ўспыхвалі нядобрыя агеньчыкі злосці, і яна зразумела: ён выпіў і выпіў добра. «Рукі трымае ў кішэнях штаноў, як хлапчук, зацісніўшы ў кулак потныя манеты». Яна падыходзіла бліжэй, да жаху анямелая, але трымалася проста, бо на руках спала малое. Хведар не памкнуўся ёй насустрач, а, здавалася, падпускаў бліжэй.

— Ну, што скажаш? — праз зубы працадзіў ён і скалануўся, затросся, як ад холаду. Яе ж сапраўды працяло холадам, востра і балюча, але ў той жа момант запякло ўнутры і, здаецца, яна гатова была схапіць яго загрудкі, але рукі былі занятыя — сцішана спала малое.

— Выйшла напаказ,— буркнуў ён, хістаючыся,— маладуха!

Ладуцька ўжо спрабаваў зазірнуць пад ражок белай прасцінкі, якая накрывала твар дзіцяці, ён смешна крывіў тоўстыя губы, прыцмокваў, нібы ззываў парасят.

Гаўрылавіч стаяў воддаль, прыхіліўшыся да плоту. Ён штосьці гаварыў шэптам, артыстычна адводзячы руку, потым разгублена азіраўся і выціраў далоняй маршчыністы, як пакамячаны, твар.

Ладуцька ўсё-такі зазірнуў у тварык дзіцяці: расчулена заўсміхаўся, заморгаў.

— А не прызнаваўся, — узрадавана, нібы адкрыў вялікую тайну, ён кухтыльнуў Хведара пад бок. Той пахіснуўся. У Аксені штосьці абарвалася ў грудзях ад жаху, што ён зараз пляснецца ў гразь.

— Ды за гэта як не выпіць, ну хоць па куфлю піва,— падбадзёрваў Ладуцька.

Ачнуўся і Гаўрылавіч. Ён намагаўся адхіліцца ад плоту, каб цвярдзей стаць на ногі і зноў рушыць у забягалаўку.

Хведар выцягнуў з кішэні руку, расшчапіў кулак, на далоні жаўцела некалькі манет, аблепленых папяросным смеццем.

— Усё,— выдыхнуў ён і гідліва перасыпаў у пухкую далонь Ладуцькі.

Да затуманенай свядомасці Гаўрылавіча дайшло, што ён павінен дадаць сваю частку: Гаўрылавіч быў інтэлігент, былы настаўнік, калісьці ён нават папісваў вершы, друкаваў іх у раённай газеце. Ён ніколі не піў на чужыя грошы, лічачы гэта непрыстойным.

Прыхіліўшыся да плоту, Гаўрылавіч аберуч нязграбна абмацваў кішэні запэцканых фарбай штаноў (ён працаваў мулярам). Выцягнуўшы грошы, праяснеў тварам і з палёгкай уздыхнуў, аддаючы іх Ладуцьку. Той ліхаманкава, аж узмакрэў ягоны лоб, стаў пералічваць і нешта прыкідваць. Потым кіўнуў задаволена галавою і рушыў у «Ветрык». Гаўрылавіч, як прывязаны, паплёўся за ім. Хведар нейкую хвіліну вагаўся, доўгім атупелым позіркам паглядзеў на дзверы «Ветрыка», потым на Аксеню. Здавалася, ён чакаў, што скажа яна.

— Хлус няшчасны! Кляўся, бажыўся, а як звечарэла — за сваё...

Голас яе дрыжэў, гатовы вось-вось сарвацца на плач. Хведар паморшчыўся, таксама гідліва, як і аддаваў дробязь.

— Усе вы аднолькавыя,— буркнуў ён, цыкнуў слінаю праз зубы і рушыў за сябрамі.

Аксеня стаяла нерухома ля «Ветрыка» на лапіку сухой дарогі. Браўся марозік. Крыху тужэла нанач гразь. Вячэрні холад кранаў плечы. У роспачы яна адчувала, як непаразуменне і недавер, бы невідочная перашкода, узнікае між ёй і Хведарам, намаганні разбурыць яе разбіваюцца, як дажджавыя кроплі. У ліхаманкавым роздуме пашкадавала, што звязаны рукі, каб не дзіця, яна б знайшла рады,— потым рашуча зайшла ў піўную.

Змеціўшы яе, забегаў між сталоў Ладуцька. Хведар і Гаўрылавіч ужо цягнулі пеністае піва. Хведар — вялікімі глыткамі, нібы мучыла яго даўняя смага, Гаўрылавіч цадзіў праз зубы. Згледзеўшы Аксеню, якая падышла бліжэй, прыўзняўся, чапляючыся за ножкі стала, намерыўся даць ёй сесці, але яго спыніў, крануўшы за плячо, Ладуцька, які прывалок алюміневае крэсла. Хведар не варухнуўся, здавалася, ён ведаць не ведае гэтую жанчыну ў стракатай касынцы, з ружовым скруткам на руках. Ладуцька мітусіўся і шчабятаў:

— Гэта харашо́, дзіця, харашо́! Радасці ад іх колькі!

Аксеня разагрэлася, паклала на калені дзіця; пачалі адыходзіць занямелыя рукі. Ладуцька пабег браць ёй піва. Ліслива круціўся перад пярэднімі ў чарзе, заглядаючы ў вочы, падаваў дробязь, ківаў на Аксеню.

Гаўрылавіч утаропіўся на Аксеню, быццам не мог ніяк пазнаць яе.

— Твая? — спытаў ён у Хведара. Той кіўнуў галавою, не адрываючы губ ад куфля.

— Не хадзі ты сюды, не трэба, яны самі разбяруцца. То ж гадаванец яго,— ён паківаў галавою, і зноў нешта сваё, асабістае наплыло ценем у яго вачах. Ён імкнуўся ўхапіцца за нейкую думку, а яна выслізгвала, нібы рыба з рук. Мыляў губамі, шэптам намагаўся ўтрымаць яе, але — дарэмна.

— Хадзем дадому,— мякка сказала Аксеня да Хведара.

Ён зірнуў на яе здзіўлена, нібы не зразумеў, нешта яшчэ раздумваў, нібы чакаў, каб яна паўтарыла гэта зноў.

— Хадзем, Хведар...

Голас яе быў пакорна-праслівы.

Ладуцька глянуў на гадзіннік і хапіўся рукамі за голаў:

— О, нагарыць мне сёння, хоць дадому не ідзі. Баба ў мяне — у-у-у,— сціснуў ён зубы. Яшчэ раз, ужо ўважлівей, глянуў на гадзіннік.— Твая? Што твая! — ён крануў за плячо Хведара.— Гэта ж каб мая прыйшла...— ён шырока, нібы жахнуўся, вытрашчыў вочы.— Усё тут ператварылася б у...— павёў рукою, паказваючы на залу і, відаць, не знайшоў параўнання,— страшна сказаць што...

Ён гаварыў гэта, выхваляючыся, як паляўнічы, які займаў сяброў неверагоднай гісторыяй. Хведар, слухаючы яго, недаверліва крывіў губы. Увесь яго выгляд гаварыў: «Давай, давай, хлусі».

— Дык ты грашамі паддобрываешся,— Аксена ўпікнуў ён.— Кішэню поўную носіш.

— Хведар,— з дакорам сказала Аксеня, чакаючы яго.

— Пастой,— тонам загаду звярнуўся ён да Ладуцькі.— Не пагаварылі мы...

— Заўтра, заўтра,— выкручваўся Ладуцька.

Ён устаў. Ціха вылаяўшыся, нехаця падняўся Хведар. За плячамі яго стаялі хлопцы з талеркамі ў руках, падбадзёрвалі: «Давай, давай, баця, не марудзь, нам перакусіць бы — машыны стаяць». Пад акном сапраўды пыхкалі і вуркталі МАЗы.

Толькі Гаўрылавіч не варухнуўся, ён выняў зашмальцаваны блакноцік і здранцвелымі пальцамі намагаўся штосьці запісаць, губы яго варушыліся.

Аксеня і Хведар ішлі пасялковай вуліцай. Ён наперадзе, трымаючы рукі ў кішэнях, яна — ззаду, несучы дзіця. Ішлі каля новых дамоў, гаманлівага клуба, каля маладых, вось-вось гатовых распавіць лісце дрэў. Здавалася, нічога не кранала іх, не прыцягвала ўвагі, яны ішлі, паглыбленыя ў свае думкі, не заўважаючы сустрэчных, ішлі моўчкі, як чужыя. Параўняўшыся з шырокімі вокнамі швейнай, Аксеня бы ачнулася, зглядзеўшы, як прыхінуліся да шыб твары швачак. «Магчыма, сярод іх і Ліда»,— падштурхнула думка і яна пайшла хутчэй, нібы хацела схавацца ад яе вачэй, спакойных і крыху сумных тады, у тую іх сустрэчу.

...Аксеня ішла тады з базара, яшчэ не была за Хведарам і зусім іншая з выгляду: высакагрудая, крамяная. Заўважыла, што след у след за ёю ідзе жанчына. Прызнацца, спачатку зніякавела, калі пазнала яе. Пазнала — не тое слова, адчула нутром, што гэта жонка Хведарава, Ліда. Яна загарэлася ўся, нават пудліва крутнулася ўбок і пайшла хутка-хутка, не азіраючыся, але адчувала, што жанчына ідзе следам. Каля прысад спынілася, села на лаўку. Тут было ціха — наўкола ні душы.

Ліда ішла спакойна, і на момант Аксені здалося, што хвалявалася яна дарма: як ідзе, так і пройдзе міма. Але Ліда спынілася. Села з краёчку лаўкі. Разглядала Аксеню з ног да галавы спакойным, пільным позіркам, ад якога ёй рабілася ніякавата.

— Дык ты вось якая,— сказала яна. Што гэта было—дакор ці здзіўленне, — Аксеня так і не зразумела.

...І зноў быў вечар з кпінамі і папрокамі, бяссонная ноч і доўгі веснавы дзень. Зноў яна чакала яго з работы, прыхіліўшыся да цёплай сцяны дома, углядалася ў канец вуліцы. Раз-пораз ляпалі дзверы пад'езда двухпавярховага дома, дзе жылі сем'і льнозаводскіх рабочых, дзе і яна, Аксеня, атрымала пакойчык, як нарадзіла дзіця. Вечарэла, і людзі вярталіся дамоў, а Хведара — не было. Смуткам поўнілася збалелая душа, у вушы ўрывалася тужлівае кугаканне, нібы плач нейкай птушкі. Аксеня падняла вочы, і аж здзівілася: якое высокае і блакітнае неба, нібы ўбачыла яго ўпершыню. Блакіт сляпіў вочы. Над галавою, жаласліва галосячы, кружылі шызыя чайкі. Аксеня доўга сачыла за птушкамі, хацела разгадаць іх тугу. «Гэта ж вярнуліся дадому, а замест балота, дзе ў купінах былі іх гнёзды,—стаяць дамы: людзі разбурылі іх». Сэрца яе поўнілася спагадай і нават вінаватасцю. Яна думала аб Лідзе. «Чаму яна тады так паводзіла сябе? Чаму не бараніла сям'і, адступілася?»

Па натуры Аксеня была не навязлівая, яна ніколі не выпытвала ў чалавека таго, аб чым ён не хацеў гаварыць. Гэткія далікатныя адносіны ў яе былі і да Хведара: нашто варушыць пражытае, трэба жыць сённяшнім. Тады яна не хацела нічога ведаць пра яго: ці мала як бывае ў жыцці, як складзецца лёс,— дзеля чаго гэта ўсё, каб папікнуць яго ў смутную часіну або мучыцца самой.

Але цяпер яна адчула, што не разумее Хведара, не ведае яго звычак, не можа апраўдаць паводзін. Паміж імі вырасла адчужанасць. Ён нешта таіў ад яе, пакутаваў. І, як амаль кожная жанчына ў яе становішчы, першае, у чым яна ўсумнілася — у пачуццях Хведара. Праўда, ён ніколі не гаварыў, што любіць яе, ды і ёй здавалася, што ў сталыя гады няёмка гаварыць пра такое: яно павінна быць у адносінах... І тады, у той вечар, калі ён прыйшоў да яе з чамаданікам, не сказаў тых слоў, толькі, хвалюючыся, прамовіў: «Ну, я прыйшоў...» Яна, каб сцерці няёмкасць, прапанавала: «Распранайся, будзем вячэраць»,— нібы ён, як звычайна, прыйшоў з работы дадому. І ўсё было проста і зразумела. А цяпер... Ёй хацелася яснасці, няхай нясцерпна балючай, але яснасці. Прыйшло рашэнне пагаварыць з Лідай,— неадчэпна, навязліва турбавала яе гэта думка.

Аксеня хутка зайшла ў пакой, перапавіла ў сухое дзіця, паспешліва знайшла ў шафе адрэз крамніны, які ляжаў гады са два: усё не магла падабраць фасон.

Яна пайшла вуліцаю. Мінула маладыя прысады, нават не глянула ў бок «Ветрыка», дзе, пэўна ж, быў Хведар. Спынілася на парозе швейнай: абабіла з ног наліплую гразь, сцішыла затрымцелае сэрца.

У прымерачнай Ліды не было, а маладзенькая прыёмшчыца прапанавала зайсці ў цэх. Аксеня спынілася на парозе цэха. У палахлівай цішыні жаночы голас з'едліва-ветліва папрасіў:

— Дзяўчаткі, схадзіце на склад па Ліду Іванаўну. Скажыце, да яе прыйшла... разлучніца,— апошняе слова яна пачула ўжо за дзвярамі.

Аксеня знямела, адчула, што размаўляць з Лідай у яе не хопіць сіл. «Навошта прыйшла? Дадому!»

Швачкі загаманілі, як вераб'і на маладой вішні ля ганка. Раптоўна залілося плачам дзіця. Пагушкала яго на руках,— не ўціхала.

— Прысядзьце, раскруціце яго, у нас цёпла,— ветліва прапанавала прыёмшчыца.

Занятая дзіцем і сваімі думкамі, Аксеня не заўважала нічога навокал, нават Ліды. Расшпіліла гузікі пальто, села вальней у крэсла, намерылася пакарміць малое, каб супакоіць.

Ліда села насупраць. Пільным позіркам яна сачыла за Аксеняю, за тым, як яна, адвярнуўшыся, выціскае з грудзей кроплю малака,— так назірае маці за дачкою, хочучы і баючыся што-небудзь параіць.

Малое тузала цыцку, нервавалася, плакала. Аксеня цішком угаворвала, супакойвала, ражком прасцінкі выцірала ягоны тварык.

— Не прыкормліваеш яшчэ? — раптам запытала Ліда.— Мусіць, яму не хапае малака. Трэба прыкормліваць...

— Мо з вачэй гэта? — яна палка зірнула на Ліду.

— Вочы мае не благія, не бойся. Не жадаю я табе ліха, а што кепска табе — бачу. Ды і людзі гавораць. Людзям языкі не пазавязваеш.

Ліда скручвала ў кацёлачку сантыметр, і, здавалася, пальцы яе злёгку ўздрыгваюць.

Аксеня ж злавала на сябе, што вось так недарэчна, сама сабою пайшла гаворка. Ці ж не яна ішла да Ліды па параду? А цяпер вось кпіць.

Зноў яе ахапіла пачуццё вінаватасці перад Лідаю, як тады, у дзень, калі галасілі чайкі над дахам. Зноў яна памякчэла душою. Заціхла, прыдрамала ля грудзей дзіця, і Аксеня ціхенька паклала яго на крэсла.

З цэха паказалася вастраносенькая, шустрая швачка. Яна падышла да Ліды з нейкім шыццём, а сама зіркала цікаўным позіркам, але Ліда строга сказала:

— Ідзіце і працуйце, Наташа! Прыйду, усё высветлім!

(Заканчэнне на стар. 10—11).

З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Валянціна КОЎТУН

Рачны млын

Як гром нямы, стаіць на мулкай
рэчцы.
Як бог вады, што ўкамянеў даўно.
Стамлёны млын парваў старыя
лейцы.
Забыты млын пусціў ключы
на дно.
А як было!?
Шалёнымі рукамі
Ён шыі гнуў паводкам і вятрам.
І вечары старымі прымакамі
З пашанаю скідалі шапкі там.
Ці зерне слёз...
Ці толькі праўда жыта...
Ці хлеб наш толькі з белае мукі?!
Рыпела неба ўтомнае сярдзіта,
Круціліся пад жорнамі вякі.
Быў чорны хлеб
чарствей за грудку болю.
Прыспешыў час касмічную хаду,
Калі на золь разворанага поля,
Здавалася, вось-вось і я ўпаду.
Мой браце млын!
Туга з плячэй спадае.
Пра даўні клопат
забываць пара.
Ды зорны пыл,
нібы мучны,
страсае
Унук майго народа-млынара.

Удава

Ласкава так і нечакана
Раса на травы ападзе...
Ёй на плячо, як хлопчык, ранак
Свой мяккі чубік пакладзе.

Цяпло світальнае на вокнах,
Вячорны холад — у душы.
І лёсу выплаканым вокам
Глядзіць калодзеж на жанчын.

Яна да радасці ахвоча,
Смяшок расколе, як арэх.
Чаму ж вадою да краёчкаў
Ніяк вядро не набярэ?..

Праднавальнічнае

Сухой галінай дрэва не параніць,
Травой забытай вёсны не вярнуць.
А хтось пачуў маіх вятроў
дыханне,
А будзе вецер —
будзе крыж агню.
Калі чало бароздзяць зараніцы,
І зорны ключ павернецца ў замку,
Нас апячэ пякелле інквізіцый,
Нас кіне боль у вечную раку.
Аркестраў слуп. Суцішак
матылёвы.
Прычасце вёснаў. Помарак
двароў.
З бусліных біблій скрыленыя
словы
Ляцяць, нібы абраннікі вятроў.
Ідуць па небе хмары, як манахі,
Схаваўшы пад сутанамі грамы.
Не варухнуцца высмяглыя страхі,
Не адрачэмся навальніцы мы.
Віруе ўзвей. Мінаюць пакаленні
На зломе жыта, сцежак, бліскавіц.
І толькі вецер маладым аленем
Губою схопіць кропелькі крыніц.

Замова ветру

Уладзіміру КАРАТКЕВІЧУ

Прыходзіць вечар выспеленым
шляхам,
І перад ночы вогнішчам сівым
Залётны вецер завядзе, як знахар,
Свой спеў трывожны, гойдаючы
дым.

О, лёс вятроў, гарачы і суровы.
У горле памяць за тытунь гарчэй.
Ляцяць у прысак вогненныя
словы,
Нібы слязіны палкія з вачэй.

Начной парою ён адзін у свеце
Адчуе сілу слова і агню.
Ўсе людзі спяць.
Старыя спяць і дзеці.
І толькі ветру продкаў не да сну.

Бяссонны рыцар зорных
сутарэнняў
Склікае веча непадкупных слоў.
Вядзі мяне на споведзь
да натхнення,
Пакліч мяне пад белае крыло.

Свой рэй пачні ўладарна
і сурова.
О, вецер продкаў,
Вецер, гавары,
Каб праўнукі для
гартавання слова
Распальвалі магічныя кастры.

Еўдакіі Лось

Зрываюць песні, як з бяроз
бяросту...
Палаюць вёсны. Крышацца сады.
Мы ўсе ідзём да той мяжы
і ўзросту,
Калі сказаць нялёгка пра гады.
А я твой шлях трывожны
бласлаўляю.
І хто там скажа, што паўторыць
шлях?!
Не спіць, не гасне і не памірае
Святло жанчыны ў стуленых вачах.
Плывуць крыжоў гарачыя
абломкі,
Кіпіць трава на мове каранёў.
Бяссмерце — там...
А крок будзённы лёгкі.
Мы твой пагорак, пэўна, абмінём.
Але ў агні, у горкім азарэнні,
Калі рукой падаць да адкрыцця,
Перацярпеўшы ўзлёты і падзенні,
Мы зразумеем сімвалы жыцця.
Сярод трывог імклівага
прагрэсу,
Калі душа з тваёю на мяжы,—
Дай бог дажыць да ўзросту
паэтэсы,
Дай бог да паэтэсы нам дажыць.

У ЛУЧНАСЦІ БРАТНЯЙ

ІМГНЕННЯЎ ГЭТЫХ — ЦУД

ВЫСТУПЛЕННІ Ў МАСКВЕ для работнікаў літаратуры і мастацтва — заўсёды адказны творчы экзамен. Менавіта такую справаздачу і трымаў у гэтыя майскія дні ў Маскве рэспубліканскі Дом работнікаў мастацтваў, куды выязджала прадстаўнічая творчая брыгада.

Першая сустрэча са сталічным гледачом праходзіла на Маскоўскай ордэна Леніна абутковай фабрыцы «Буравеснік». У госці да рабочых прыйшлі народны артыст СССР Р. Янкоўскі, народныя артысты БССР Л. Бржазоўская і Ю. Траян, а таксама артыстка Н. Чамадурава, спявачка Л. Колас, канцэртмайстар Л. Талкачова, кампазітар Э. Ханок і намеснік старшыні прэзідыума праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання К. Белавусаў.

У Доме культуры фабрыкі адбылася зацікаўленая гаворка як аб поспехах калектыву, так і аб поспехах беларускага мастацтва. А найлепшым пацвярджэннем таму, што яно таксама дасягнула значных вышынь у сваім развіцці, стаў канцэрт гасцей. Масквічы мелі мажлівасць пазнаёміцца з урыўкамі са спектакляў, паслухаць класічныя творы і папулярныя песні. На развітанне ж гаспадары падарылі кожнаму госцю значок з адлюстраваннем буравесніка і кнігу «Наш «Буравеснік», у якой прасочваецца амаль шасцідзесяцігадовы шлях прадпрыемства. На першай старонцы яе засталіся дарагія словы: «Дэлегацыі Беларускага Дома работнікаў мастацтваў на памяць аб сустрэчы з рабочымі. 18 мая 1981 года».

А вечарам у каміннай зале Цэнтральнага ордэна Дружбы народаў Дома работнікаў мастацтваў СССР таксама было ажыўлена. Беларускія артысты сустракаліся з тымі, хто ў грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны набліжаў светлы і радасны дзень перамогі, змагаючыся ў партызанскіх атрадах і падполлі, ваюючы ў дзеючай арміі. Лёс кожнага з гэтых людзей, так ці інакш, звязаны з зямлёй непакоранай Беларусі, зямлі рэспублікі-партызанкі, што ў час суровых выпрабаванняў страціла кожнага свайго чацвёртага жыхара.

«Памяць сэрца»... Бадай, лепшай назвы для гэтага вечара і не прыдумаеш. Сапраўды, тут, у невялікай утульнай зале гаварыла сама чалавечая памяць. І час, суровы і няўмольны ў сваім руху наперад, як бы перанёсся на дзесяткі гадоў назад. І сабраліся, здаецца, сябры-таварышы не ў Доме мастацтваў, а недзе ў франтавой ці ў партызанскай зямлянцы. Палае агонь у каміне, на сталах — печаная бульба і салдацкія біклагі...

За столікамі — ветэраны. Былы міністр унутраных спраў БССР, намеснік начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху генерал-палкоўнік С. Бельчанка, былыя ўдзельнікі барацьбы супраць фашысцкіх акупантаў А. Чэрнікава, Т. Аршынава, П. Папоў і многія іншыя. Сёння яны жывуць далёка ад зямлі, з якой звязаны самыя яркія і незабыўныя старонкі іх біяграфій, але сэрцам па-ранейшаму там — ля блакітных азёр, у густых лясах, сярод сяброў сваіх па сумесным змаганні з фашызмам.

Да ветэранаў вайны звяртаецца старшыня прэзідыума праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання, народны артыст БССР М. Яроменка.

Ля мікрафона народны артыст БССР М. Яроменка і народная артыстка РСФСР Н. Казанцава.

Гаворыць аб значным укладзе, што ўнёс беларускі народ у справу разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў, нагадвае, што дзеячы мастацтва і літаратуры рэспублікі, работнікі культуры заўсёды імкнуцца не абыходзіць сваёй увагай былых франтавікоў, партызан і падпольшчыкаў, прысвячаюць ім свае творы, свае выступленні. І вечар «Памяць сэрца» — таксама для тых, каму ўсе мы абавязаны сваім жыццём.

Гучаць вершы беларускіх паэтаў, песні гадоў Вялікай Айчыннай вайны і народныя. І пакрысе святлеюць твары прысутных. Праходзяць гады, усё больш аддаляемся мы ад Дня Перамогі, і ўсё менш застаецца сярод нас удзельнікаў незабыўных падзей. Жывыя павінны надалей несці памяць пра іх і жыць так, каб не было сорамна перад імі. «Нас мала, але мы моцныя сваёй дружбай, сваім сяброўствам», — гаворыць Сяргей Савіч Бельчанка.

Франтавая дружба, партызанскае сяброўства... Гэта тое, што часу не падуладна, што вытрымлівае самыя суровыя маральныя крытэрыі. Тут, у каміннай зале, ветэраны па-ранейшаму сябры. У іх шмат агульных інтарэсаў, у іх адна памяць — памяць вайны. І ў У. Залужнага, што з атрадам асобага прызначэння ваяваў у глыбокім нямецкім тыле, і ў Я. Гардзея, былога сакратара Ружанскага падпольнага райкома камсамола...

«Ой, бярозы ды сосны, партызанскія сёстры»... Гэта спяваюць заслужаны артыст БССР І. Краснадубскі і лаўрэат усесаюзных і міжнародных конкурсаў В. Скарабагатаў. Праходзіць хвіліна і мелодыю дарагой кожнаму песні падхопліваюць ветэраны. У калектыўным выкананні гучаць таксама «Зямлянка» і «Кацюша». Усе падпяваюць выканаўцам — спачатку В. Анісенку, потым народнай артыстцы БССР Н. Гайда...

Познім вечарам разышліся з ЦДРМ ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, разышліся, каб заўтра зноў прыйсці сюды, цяпер разам з дзесяткамі масквічоў — рабочымі маскоўскіх прадпрыемстваў, прадстаўнікамі тэатральнай грамадскасці, вядучымі акцёрамі сталічных тэатраў. Вялікая зала Цэнтральнага Дома работнікаў мастацтваў перапоўнена. Позіркі ўсіх скіраваны на сцэну. Паціху, а потым усё ўладней пачынаюць гучаць беларускія цымбалы. Пад іх мелодыю з залы выбягаюць на сцэну хлопчыкі і дзяўчынкі ў маляўнічых касцюмах — удзельнікі Узорнага народнага ансамбля танца «Буравеснік» Палаца культуры Белсаўпрофа. Яны вітаюць гледачоў і дораць народнаму артысту СССР І. Туманаву сувенір — на дошцы выгравіраваны

Народны артыст СССР Р. Янкоўскі, артыстка Н. Чамадурава і кампазітар Э. Ханок на абутковай фабрыцы «Буравеснік».

ТАКАЯ ПОЗНЯЯ ВЯСНА

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 8).

«Вось яна якая,— падумала Аксеня,— і зрабіць, і загадаць можа». Новае пачуццё — павага — з'явілася ў яе да Ліды. «Не, такая не пойдзе за ім вось так, як я,— падумала.— Жанчына павінна мець гонар».

— Ну, будзем здымаць мерку? — Ліда жвавым рухам адторгнула шторку, запрасіла ў прымерачную. Сама села на краёчак трумо, Аксені прапанавала крэсла.— Як будзем шыць? — запытала дзелавіта і крышку стомлена, разгарнуўшы адрэз, павяла рукою па стракатым узоры.

Аксеня толькі зараз зразумела, што не зможа даць адказ на яе пытанне. Яна памаўчала, потым нерашуча прамовіла:

— Як-небудзь, толькі каб не вузка ды каб шыя не адкрытая.

Ліда дастала з шуфлядкі стосік часопісаў мод з размаляванымі жанчынамі ў неверагодных паставах. На момант Аксені здалося, што Ліда насміхаецца з яе, але выгляду не падала, стрымалася, толькі раптам балюча запякло ў грудзях..

Лідзіны пальцы ледзь датыкаліся да Аксеніных плячэй, шыі: Ліда здымала мерку. Аксеня стаяла напружаная, нацягненая, як струна. Здавалася ёй, што Ліда вымярае яе вартасць,— і нічога ўжо не схаваць, нічым не закрыцца ад яе позірку, спакойнага і пільнага. І гэтая працэдура ёй здалася доўгай і стамляючай, як бяссонная ноч.

За тыя хвіліны, пакуль Ліда здымала мерку, Аксеня стамілася болей, чым ад самай цяжкай работы, а гаворкі ўсё не было, той, якой хацела Аксеня. Ліда запісвала ў слупок лічбы, акрэслівала постаць, фасон.

— Вось і ўсё,— сказала яна,— праз тыдзень на прымерку.

І, даючы зразумець, што работа скончана, закінула за шыю сантыметр, згарнула крамніну.

Аксеня зразумела: не хоча яна гаворкі, але, каўтануўшы сліну, ціха сказала:

— Пачакай, пагаварыць я прыйшла... Хведар п'е, рады не магу даць...— таропка, глытаючы словы, быццам баючыся, што Ліда не стане слухаць.— Мабыць, мучыць яго нешта...

Аксеня прысела на краёк трумо, дзе толькі што сядзела Ліда: цяпер Ліда пазірала на яе зверху ўніз. І твар яе быў нерухомы, як застылы, толькі вочы раскрыліся, зрабіліся глыбокія і цёмныя. Аксеня пакорліва чакала, забыўшыся на дзіця, бачыла, як ходзяць ледзь прыкметныя цені ў Лідзіных вачах.

— Я не магу даць рады...— з горыччу паўтарыла яна.

Ліда то згортвала, то разгортвала тканіну, праводзіла па ёй далонню, марудзіла.

— Гэта шыццё мне не да патрэбы цяпер. Параіцца я прыйшла...— голас Аксені быў усхваляваны і пакорлівы.

— Я гэта адчула,— азвалася Ліда.— Толькі наўрад ці добры я табе дарадчык,— з нейкім шкадаваннем сказала яна.

— Разумею. Вінаватая я перад табою. Спачатку яно ўсё, здаецца, проста...— блытана апраўдваючыся, гаварыла Аксеня,— але і ты... Чаму ж не ратавала сям'і? Чаму так лёгка адступілася ад яго?

— Ён па-ранейшаму працуе ў Ладуцькі? — думаючы пра нешта сваё, запытала Ліда.

— А што? — насцярожылася Аксеня.

— Для мяне цяпер гэта ўсё адно. Што было — не вернеш. Гэта немагчыма,— стомлена сказала Ліда.— Ты не глядзі на мяне так, не ніжы позіркам. Я магла не гаварыць з табою. Ён мне ніхто зараз, але дзіцяці майму — яшчэ які-ніякі бацька. І я хачу, каб не сорамна было за яго. Раней пра гэта я не думала... Цяпер скажу табе ўсё. Тады я спужалася. Гэты стары хапуга папікаў яго ўсё, што выгадаваў, ад торбы ўратаваў, а ён — мяккі як вашчына — не мог абараніцца — слухаў яго, рабіў, што той скажа. Фальшывыя нарады Ладуцька на яго выпісваў, а грошы Хведар яму аддаваў. А каб хто калупнуў,— Ладуцька хвастом накрыўся б, а сплочваць яму? Мне! А ў мяне ўсё сваё, бацькамі нажытае, усё пайшло б за Ладуцькаву міласць...

Ліда памаўчала. Лёгкая чырвань асвяціла яе смуглявыя шчокі.

— Цяпер, мусіць, нешта іншае прыдумаў. Што? Разбярыся сама.

Аксеня маўчала, баялася паспешлівым словам сапсаваць гаворку, спалохаць Лідзіну добразычлівасць, што прарвалася нечакана, як крынічка з-пад зямлі. Ліда зразумела Аксенін позірк, яе нямы папрок і дадала:

— Не люблю слабакоў, яны выклікаюць агіду...

«Дык усё ў ім, у Ладуцьку»,— думала з палёгкай Аксеня, ідучы вуліцаю. Шызы прыцемак рэдзенькім дымком павіс перад вачамі. Вечар быў ціхі і ўтульны. Упершыню за апошні час яна была на дзіва спакойная, нібы дрэва ў бязветраны дзень, і гэта сцішанасць душы была такой лёгкай і нечаканай, што яна нават запаволіла хаду. Здавалася, не яна ішла, а сама зямля паціху слалася пад ногі. «Дурная, дурная баба»,— думала пра сябе.

...З кухні выйшаў Ладуцька.

— Во, і гаспадынька прыйшла,— ліслива сказаў ён. І падрабляючыся, так здалося чамусьці Аксені, пад бесклапотнага чалавека, ненатуральна засмяяўся.

«Цвярозыя абодва,— падумала яна, а згледзеўшы бутэльку на кухонным стале, зазначыла: — Пэўна, толькі адкаркавалі, закусь не паспелі паставіць».

Але на стол збіраць не стала, а ўзялася парыць малако для дзіцяці.

Хведар і Ладуцька сядзелі за сталом і маўчалі. Маўчанне іх было нецярплівае і нацягненае, бы толькі што ў іх была палкая спрэчка і зараз не ведаюць, як сябе паводзіць пры Аксені, працягваць высвятляць адносіны ці зрабіць выгляд, што нічога не здарылася. Гэта нецярпенне асабліва было яскравым у Хведара. Ён зыркаў з-пад ілба вачамі на Ладуцьку так, нібы хацеў позіркам дазнац-

Арыю Паўлінкі з аднайменнай аперэты Ю. Семянякі выконвае народная артыстка БССР Н. Гайда.

На вечары «Памяць сэрца».

будынак Дома мастацтваў у Мінску.

Справаздачны вечар Дома работнікаў мастацтваў Беларусі ў Маскве пачынаецца. Ля мікрафона — старшыня прэзідыума праўлення БТА М. Яроменка. Ён расказвае аб той вялікай рабоце, якую праводзіць Беларускае тэатральнае аб'яднанне па прапагандзе тэатральнага мастацтва сярод гасельніцтва, называе важныя мерапрыемствы, што адбыліся ў рэспубліканскім Доме работнікаў мастацтваў, імёны артыстаў, чый талент добра вядомы не толькі беларускаму, але і ўсесаюзнаму гледачу.

— Наш вечар, — гаворыць М. Яроменка, — працяг сапраўднага свята мастацтваў, сведкамі якога вы ўжо сталі.

Сапраўды, сёлетняя справаздача ў Маскве — гэта не толькі сустрэча з работнікамі абутковай фабрыкі «Буравеснік», не толькі тэматычны вечар «Памяць сэрца». І не толькі вялікі канцэрт. Часцінкай свята беларускага тэатральнага мастацтва стала і выстаўка нацыянальных касцюмаў, выкананых па эскізах мастакоў у вытворча-мастацкім камбінаце БТА, якая дэманстравалася тут жа, у ЦДРМ. З экспазіцыяй яе пазнаёміліся амаль усе, хто прыйшоў сюды на канцэрт.

Вядучыя вечара — народная артыстка БССР М. Захарэвіч і В. Анісенка — аб'яўляюць першы нумар. Дружнымі апладысментамі сустракае зала з'яўленне на сцэне народнай артысткі СССР Г. Макаравай, народнага артыста БССР Г. Аўсянікава і заслужаных артыстаў рэспублікі У. Кудрэвіча і П. Дубашынскага, якія паказваюць сцэну са спектакля па п'есе А. Макаёнка «Трыбунал». Твор гэты атрымаў сваё сцэнічнае ўвасабленне на многіх пляцоўках краіны, і ўсё ж у выкананні купалаўцаў мае сваё спецыфічнае гучанне, найбольш блізкае да пісьменніцкай задумы, напоўненае нацыянальным каларытам.

Быў паказаны ўрывак яшчэ з аднаго спектакля. На гэты раз з «Макбета» В. Шэкспіра. Галоўныя ролі выканалі народны артыст СССР Р. Янкоўскі і Н. Чамадурава. Сталічны глядач цёпла сустракае і гэтую работу акцёраў.

Дружныя воплескі гучаць і тады, калі М. Захарэвіч чытае добра вядомы верш народнага паэта Беларусі П. Панчанкі «Край паэтаў», калі І. Краснадубскі выконвае песню І. Лучанка на словы народнага песняра Якуба Коласа «Мой родны кут», а ансамбль «Кантабіле» знаёміць слухачоў з творамі беларускіх кампазітараў XVI—XVII стагоддзяў—гучыць «Полацкі сшытак».

У гады пасляваеннага маленства, вяртаецца лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола, паэт У. Някляеў, які чытае ў перакладзе на рускую мову Л. Гембіцкай свой верш «Кажух» — праўдзівае, шчырае слова пра дзяцінства, што праходзіла ў цяжкіх умовах нішчымніцы і чалавечага гора.

У праграме вечара — адажыо з балета А. Пятрова «Стварэнне свету» ў выкананні народных артыстаў БССР Л. Бржазоўскай і Ю. Траяна, песні ў выкананні Л. Колас, В. Скарабагатава, С. Кульпы. Урыўкі з аперэт спявае Н. Гайда, верш А. Блока «У дзюнах» чытае В. Сабераў... А лаўрэаты ўсесаюзных і міжнародных конкурсаў Н. і М. Біруны знаёмяць прысутных з тэмпераментнымі «Рытмамі XX веку».

Шмат паклонніка таленту і ў брэсцкага кампазітара Э. Ханка. А што яго творчасць аднолькава блізка і зразумела людзям усіх узростаў і прафесій, няцяжка было пераканацца, калі Э. Ханок пачаў спяваць найбольш папулярныя свае песні.

З гэткім жа задавальненнем зала ў другі раз вітала ўдзельнікаў ансамбля «Равеснік». Юныя танцоры зноў апраўдалі самыя лепшыя спадзяванні. Беларускі народны танец «Антон маладзенькі», які яны выканалі, выклікаў усеагульнае захапленне.

Канцэрт яшчэ раз засведчыў, што ў Маскве любяць і цэняць беларускае мастацтва, ведаюць яго лепшых прадстаўнікоў. Аб гэтай даўняй дружбе работнікаў беларускага мастацтва са сталічным гледачом гаварыла і народная артыстка РСФСР, намеснік старшыні праўлення ЦДРМ Н. Казанцава, калі дзякавала артыстам за змястоўны канцэрт.

Народная артыстка БССР М. Захарэвіч чытае верш П. Панчанкі «Край паэтаў».

Фота Ул. КРУКА.

Два дні, праведзеныя беларускімі артыстамі ў Маскве, сталі справаздачай, што перарасла ў сапраўдны творчы экзамен. Экзамен на прафесійнае майстэрства. На цікавую і змястоўную праграму. На ўменне знайсці кантакт са сталічным гледачом. Экзамен гэты паспяхова здадзены.

Уладзімір КРУК,

Алесь МАРЦІНОВІЧ,
спецыяльныя карэспандэнты «ЛіМа».

ФЕСТЫВАЛЬ— УПЕРШЫНЮ

27 мая ў Мінску адкрыўся І Рэспубліканскі фестываль, у якім удзельнічаюць тэатры лялек і Рэспубліканскі тэатр юнага гледача імя 50-годдзя камсамола Беларусі. Праводзяць яго Міністэрства культуры і Міністэрства асветы БССР, Дзяржаўны камітэт БССР па прафтэхадукацыі, ЦК ЛКСМБ, БТА. Мэта фестывалю — садзейнічаць павышэнню ролі тэатра ў ідэйна-эстэтычным і маральным выхаванні маладога пакалення, шырокаму далучэнню дзяцей да тэатральнага мастацтва, стварэнню разнастайных па тэматыцы і жанрах сцэнічных твораў.

У дзень адкрыцця былі паказаны два спектаклі Брэсцкага абласнога тэатра лялек: «Крок у бессмяротнасць» (п'еса Н. Мацяш) і казка Л. Усцінава і А. Табакова «Беласнежка і сем гномаў». Гродзенскі абласны тэатр лялек, арганізаваны летась, прывёз сваю першую работу — «Людвіг і Тута» паводле п'есы В. Богача і С. Хрыстоўскага. З прэм'ерай «Андрэй за ўсіх мудрэй» паводле Э. Брука і А. Гурчанкова пазнаёмілі нас лялечнікі з Магілёва, а гамяльчане прапанавалі «Казку пра цара Салтана» А. Пушкіна і пастаноўку «Чалавек з хвастом» (аўтар — Г. Остэр). На фестывальнай афішы Дзяржаўнага тэатра лялек БССР—«Гадзіннік з зязюляй» С. Пракоф'евай і спектакль для дарослых «Зорка і смерць Хаакіна Мур'еты» паводле драматычнай кантаты П. Нэруды. Тэатр юнага гледача ўключыў у гэты паказ інсцэніроўку рамана М. Астроўскага «Як гартавалася сталь», казку «Бэмбі» паводле Ф. Залтана і пантаміму «Кліч».

У рэспубліканскім Доме работнікаў мастацтваў разгорнута экспазіцыя лялек, эскізаў дэкарацый, касцюмаў, макетаў сцэнічнага афармлення спектакляў, пастаўленых у тэатрах — удзельніках фестывалю.

Фестываль завершыцца канферэнцыяй па праблемах павышэння ідэйна-мастацкага ўзроўню твораў для дзяцей і юнацтва. Журы вызначыць пераможцаў, якія будуць прадстаўляць беларускае тэатральнае мастацтва на заключным паказе лепшых спектакляў для дзяцей — сёлета ў снежні, у Маскве. Мяркуецца ўдзел беларускіх лялечнікаў у тэатральным свяце ў «Артэку» і ва ўсерасійскім піянерскім лагеры «Арлянё» летам будучага года.

Правядзенне такога фестывалю можа стаць новай добрай тэатральнай традыцыяй у нашай рэспубліцы.

Я. КЛІМАКОЎ.

ца ў яго аб нечым або разгледзець нешта ўнутры гэтага чалавека.

— Дык што ж вы паставілі пляшку і моліцеся на яе?—сказала Аксеня больш дзеля таго, каб парушыць гэтае штучнае маўчанне хоць якой гаворкай. Яна і не збіралася падахвочваць іх, але тым жа часам і жадала, каб хутчэй канчалася гэтае частаванне.

— Ды во — ён,— кіўнуў Ладуцька на Хведара,— нават шклянкі не падасць на стол ды хлеба скібку з цыбулінай.

Хведар моўчкі ўстаў, паставіў на стол шклянку, паклаў кавалак хлеба, цыбуліну ў рудой шкарлупіне. З пакоя даўно падавала голас малое, а зараз яно захліпалася ад плачу. Аксеня таропка студзіла ў пляшачцы малако — абдавала яе халоднаю вадою, потым заціскала ў далонях, правярала, ці не гарачае. Хведар глядзеў на яе так, нібы нерваваўся, што яна робіць гэта так марудна. Не вытрываў і пайшоў да дзіцяці.

— Нешта вы, дзядзька, не ў гуморы сёння,— сказала Аксеня, каб хоць як яго зачапіць на гаворку.

Ладуцька зноў засмяяўся ненатуральна весела, потым пасур'ёзнеў, кіўнуў у бок пакоя, даючы тым зразумець, што мае на ўвазе Хведара.

— Бачыш, Аксенька,— ён быў з ёй ветлівы і мяккі,— аб ім стараешся, а ён яшчэ губы капыліць, як дзеўка.

— А вы, дзядзька, не старайцеся, ён ужо сам сабе галава,— сказала ў тон яму Аксеня.

— Як жа, я яго выгадаваў, можна сказаць, пасля вайны смаркачом яшчэ, сіратою застаўся, як-ніяк, а на ногі паставіў, спецыяльнасці вывучыў...

— Не прапаў бы ён, дзядзька, без вашае ласкі. У дзіцячы дом бы ўзялі. Неяк жа людскія сіроты пагадаваліся.

Ладуцька выслухаў спакойна, з адценнем здзіўлення ў вачах. Пярэчыць, аднак, не стаў. Пашарыўшы ва ўнутранай кішэні пінжака, дастаў складзеныя пяцёркі, добры пук, працягнуў Аксені.

— Вазьмі ты гэтыя грошы ды скажы яму, хай не корчыць разумніка: грошы самі ў рукі ідуць... Хай зробіць, што прашу.

Аксеня кінула імгненны позірк на Хведара, які стаяў у праёме дзвярэй, і цвёрда сказала:

— Тыя грошы, дзядзька, што самі ідуць, не для нас. Мы будзем свае зарабляць сумленна!

Цяпер яна зразумела, што Хведар не проста нерваваўся, ён ішоў супраць сябе, яму трэба дапамога. Ён сапраўды чалавек мяккі, сам не абароніцца.

Ладуцька, мусіць, не чакаў такога павароту. На нейкі момант ён разгубіўся.

— Зарабляць, зарабляць...— незадаволена перадражніў ён, узлаваўшыся.— А гэтыя я што — украў? У адной сукенцы ходзіш, лядашчая, а гонару — ого!

Ладуцька ўгнявіўся. Ён надзьмуў губы і сядзеў, задумліва разглядаючы штосьці праз шкло бутэлькі.

— Пайшлі вы к ліхай матары! — вылаяўся ён, заключыўшы нейкія свае думкі. Наліў сабе гарэлкі, ужо не крышку, а амаль поўную шклянку, выпіў.

— Я пагляджу,— сказаў ён, хакаючы і выціраючы далонямі бараду,— як вы на свае заробленыя пражывяцё.

Ён падняўся, бы хацеў пайсці, але марудзіў: мусіць, чакаў, што яшчэ скажа Хведар. Аксені гэта было таксама неабыякава.

Ладуцька, убачыўшы Хведара, палагоднеў, ляпнуўшы па-свойску яго па плячы, сказаў:

— Сядай, пагаворым.

Хведар паглядзеў на яго, потым на Аксеню, сустрэў яе востры і смелы позірк.

— Усё гэта гаворана-перагаворана. Не буду я, дзядзька Іван, даволі... Цяжка, боязна жыць так...

— Гэта яна так убрала цябе ў рукі?— Ладуцька скасіў вочы ў бок Аксені.

Раптам бы цень прабег па твары Аксені, прапалі яе ваяўнічасць і пыл. Яна села каля стала, падпёршы шчаку рукою.

— Аднаго я не разумею, дзядзька, як гэта грошы вам у рукі самі ідуць?

Аксеня не прыкідвалася. Ёй хацелася разабрацца, бо цяпер ясна разумела, што Хведар трапіў у нейкія цянёты, а выблытацца нестае ў яго сілы.

Ладуцька нешта цьмяна гарадзіў ёй пра лішнія лесаматэрыялы, якія апрыходвалі спачатку адзін раз, потым другі. Даводзіў, што гэта не махлярства, дакументы ўсе ў парадку. Гаварыў пра нейкую недабудаваную лазню, якая па дакументах даўно здадзена, пра белую і блакітную кафлю, якую можна спісаць як бой, толькі...

Аксеня слухала разгублена, амаль нічога не магла ўцяміць, і не старалася вельмі. Разумела адно: усё гэта заблытана і мярзотна. Справядлівая злосць падступала да сэрца, нянавісць, нейкая нават агіда да гэтага чалавека.

Яна пераводзіла позірк на Хведара. Ён нерваваўся, але маўчаў.

— Вось што, дзядзька, справа гэта заблытаная, мне тут не разабрацца. Але нічога, разбярэцца пракурор,— сказала яна, як аб канчаткова вырашаным.

Ладуцька выкаціў вочы:

— Ты што, звар'яцела? Дак і ён жа...— паказаў пальцам на Хведара.

— І ён,— спакойна і сур'ёзна дадала яна і пайшла ў пакой. Яна чула, як лаяліся, спрачаліся мужчыны, як адыходзіў дадому Ладуцька.

Аксеня зацялася. Было імгненне, калі яна здалася сабе высахлым ручаём. Там, дзе вірылі пачуцці,—нязвыкла ціха і пуста, толькі балюча помсціць сэрцу розум. Адбылося неверагоднае: тое, чым яна даражыла і што так хацела ўтрымаць, раптам згубіла сэнс. Засталося адно вельмі зямное жаданне — легчы, выпрастацца, закрыць вочы: выспацца.

— Спіш? — ціха запытаў Хведар, дакрануўшыся да яе пляча. — Ты ж не вячэрала.

Аксеня не азвалася. Ён, не запальваючы святла, моўчкі гладзіў яе валасы, рукі. Гэта была маўклівая размова. Ён выказваў ёй тое, на што не траплялася слоў. І Аксеня адчула, што разумее яго, у яе пацяплела ў грудзях, і слёзы, пякучыя, як воцат, скаціліся па скронях.

— Ты плачаш? — нібы не паверыў Хведар, як малой выціраючы ёй слёзы.— Перастань, не трэба. Даруй мне за ўсё,— ён прытуліўся шчакою да яе шчакі.

У Аксені нібы нешта адтала ў грудзях. І слёзы палёгкі хлынулі веснавым патокам, і зноў яна была гатовая да ўсяго: да новых трывог і змагання, да новай пяшчоты.

МАСТАК І ЖЫЦЦЁ

Пошук заўсёды індывідуальны

Сярод відаў пластычнага мастацтва Беларусі габелен самы малады. Як ні дзіўна, але ён адрадзіўся фактычна ў 60-х гадах нашага стагоддзя і толькі назвай нагадвае старадаўнія габелены, шпалеры, выкананыя ў традыцыйнай класічнай тэхніцы. Для сучаснага габелена характэрна актыўнасць тэкстылю і самыя розныя тэхнікі ткацтва. Гэта і надае яму самабытнасць.

Беларускі габелен развіваецца ў агульнай плыні савецкага дэкаратыўнага мастацтва. Прыемна адзначыць, што за дзесяць апошніх гадоў у нас вырасла значная група мастакоў-габеленшчыкаў—цікавых майстроў, творчасць якіх вызначае пошук новых сродкаў і прыёмаў мастацкай выразнасці. Пошук — у кірунку вывучэння розных стыляў агульнаеўрапейскага габелена і, адначасова, багатай спадчыны беларускага ўзорыстага ткацтва.

Асноўная тэхніка, у якой працуюць нашы габеленшчыкі, — гладкатканая. Аб'ёмна-фактурнай тэхнікай, якая распаўсюдзілася ў 70-х гадах разам з «натурстылем» у мастацтве габелена, карыстаюцца толькі асобныя мастакі.

У адрозненне ад іншых рэспублік у нас хутка развіваецца і паступова набывае сабе прыхільнікаў габелен манументальны. Першай значнай працай у гэтым напрамку стаў габелен А. Кішчанкі, Г. Гаркунова, А. Бельцюковай «Чалавек, які пазнае свет» (1972 г.) для вестыбюля мінскай гасцініцы «Турыст», які гарманічна ўвайшоў у ансамбль з архітэктурай будынка, стварыў асаблівае прыцягальнае прастораве асяроддзе. І, што вельмі важна, адкрыў неабмежаваныя мажлівасці габелена ў мастацкім афармленні інтэр'ера.

У наступных працах: «Песня беларускіх партызан» (1973), «Музыка» (1975) для Мінскага музычнага вучылішча імя Глінкі, «Мінск—горад-герой» (1978) — А. Кішчанка і А. Бельцюкова сцвярджаюць знойдзеную сімволіку, паэтычнасць асацыятыўных форм, дасканалы рытмічны строй, які арганічна аб'ядноўвае габелены з інтэр'ерам.

Высокаграмадзянскую тэматыку ў габелене распрацоўвае вядучы мастак рэспублікі М. Савіцкі, стварыўшы ў 1977 годзе — сумесна з А. Кішчанкам — два эпічныя манументальныя габелены «Ленінізм у дзеянні» і «СССР — этапы вялікага шляху». Грамадзянска-рэвалюцыйная сімволіка, выкарыстанне багатых стылявых і кампазіцыйных сродкаў дапамаглі аўтарам глыбока выявіць тэматыку рэвалюцыйнай барацьбы, пераможнага шэсця ідэй ленінізму, паспяховай пабудовы камуністычнага грамадства. Гэтыя працы пераканаўча пацвердзілі, як важна ўводзіць у грамадскі інтэр'ер манументальны габелен, як цікава, на самым высокім узроўні можна вырашыць самую складаную тэму ў гэтым жанры.

Грамадзянска - патрыятычную тэматыку вырашаюць у габелене «Белая Русь ты мая» (Палац культуры калгаса імя Варанецкага Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці) А. Салохіна і А. Шаблоўская. Аўтары смела ўводзяць у кампазіцыю надпісы, якія дапаўняюць змест — радкі з песні аб Радзіме спрыяюць раскрыццю вобразаў, узбагачаюць графічны строй габелена. Як балада аб мужнасці гучыць габелен Т. Хацановіч «Жанчыны ваенных гадоў» (1976). Мастачка свядома адмаўляецца ад непатрэбных выпадковых дэталей, кантрастнасцю колераў дамагаецца максімальнай выразнасці і цэласнасці свайго твора. І паўстаюць на габелене, быццам асветленыя водбліскамі ваенных пажарышчаў, нязломныя жанчыны, што са зброяй у руках баранілі жыццё дзяцей сваіх...

Манументальны беларускі габелен пачынае набываць свае стылістычныя асаблівасці, што вызначаецца, перш за ўсё, падыходам мастакоў да самой трактоўкі вобразаў, строгім адборам дэталей, дзе кожны элемент успрымаецца як арыгінальна знойдзены сімвал.

Разнастайнасць і шматзначнасць сімволікі пашыраецца і ўзбагачаецца. Ужо гаварылася аб выкарыстанні надпісаў. Традыцыйнымі становяцца прамавугольны фармат габеленаў і сама класічная тэхніка гладкага ткацтва. Звычайна манументальныя габелены па кардоне мастака выконваюць майстры-ткачыхі на Барысаўскім камбінаце прыкладнога мастацтва. У такіх габеленах тэхніка цалкам падпарадкавана выяўленню дакладна распрацаваных форм малюнка і не мае вядучай ролі ў стварэнні мастацкага вобраза. Тады адчуванне матэрыялу адыходзіць на другі план і часам крыху губляецца. Іншыя мастакі ткуць свае творы самі, і тады мы з'яўляемся сведкамі самых разнастайных тэхнічных эксперыментаў. Ёсць у гэтым кірунку здабыткі. І немалыя. Для такіх твораў характэрна падкрэслена яркая тэкстыльная прырода твора, актывізацыя колеравай гамы і структуры.

Смелым эксперыментатарам у сваёй творчасці выступае Л. Скрыпнічэнка. Яна выкарыстоўвае тэхніку аплікацыі і змешана-золатнага шыцця, ткацтва і рэльефнага пляцення. У яе творчым багажы шмат цікавых твораў, такіх, як «Каваль-асілак», «Лён», «Паляна», «Саната». З кожнай працай Л. Скрыпнічэнка ўдасканальвае свой стыль, актывізуе фактуру і рэльефнасць перапляценняў (габелены «Дружба», «Рэчанька»).

Ужо з першых крокаў беларускага габелена ў ім пазначыўся зварот да народнага мастацтва. Шмат мастакоў разглядаюць яго багатую спадчыну як апору і фундамент для творчых пошукаў і здзяйсненняў. Іх працам уласціва спалучэнне жывапіснага і музычнага пачаткаў, цікавая інтэрпрэтацыя беларускага фальклору, што надае творам непаўторны нацыянальны каларыт.

Гэта тэндэнцыя відавочна ў габеленах: «Ой, рана на Йвана» Л. Фёдаравай і Л. Гаўрыленка, «Актава» Г. Крываблоцкай, «Адчуванне» В. Бартлавай, «Гімн прыродзе» Л. Пятруль. У характары цудоўнай народнай лірычнасці вырашае Л. Пятруль і два габелены, прысвечаныя юбілею беларускай паэтэсы Цёткі (А. Пашкевіч). Дасканаласцю кампазіцыі вызначаюцца працы В. Дзёмкінай. У габелене «Званы» мастачка стварае яркія шматзначныя вобразы, матэрыялізуе бясконцы паток музычных пачуццяў, якія спалучаюць мінулае з велічнымі, напружанымі рытмамі сучаснасці. Гэты твор сведчыць аб добрым прафесійным узроўні мастачкі, аб яе грамадзянскай пазіцыі.

Багата працуюць мастакі-тэкстыльшчыкі над сюжэтна-дэкаратыўнымі кампазіцыямі. Прыцягваюць да сябе ўвагу каларыстычнымі знаходкамі і выдатным валоданнем стылізацыі формы працы Л. Сіваковай «Марш Перамогі» і «Святочныя агні», непаўторнай лёгкасцю, блізкасцю да роднай прыроды габелены «Поры года», «Песня жаўранка» А. Юзеевай-Шаблоўскай, «Вечна жывым прысвячаецца» А. Філімонава і С. Нартавай, «Юнацтва» С. Свістуновіча. Шырокае выкарыстанне раслінных і заморфных матываў, якія дапамагаюць знайсці арыгінальныя дэкаратыўныя вырашэнні, імкненне да арганічнай арганізацыі формы прывяло да стварэння габеленаў у «натурстылі». Рухомая, багатая структура такіх габеленаў напаўняецца сапраўдным адчуваннем арганічнасці паверхні — так удала мастакі ў ткацтве імітуюць розныя натуральныя матэрыялы («Асенні нацюрморт» В. Крывашэевай і «Букет міру» Л. Скрыпнічэнка). Тэматыка дэкаратыўных твораў перастала быць вузка традыцыйнай. Сюжэты кампазіцый адлюстроўваюць самыя разнастайныя жыццёвыя ўражанні, прыродныя з'явы («Святочная ноч» Н. Пілюзіна, «Раніца» Г. Стасевіч, «Летняя ноч» Г. Белавусава, «Палеская раніца» В. Крывашэева).

Відавочна мадэрнізавалася і тэхналогія ткацтва. Часам пластычны эфект дасягаецца ворсавымі перапляценнямі, як у габеленах Н. Пілюзінай «Перад зорнай дарогай» і «Навука аб зорках».

Побач з вялікімі манументальнымі габеленамі на выстаўках апошніх гадоў сустракаюцца і зусім мініяцюрныя «мініг абелены», габелены камерныя, прызначаныя для жылога інтэр'ера. Характэрна і змешаная тэхніка — макрама, вязанне, пляценне; узбагацілася таксама сыравіна, матэрыял, які выкарыстоўваецца ў стварэнні габелена — поруч з воўнай, ільном мастакі выкарыстоўваюць розныя сінтэтычныя матэрыялы.

Пошук новых прыёмаў, новых тэхнік, натуральна, вядзе да вобразна-пластычнай разнастайнасці прац, своеасаблівасці індывідуальных стыляў, арыгінальнай вобразнай структуры твораў беларускага тэкстылю, і гэта не выпадкова. Мастакі, якія працуюць у жанры габелена,—у асноўным выпускнікі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, дзе яны атрымалі спецыяльную падрыхтоўку на кафедры тэкстылю і мадэліравання. Шкада, што гэта кафедра ў 1976 годзе была закрыта — на сённяшні дзень мы мелі б яшчэ большы атрад моладзі, якая працавала б у новым, вельмі цікавым відзе мастацтва. Але тое, што ўжо створана, дае ўсе падставы гаварыць аб прыкметных мастацкіх здабытках.

Беларускі габелен яшчэ малады. Жыццё яго фактычна толькі пачынаецца, але яно абяцае быць яркім і плённым.

Яўген ШУНЕЙКА.

КІНО

«ТРЫ ТЫСЯЧЫ ПЕСЕНЬ»

Пад такой назвай Беларускае тэлебачанне выпусціла на экраны дакументальны фільм пра народнага артыста СССР Г. І. Цітовіча.

Цяжка пераацаніць ролю гэтага чалавека ў развіцці этнаграфіі, фалькларыстыкі, прафесійнага і самадзейнага музычнага мастацтва рэспублікі. За гады сваёй збіральніцкай дзейнасці Генадзь Іванавіч запісаў каля чатырох тысяч узораў народнай творчасці. Ён аб'ездзіў або абышоў дзеля гэтага амаль усю Беларусь. І зусім заканамерна, што аўтары фільма паказалі ў першых жа кадрах пачатак аднаго з такіх падарожжаў. Атрымаўся дакументальны і абагульнены кадр-пралог.

Далей, з сапраўды кінематаграфічнай хуткасцю, узнікае мазаіка сцэн і эпізодаў. Героя фільма можна ўбачыць на рэпетыцыі народнага хору і на вясковым свяце, у сялянскай хаце і ў час творчай гутаркі з самадзейным кампазітарам П. Шыдлоўскім, на праглядзе праграмы фальклорнага ансамбля на Гомельшчыне і з хорам вёскі Вялікае Падлессе... Такая змена кадраў не выклікае адчування стракатасці, бо дыктарскі тэкст удала звязвае гэтую мазаіку кадраў аб няўрымслівым жыцці Г. Цітовіча.

Ёсць у фільме нямала цікавых знаходак. З вялікай увагай, напрыклад, слухаеш расказ Генадзя Іванавіча аб паходжанні падгалосачнага спявання на Беларусі і пра нараджэнне шматгалосся.

Да месца тут гучаць словы дыктарскага каментарыя: «Жыццё пражыў, як песню спеў», «Песню скласці — не лапці сплесці»...

Прыемнай нечаканасцю былі на экране кадры яшчэ даваенных здымкаў народнага хору вёскі Вялікае Падлессе, якія аўтары адшукалі ў кінаархівах. Арганічна ўвайшлі ў стужку кадры, знятыя ля Вільнюскай кансерваторыі і універсітэта, дзе Генадзь Іванавіч у свой час вучыўся, і яго сустрэча з даўнім сябрам — літоўскім вучоным і музыкантам У. Бартасявічусам.

Добрае ўражанне робіць музычнае афармленне, якое вынікае з самой назвы фільма. Не зважаючы на тое, што амаль увесь ён суправаджаецца песнямі, яны не надакучваюць, бо падабраны па кантрасту і добра адцяняюць настрой, што пануе на экране. Цікавая знаходка — кадр, дзе вясенняя кроплі з ледзяшоў агучаны музыкай для цымбал. Музычным жа лейтматывам стала народная песня «Жаваронкі, прыляціце», якая гучыць напачатку, у некалькіх наступных эпізодах і заканчвае фільм.

Не магу не сказаць і пра асобныя недакладнасці фільма. Нашы тэлегледачы Г. І. Цітовіча добра ведаюць не толькі па выступленнях па тэлебачанні і радыё, па сустрэчах з ім у час яго нястомных падарожжаў па рэспубліцы і па кансультацыях шматлікіх калектываў мастацкай самадзейнасці. Вядомы ён, у першую чаргу, як арганізатар і мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага народнага хору БССР. А хору гэтага ў фільме якраз і няма! Адзінае, што прапанавалі аўтары стужкі тэлегледачам,—статычны фотаздымак калектыву. Я перакананы, што пры адсутнасці ў архівах адпаведнага кінаматэрыялу трэба было абавязкова прыцягнуць да здымкаў сам калектыў. Дарэчы, з-за яго адсутнасці падаўся штучным і эпізод «рэпетыцыі», калі Г. І. Цітовіч, седзячы ў зале, пад фанаграму, робіць выгляд, быццам дырыжыруе хорам.

Генадзь Іванавіч з'яўляецца аўтарам музыкі многіх арыгінальных песень і апрацовак беларускай народнай музыкі, што ўвайшлі ў рэпертуар Дзяржаўнага народнага хору БССР. Пра гэтую важную галіну яго творчай дзейнасці наогул не сказана нічога. Нават у «лейтматыўнай» песні «Жаваронкі, прыляціце» не названа імя аўтара апрацоўкі. І чаму гэта смаляць свінню на фоне цудоўнай лірычнай народнай песні «Салавейка»? На жаль, сцэнарыст Г. Колас, рэжысёр У. Арлоў не змаглі вытрымаць сапраўды мастацкую плынь у адборы выяўленча-пластычных кадраў. Падобныя «маляўнічыя» ўстаўкі выглядаюць данінай «экзатычнай» аздобе.

Тэлеаператар Л. Броўтман зрабіў цікавыя здымкі хатніх абставін жыцця і працы Генадзя Іванавіча. Толькі вось мы не бачым побач з героем фільма яго спадарожніцы, якая спрыяе поспеху яго бясконцых фальклорных экспедыцый, — жонкі Вольгі Мацвееўны. Гэта магло б надаць фільму больш цеплыні і натуральнасці. Дарэчы, Генадзь Іванавіч не «пачотны калгаснік», як гаворыцца ў дыктарскім тэксце, а першым сярод кампазітараў Савецкага Саюза атрымаў ганаровае званне заслужанага калгасніка калгаса імя У. І. Леніна.

Увогуле ж фільм глядзіцца і слухаецца з цікавасцю. Ён дае ўяўленне аб жыцці, збіральніцкай дзейнасці, творчых пошуках і няўрымслівасці буйнога вучонага-этнографа, музыказнаўца, кампазітара і цудоўнага чалавека, імя якога карыстаецца папулярнасцю і любоўю на Беларусі. Мабыць, такія стужкі варта не толькі захоўваць, але і ўдасканальваць іх пасля прэм'ер. Інакш усе заўвагі — дарэмныя.

Д. ЖУРАЎЛЁЎ,
заслужаны дзеяч культуры БССР.

З НАРОДНЫХ КРЫНІЦ

Захаваць традыцыі

СЕННЯ У НАШАЙ РЭСПУБЛІЦЫ працуе больш за 20 прадпрыемстваў мастацкай прамысловасці, асноўная прадукцыя якіх — вырабы народных промыслаў. Многія з іх захоўваюць традыцыі народнага мастацтва, развіваюць іх, даюць ім новае жыццё. Можна ганарыцца сучасным беларускім узорным ручным ткацтвам, сувенірамі з саломкі і льновалакна, унікальнымі па мастацкім вырашэнні і выкарыстанні матэрыялу, мастацкай інкрустацыяй саломкай.

Аднак у сістэме мастацкіх промыслаў не ўсе віды народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва развіваюцца раўнамерна. Дасведчанага пакупніка не могуць задаволіць, напрыклад, вырабы з дрэва з роспісам. Куфэрачкі, шкатулкі, дэкаратыўныя пано і талеркі, якія выпускаюць брэсцкая, жлобінская, слонімская, пінская, фабрыкі, — гэта стракатая мешаніна розных стыляў, арнаментальных вырашэнняў і каларыстычных прыёмаў, большасць якіх не мае нічога агульнага з традыцыямі беларускага роспісу.

У Беларусі захавалася нямнога ўзораў народнага роспісу. Войны, пажары, разбурэнні знішчылі многія творы. У музейных калекцыях прадстаўлены адзінкавыя ўзоры. Але доказам таго, што гэта традыцыя на беларускай зямлі існавала здаўна, з'яўляецца той факт, што ў пасляваенныя гады ў Беларусі з'явіліся такія цэнтры роспісу, як Огава Іванаўскага раёна і Крэмна Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці, дзе амаль усё насельніцтва займалася роспісам. У цяжкія пасляваенныя гады на кірмашах можна было ўбачыць расквечаныя куфры, апаясаныя не каваным жалезам, як даўней, а хвалістымі лініямі фляндроўкі. Сінія, блакітныя, зялёныя, з букетамі і кветкамі ўроскід па полі, гэтыя, дабротна збітыя, пастаўленыя на колцы куфры вабілі вока чалавека. Прыязджалі людзі ў Драгічын, Іванава, Пінск, Хомск, Бярозу купіць куфар, што замяняў у доме мэблю. Але часцей за ўсё купляліся куфры для нявест. Складвалі туды па даўняй народнай традыцыі пасаг. Да гэтага часу ў куфрах захоўваюцца выдатныя ўзоры народнага адзення, ткацтва, вышыўкі.

У вёсцы Огава амаль кожная сям'я рабіла куфры. Мужчыны выконвалі сталярную работу, жанчыны распісвалі. Клаліся на сундукі кветкі—незвычайныя, яркія, якія быццам прыйшлі з навакольных лугоў і палёў. Такія ж кветкі вышывалі жанчыны на ручніках, хустках, кашулях, фартухах. Менавіта ў пасляваенныя гады ўзмацнілася ў народным мастацтве цяга да шматколернасці, яркасці, кветкавага і расліннага арнаменту. Роспіс куфраў, які перажываў свой росквіт у той час, развіваўся ў рэчышчы традыцый народнай культуры.

Куфравы промысел у Огаве развіваўся па законах, характэрных усім цэнтрам народных мастацкіх промыслаў. У калектыўнай творчасці шліфаваліся кампазіцыйныя прыёмы, малюнак, тэхналогія роспісу. Рыначны попыт рэгуляваў вытворчасць. У нядзельныя дні вёска вывозіла на кірмаш да 30 — 40 куфраў. Густ пакупніка адбіраў з гэтай масы самыя прыгожыя і ўдалыя па малюнку. Так склаўся непаўторны тып огаўскага куфра. Такіх па форме і роспісе куфраў не сустрэнеш ні ў Расіі, ні на Украіне, ні ў Польшчы, дзе таксама вырабляліся і распісваліся куфры.

У огаўскім куфры вечка і пярэдняя сценка разлінеены фляндроўкай на тры прамавугольнікі. У кожным з іх — выявы букетаў з трох буйных кветак, паміж якімі свабодна размешчаны дробныя кветачкі і «вінаградзікі»—галінкі з ягадамі і лістамі. «Карэньчыкі»—сцяблінкі кветак — унізе абведзены колцамі, як бы звязаны. Характэрную асаблівасць мае малюнак і колеравае вырашэнне вялікай огаўскай кветкі. У ім спалучана выява кветкі зверху і збоку, што падкрэслена расфарбоўкай у два кантрастныя колеры.

Огаўскі роспіс вылучаецца не толькі асаблівымі стылістычнымі рысамі, але і своеасаблівай тэхналогіяй. Малюнак для нанясення роспісу рабіўся адначасова з нанясеннем фляндроўкі. Майстры не карысталіся свабоднымі прыёмамі пэндзля, яны стваралі форму кветкі не мазком або бялільнымі ажыўкамі, а запаўнялі абведзеныя плоскасці плямамі колеру. Як матэрыял для роспісу выкарыстоўвалася масляная фарба, у якую для атрымання патрэбнага колеру падмешвалі анілінавую і друкарскую.

Масавая вытворчасць куфраў у Огаве спынілася ў сярэдзіне 60-х гадоў. Усё ж промысел не знік. Тры гады назад Брэсцкай фабрыкай сувеніраў быў арганізаваны ў вёсцы ўчастак роспісу сувенірных куфэрачкаў. На першы погляд усё добра. Захоўваецца адзін з рэдкіх відаў беларускага народнага мастацтва, традыцыі промыслу. Але дарэмна будзем мы шукаць на прылаўках магазінаў куфэрачкі, якія нагадалі б нам огаўскія куфры. Прадаўцы змогуць прапанаваць толькі спрошчаныя па форме і роспісе, цьмяныя па колеру вырабы, пазбаўленыя рукатворнасці і непаўторнай прыгажосці народнага роспісу.

Так, цэх роспісу ў Огаве існуе. 16 распісчыц, якія прайшлі навучанне на фабрыцы ў Брэсце, распісваюць сотні аднолькавых куфэрачкаў нітрафарбамі з прымяненнем трафарэтаў. Нескладанасць кампазіцыі і малюнка дазваляе распісваць за змену шэсць-сем вырабаў. Фарба хутка сохне. Гэта выгадна для вытворчасці. Ахвотна ідзе працаваць на ўчастак моладзь, а вось прызнаныя майстры з сем'яў Даўгераў, Румко, творы якіх упрыгожваюць музеі і выстаўкі, не хочуць супрацоўнічаць з брэсцкай фабрыкай. Адна з асноўных прычын — нежаданне перастройвацца на новую тэхналогію работы нітрафарбамі, якая вымушае адмаўляцца ад характэрных прыёмаў рамяства, якія сцвердзіліся, перш за ўсё ад фляндроўкі і шматслойнасці роспісу. Некалькі гадоў назад Т. Даўгер распісала для фабрыкі сувенірныя куфэрачкі алеем. У вытворчасць гэтыя ўзоры не пайшлі, так і засталіся экспанатамі ў асартыментным кабінеце прадпрыемства. А майстрыха, рукі якой захоўваюць усе сакрэты огаўскага роспісу, працуе надомніцай па інкрустацыі саломкай.

Т. Доўгер. Куфэрак.

Яшчэ робяць майстры Огава традыцыйныя куфры па заказах музеяў, дамоў народнай творчасці. Іншы раз — па просьбах заказчыкаў з суседніх вёсак і сёлаў. Перажыўшы свой росквіт, куфэркавы промысел не заглух, але і новага ўздыму, як гэтага трэба было чакаць са стварэннем участка роспісу, не адбылося. Не склалася творчая садружнасць прадпрыемства з народнымі майстрамі, а гэта адзіная жыццёвая аснова для развіцця промыслу. У пастанове ЦК КПСС «Аб народных мастацкіх промыслах» асабліва падкрэсліваецца, што цэнтральнай фігурай у вытворчасці павінен стаць народны майстар.

Сёння відавочная неабходнасць клапатлівага і зацікаўленага вырашэння праблемы захавання і развіцця огаўскага промыслу. Адной з асноўных умоў гэтага з'яўляецца пераход участка роспісу ў Огаве з выпуску масавай сувенірнай прадукцыі на вытворчасць высокамастацкіх маласерыйных і унікальных вырабаў з выкарыстаннем традыцыйнай тэхналогіі і дэкору. Трэба абнавіць і пашырыць асартымент шляхам узнаўлення традыцыйных узораў і распрацоўкі новых. Чаму ў Огаве, як і раней, не вырабляць вялікія, традыцыйных форм куфры малымі серыямі? Попыт жа на іх існуе і цяпер. У вёсках Брэстчыны жанчыны да гэтага часу ткуць, захоўваючы рамяство сваіх мацярок. Побач з Огавам знаходзіцца такі буйны цэнтр сучаснага ткацтва, як Моталь. Як і ў даўнія часы, рыхтуюць дзяўчатам пасаг — посцілкі, ручнікі, абрусы, «падарункі». А куфар не купіць. Ды і гарадскі жыхар не адмовіцца ўпрыгожыць інтэр'ер сваёй кватэры зручнай і прыгожай рэччу. Сувенірам жа можа стаць невялікі куфэрачак — копія традыцыйнага. Такая практыка існуе — напрыклад, у Польшчы ў аб'яднанні народных майстроў «Цэпелія».

Яшчэ адзін не менш перспектыўны напрамак — творчае развіццё промыслу. У огаўскім роспісе закладзены вялікія дэкаратыўныя магчымасці, ён разлічаны на буйныя плоскасці, яго можна паспяхова прымяняць для ўпрыгожання сучасных кухонных рэчаў і мэблі для дзіцячага пакоя.Тут супрацоўніцтва прафесійных мастакоў і народных майстроў можа даць вельмі цікавы мастацкі вынік.

Огаўскі промысел павінен жыць, захоўваць свае багатыя традыцыі, гадаваць маладых майстроў, дарыць людзям радасць судакранання з рукатворным народным мастацтвам і несці ў заўтрашні дзень прыгажосць.

В. ЛАБАЧЭЎСКАЯ,
мастацтвазнавец.
Фота аўтара артыкула.

У цэху роспісу.

ЗАПРАШЭННЕ ДА РОЗДУМУ

У залах Саюза мастакоў БССР працавала выстаўка работ графіка Надзеі ГАЛОЎЧАНКА

Партрэт лётчыка быў напісаны ў шпіталі каля Гомеля. І пастава, і выраз твару героя нядаўняй вайны выпраменьваюць невычэрпны сум па небе: пасля шпіталя лятаць ужо не давядзецца. Былому лётчыку крыху больш за дваццаць гадоў. Партрэт перарастае ў драматычную аповесць, дзе непадзельны пафас перамогі і ўсведамленне тых ахвяр, без якіх яна была б немагчыма.

Побач — іншы партрэт, напісаны зусім нядаўна: П. Сівакоў, абаронца Брэсцкай крэпасці. Пэндзаль мастачкі ўзнавіў тое бяспрыкладнае напружанне, якое ветэран вайны пранёс праз усё сваё ваеннае і мірнае жыццё як горкі, непазбежны і вялікі набытак.

Значную частку экспазіцыі складаюць партрэты людзей звычайных прафесій: слесар, ліцейшчык, бетоншчыца, цынкограф, пераплётчык, зваршчык, паркетчык — на дзіва багаты адзін толькі пералік прафесій тых, каго ў гушчыні штодзённага жыцця адшукала Надзея Іванаўна. Сардэчнай цеплынёй саграэты работы Галоўчанка, якая на заводах і будоўлях знаходзіла сапраўдных майстроў сваёй справы. Ёсць у іх рэалістычныя штрыхі, якія перадаюць праўдзівасць настрою менавіта таго часу. У літаграфічных партрэтах гэтая тэндэнцыя праявілася асабліва канкрэтна. Пасляваенныя гады сталі для нас гісторыяй, і таму асабліва каштоўныя прыкметы эпохі, якая адышла ў мінулае.

Н. ГАЛОЎЧАНКА. Студэнт з Бангладэш.

Асабліва адзначым партрэты беларускіх пісьменнікаў — Івана Мележа, Янкі Брыля, Эдзі Агняцвет. Аблічча кожнага перададзена дакладна. Ёсць у кожным партрэце і штосьці асаблівае, свая «изюминка». Усё гэта сапраўдныя знаходкі партрэтыста, які востра бачыць. Партрэты чуллівыя і праўдзівыя ў самым строгім сэнсе гэтага слова.

На згаданай выстаўцы прадстаўлена больш чым дзесяць аўтапартрэтаў. Ёсць сярод іх і ўласны партрэт у студэнцкім інтэрнаце на Трыфанаўцы, дзе можна ўбачыць куток дванаццаціметровага пакойчыка, завешанага эцюдамі. Аўтапартрэты раскажуць пра Надзею Іванаўну лепш, чым іншая аўтабіяграфія: мы бачым яе то дапытлівай і насцярожанай, то суровай, то спакойнай і ўпэўненай у сваіх сілах.

Далёка не банальнае ўяўленне пра Мінск ствараюць выстаўленыя пейзажы. Мы бачым оперны тэатр, дамы каля вакзала, раён цяперашняй вуліцы Арлоўскай, будаўніцтва моста і лёгка пазнаём гэтыя мясціны, адначасова заўважаючы, як змяніліся не толькі вуліцы і дамы, але і рытм горада, адчуваючы, як шмат азначаюць у наш час нейкія два-тры дзесяцігоддзі.

Далёка не кожная персанальная выстаўка праліває святло на гады вучобы мастака. Таму і радуюць многія студэнцкія работы, прадстаўленыя ў экспазіцыі. Выхаванка Віцебскага мастацкага тэхнікума, эвакуіраваная ў Самарканд, у сорак другім яна стала студэнткай інстытута імя Сурыкава. Заканчвала інстытут Н. Галоўчанка пасля вайны ўжо. Прага да працы і спазнання валодала тады моладдзю. Гэта можна адчуць, угледзеўшыся ў каларытную жанравую сцэнку «На эцюдах», выкананую ў Крыме, у час летняй практыкі.

Да сённяшняга дня працягвае Надзея Іванаўна пачатую яшчэ ў юнацтве работу, якую хочацца назваць дзённікам мастака. Свой дзённік яна вядзе ўдумліва і настойліва, давяраючы лістам паперы свае хваляванні і знаходкі. Радасць творчасці напаўняе кожную яе работу роздумам, пачуццём і той асаблівай прыцягальнасцю, якая з'яўляецца неад'емнай прыкметай сапраўднага твора мастацтва.

Кірыла ЗЕЛЯНОЙ.

ПРАБЛЕМЫ. МЕРКАВАННІ. РОЗДУМ

Шанаваць вытокі творчасці

НАТАТКІ АБ НОВАЙ ПРАГРАМЕ ДЗЯРЖАЎНАГА АНСАМБЛЯ ТАНЦА БССР

ПРЫХІЛЬНІКІ НАРОДНАГА ХАРЭАГРАФІЧНАГА мастацтва з цікавасцю сочаць за выступленнямі Дзяржаўнага ансамбля танца БССР (апошнія тры гады яго ўзначальвае Г. Маёраў). Ансамбль карыстаецца ў гледачоў добрай славай. Ды з некаторага часу канцэртныя сустрэчы з ім выклікаюць не толькі захапленне.

Вядома, вялікая адказнасць за пачэсную і цікавую творчую працу ўскладаецца на гэты калектыў: ён павінен з'яўляцца эталонам папулярызацыі нашага народнага танцавальнага мастацтва. Пра дзейнасць ансамбля мне ўжо даводзілася пісаць у «ЛіМе» (1.07.77 г.). Аднак я вымушана зноў вярнуцца да гэтага пытання.

ХАРЭАГРАФІЧНАЕ мастацтва нашага народа — яркае, шматаблічнае і маляўнічае — мае ў сваім вялікім арсенале сродкі мастацкай выразнасці, якія яшчэ трэба асвоіць спецыялістам. Гэтыя сродкі неабходны сёння як для пастановак старажытнага беларускага фальклору, так і для ўвасаблення ў харэаграфіі сучаснай тэматыкі, вобраза савецкага чалавека.

Галоўнае ў ансамблі — рэпертуар. Па гэтай «візітнай картцы» вызначаецца творчае аблічча калектыву. Рэпертуар павінен адпавядаць духоўным запатрабаванням гледача і, разам з тым, быць для яго школай добрага эстэтычнага густу і высакародных пачуццяў. І хочацца бачыць на сцэне харэаграфічнае апавяданне пра жыццё беларускага народа — яго працу, пачуцці, імкненні.

Што прапануецца ў сённяшняй канцэртнай праграме ансамбля? Яна складзена з твораў, розных па змесце і стылі, якія вымагаюць і разнастайнай танцавальнай лексікі, і новых цікавых знаходак, здатных падкрэсліць характар таго ці іншага народнага танца.

Зразумела, развіваць танец творча — можна і патрэбна. Але — за кошт рухаў, якія бытуюць у народзе, захоўваючы сутнасць танца, яго характар. Толькі тады танцавальная лексіка будзе яркай, пераканальнай і будзе ўспрымацца як народная, калі наватарская дзейнасць балетмайстраў грунтуецца на сапраўды народнай аснове. А гэта магчыма пры глыбокім веданні танцавальнага фальклору, беражлівых адносінах да народнай мастацкай спадчыны, захаванні ўсяго лепшага з яе.

Фальклор — гэта падмурак, на якім балетмайстар будуе розныя па тэме, стылі, жанры арыгінальныя творы, скарыстоўваючы ўсе набыткі сучаснай харэаграфіі. Ці варта даводзіць, што фальклорны пачатак мае быць ва ўсіх кампазіцыях і карцінах, створаных ансамблем?

Значыць, калектыў павінен паказваць лепшыя ўзоры танца, музыкі, касцюма... Ды, на жаль, апошнім часам адбываецца дзіўнае збяднение мовы беларускага танца. На сцэне з'яўляюцца танцы-блізняты. Яны падобны адзін да аднаго аднастайнасцю рухаў, малюнка, у той час, як у кожным рэгіёне Беларусі — свае стылістычныя асаблівасці танцавальнай лексікі, касцюма, нават арнаменту. А хіба не праз багацце выразных сродкаў танца выяўляецца ўнутраны творчы свет балетмайстра?

Зразумела, што ансамбль перажывае зараз перыяд абнаўлення: захоўваючы лепшае са старога рэпертуару, калектыў працуе над новымі пастаноўкамі ў самых розных жанрах. Вядома, ансамбль не павінен замыкацца ў рамках беларускага мастацтва: інтэрнацыянальны характар творчасці, зварот да фальклору іншых народаў — гэта ўзбагачае і пашырае рэпертуар. Але ж асновай, крэда ансамбля — павінны быць захаванне і развіццё беларускага нацыянальнага танцавальнага фальклору, узбагачэнне яго новымі сучаснымі тэмамі, вобразамі, рухамі.

Задача ансамбля, такім чынам, у беражлівых, але творчых адносінах да фальклору і ў прапагандзе мастацтва народа на высокім прафесійным узроўні. І ў праграме ансамбля ёсць нумары, вартыя ўвагі, але пэўныя з іх, на жаль, не пазбаўлены сур'ёзных недахопаў: аднастайнасць, адсутнасць новых, свежых фарбаў, творчай рэжысёрскай выдумкі.

Ухвалы заслугоўваюць работы балетмайстраў І. Серыкава, Я. Штопа, В. Цюрына, С. Дрэчына. У іх пастаноўках, створаных на народнай аснове, —праўдзівасць вобразаў, мастацкая пераканальнасць, высокі эмацыянальны напал. Гэтыя балетмайстры адчуваюць і ўмеюць перанесці на сцэну нацыянальны каларыт, самабытнае хараство народнага танца.

Вось — «Прывітанне» (паст. Я. Штопа), пачатак праграмы, уводзіны гледача ў дзеянне. Цікавымі падаюцца іскрыстыя танцы «Трапятуха» (паст. Я. Штопа), «Груздаўская кадрыля», «Маталіха» (пастаноўкі І. Серыкава), «Лявоны» (паст. В. Цюрына). Выклікае сумненні сваім «паходжаннем» плаўны танец «Каханачка» (паст. Я. Штопа), хаця ён уносіць у праграму своеасаблівую разрадку, глядзіцца з цікавасцю, прываблівае захапляючай кампазіцыйнай распрацоўкай. Між іншым, хацелася б, каб у праграмах канцэрта была кароткая анатацыя да ўсіх выконваемых танцаў.

Асаблівы мастацкі почырк вызначае работы С. Дрэчына: яны сведчаць аб глыбокім веданні фальклору і адчуванні часу. «Полька Янка» адметная народным каларытам, весялосцю, дасціпнасцю, гумарам. Аднак звышхуткі тэмп (ці то ўзяты выканаўцамі адвольна, ці то прапанаваны ім) ператварае гэты іграві танец у механічнае дзеянне, галоўнай мэтай якога робіцца імкненне артыстаў не разысціся з музыкай. Так скажаецца першапачатковая аўтарская задума, бо правільна ўзяты тэмп танца мае вялікае значэнне.

«Купальская ноч» (паст. С. Дрэчына) — харэаграфічная карціна, распрацавана на матэрыяле народнага абраду. Яна прываблівае тэатральнасцю, багаццем рэжысёрскай фантазіі, яркай вобразнасцю, смеласцю.

«Перапёлачка», пастаўленая таксама С. Дрэчыным, у першапачатковым аўтарскім варыянце ўвасабляла чыстую атмасферу плаўнага лірычнага народнага карагоду. Чаму ж цяпер танец згубіў сваю прывабнасць? Ці не таму, што кожны новы мастацкі кіраўнік, які прыходзіў у ансамбль, лічыў сваім абавязкам унесці ўласныя карэктывы ў любы танцавальны нумар без узгаднення з аўтарам?.. Вядома, што ніякі харэаграфічны твор не жыве без мастацкага афармлення. У свой час былі распрацаваны аўтарам выдатныя касцюмы — адпаведна пастановачнай задуме. І сёння з жалем адзначаеш, што ў «Перапёлачцы» больш за ўсё пацярпела мастацкае афармленне: касцюмы сумныя, бляклыя, арнамент шэры, колер не характэрны для беларусаў, галаўны ўбор надуманы, выглядае грувасткім, не адпаведным лірычнаму, лёгкаму, «паветранаму» пачатку танца.

«Весялуха» ў пастаноўцы М. Дудчанка заняла на нашай сцэне трывалае месца. Хаця ў пастаноўцы ёсць спрэчныя моманты, не буду зараз пра іх гаварыць. Не змаўчу толькі пра адно: пра антыэстэтычнае «па» артысткі С. Каралёвай. Яна ў амплуа «жартоўнага дырыжора» паказвае з аванасцэны ўступ аркестру высока ўзнятай нагой. Вось дык «знаходка»!

Звернемся да новых работ самога мастацкага кіраўніка. Нельга не аддаць належнае Г. Маёраву за яго балет «Чыпаліна», пастаўлены ў Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР, за пастаноўкі ў тэатрах іншых рэспублік. Праца ў ансамблі танца звязана ўжо з іншай спецыфікай, вымагае іншага падыходу да пастановак, вялікага запасу спецыяльных ведаў у галіне сцэнічнага ўвасаблення шматжанравай народнай харэаграфіі. Трэба адзначыць істотную рысу ў працы Г. Маёрава — яго пастаянны творчы пошук. Як вядома, любым эксперыментам у мастацтве павінна кіраваць думка пра эстэтычнае выхаванне гледача. Калі балетмайстар эксперыментуе, ён, звычайна, у нечым сумняваецца, ад нечага адмаўляецца дзеля сцвярджэння новых ідэй і форм. Але ў любым выпадку, калі ён не абапіраецца на традыцыі (у дадзеным выпадку — народнай харэаграфіі), пастаноўшчык ніколі не стане стваральнікам сапраўднага твора мастацтва, якому наканавана доўгае жыццё.

Дазволю сабе запытацца: чаму ў рэпертуары Дзяржаўнага ансамбля танца БССР няма танцаў шырока вядомых, тых, што ўваходзяць у залаты фонд беларускага мастацтва і папулярны далёка за межамі рэспублікі? Куды зніклі такія цудоўныя творы народа, як «Лянок», «Таўкачыкі», «Мікіта», «Крыжачок», «Качан», «Юрачка», «Бульба», «Шостак», «Чарот», «Жабка», «Галубец», «Журавель», «Мельнік», «Кросны», «Верабей» і многія іншыя ігравыя танцы, карагоды? Яны незаслужана забыты. А глядач цікавіцца: дзе ж тая харэаграфічная культура, што стагоддзямі складалася ў беларускім народзе?

Сучасны глядач эстэтычна падрыхтаваны, дасведчаны і патрабавальны. Ён востра рэагуе на зніжэнне ідэйна-мастацкага ўзроўню ў тых работах ансамбля, дзе «арыгінальнічанне» адлучае мастацтва ад праўды жыцця. Ён адчувае, калі ўвядзенне хай сабе і эфектных, але неарганічных прыёмаў парушае хараство і жыццёвую натуральнасць танца.

Хто не ведае чыстую ў сваіх народных вытоках, іскрыстую, прыгожую, дынамічную беларускую «Лявоніху»! Гордасць нашай нацыянальнай харэаграфіі, яна заваявала заслужаную папулярнасць ва ўсіх кутках краіны. Але «Лявоніха» ў пастаноўцы Г. Маёрава — проста надуманы танец, які не мае народнай асновы: яму можна даць любую іншую назву і нічога ад гэтага не зменіцца. Зрэшты, так і робіцца: за кароткі час танец пераймяноўваўся ў «Лявоніху-80», «Паэму пра Лявоніху». Відавочна, балетмайстар не ўпэўнены ў дакладнасці сваёй работы і шукае шляхоў да апраўдання сваіх пастановачных задум. Калі ж гэты танец з'явіцца пад сваім сапраўдным імем — «Лявоніха»?

Думаецца, толькі тады, калі пастаноўка будзе адпавядаць духу і прынцыпам самога шэдэўра нашага танцавальнага фальклору. Прымаючы ж такую «Паэму пра Лявоніху» ці «Лявоніху-80», мастацкі савет пры ансамблі, відаць, не ўлічыў, што калектыў часта гастралюе па краіне і за мяжой, і якасць узораў беларускай харэаграфіі, якія папулярызуюцца, мае быць бездакорнай. Іх трэба ахоўваць, як помнікі гісторыі і культуры народа.

Цікавая і актуальная тэма кампазіцыі «Дняпровы браты»: мастацтва Расіі, Украіны, Беларусі звязана магутнымі каранямі роднасных славянскіх культур, тры вялікія народы злучае прыгажун-Дняпро. У чым складанасць гэтай кампазіцыі? Яна паўстае як адзінае драматургічнае дзеянне, дзе ўсе часткі і дэталі аднолькава важныя. Тут хацелася б пабачыць ва ўсім багацці харэаграфічны фальклор трох рэспублік — як увасабленне непарушнага адзінства і братэрства гэтых народаў. На жаль, гучная назва пастаноўкі не адпавядае яе зместу. Харэаграфічнае ўвасабленне тэмы выклікае пачуццё незадаволенасці, бо балетмайстар вельмі скупа выкарыстаў нацыянальны харэаграфічны матэрыял. Асабліва гэта выявілася ў рускім танцы.

«Полюшко-поле» — харэаграфічны твор, які адлюстроўвае рэвалюцыйныя, баявыя традыцыі нашага народа. Тэма складаная. І пастаноўшчыку, канечне, нялёгка раскрыць задуму на працягу некалькіх мінут танца, стварыць адметны вобраз, характары герояў, паказаць іх перажыванні.

Расказаць у танцавальнай форме пра гераічныя будні тых рэвалюцыйных гадоў...

Як жа развіваюцца падзеі ў кампазіцыі ансамбля? З самага пачатку нумара (выезд кавалькады коннікаў) востра адчуваеш неадпаведнасць рухаў музычнаму суправаджэнню. Сінкапіраваны малюнак, якім «маскіруецца» танец, супярэчыць цудоўнай мелодыі песні «Полюшко». Таму рэзка зніжаецца значнасць гераічных вобразаў, малапераканальным падаецца і выкананне. Усё наступнае таксама не вельмі ўражвае. Скупая і нецікавая харэаграфічная мова. Паверыць выканаўцу, які ўвасабляе гераічны вобраз, можна толькі тады, калі на сцэне паказана барацьба за высакародныя ідэалы, пераадоленне перашкод. Тут жа не хапіла гераічнай прыўзнятасці, якая пранізвала б танец.

Некалькі слоў — пра касцюмы. Белыя буркі коннікаў, думаю, не робяць жаданага ўражання. З залы яны нагадвалі белыя прасціны.

У пастаноўцы «Беларуская навела, або Беларускія сувеніры» зноў — нестабільныя назвы танца. А ў танцы не адчуваецца дух творчасці нашых умельцаў, якія звяртаюцца да народных крыніц, няма характэрных жанравых сцэнак — яны ў аранжыроўцы балетмайстра маглі б стаць сувенірамі беларускага народнага бытавога харэаграфічнага мастацтва. Маглі б, ды не сталі...

Сольны нумар—трыо ў гэтай кампазіцыі — не вызначаецца вобразнай адметнасцю, высокай ідэйнасцю і дасканаласцю формы. Ад танца такога плана чакаеш акрэсленай думкі і праўдзівасці, даходлівасці і хараства сапраўднага мастацтва, зразумелага шырокай аўдыторыі. І, вядома, — не спрошчанасці, не крыклівасці.

Балетмайстар меркаваў паказаць у «Беларускай навеле, або Беларускіх сувенірах» карцінкі з народнага побыту мінулага. Але няма ў іх побыту беларускага народа. Здзіўляешся і шкадуеш, што ўвасоблены ў танцы не мяккі гумар, уласцівы народнай беларускай харэаграфіі, а грубыя, шаржыраваныя і штучна «смешныя» элементы. Таму зразумела, што артысты, імкнучыся перадаць задуму балетмайстра, стварылі вобразы, скажу так, малапераканальныя.

Дык ці варта захоўваць такі танец у рэпертуары ансамбля? І зноў — дзве назвы: «Танцуйце разам з намі, або Маладзёжны танец», зноў няўпэўненасць балетмайстра ў вызначэнні жанру сваёй работы. Танец прасякнуты сучаснымі рытмамі і інтанацыямі, але і ён, на жаль, не мае нацыянальнай афарбоўкі. Рытмічная структура рухаў не суладная тут з нацыянальнымі рысамі танца, ды яшчэ падкрэслена «цяжкімі» для вока беларускімі касцюмамі і галаўнымі ўборамі. Беларускі фальклор — быццам у мадэрнізаванай апрацоўцы. Але мода мяняецца хутка; стагоддзі перажывае толькі сапраўднае мастацтва.

Хто ж не ведае, што сапраўдныя мастакі ніколі не змешвалі моду з сучаснасцю, кароткачасовае захапленне — з народным прызваннем. Хіба трэба даводзіць, што не можа быць мастацкасці без ідэйнасці! Як гэта важна: адмаўляцца ад спакусы лёгкага поспеху модных плыней, ставіць для сябе высокія мэты і няўхільна крочыць да іх...

Я лічу, што такога плана танец, як «Маладзёжны», мае права на жыццё, але ўсё тут залежыць ад яго інтэрпрэтацыі. Ды і ад сучаснага мастацкага афармлення касцюмаў.

АДЗІНСТВА музыкі і танца — таксама сярод надзённых пытанняў творчай дзейнасці ансамбля. Неабходна, каб вобраз «чутны» арганічна супадаў з вобразам «бачным». На жаль, такое адзінства назіраеш не ва ўсіх танцах. Таму што рухі, звязаныя з музыкай, часта не ўвасабляюць яе, а павярхоўна ілюструюць, і харэаграфія тады не «спявае», малюнак танцаў не «гучыць».

Музычнае суправаджэнне шэрагу танцаў падалося мне проста нецікавым. Глядач жа ва ўзаемасувязі танца і музыкі шукае прыгажосць, яснасць, выразнасць.

Пра густы, кажуць, не спрачаюцца. Але ўсё ж пра густы неабходна спрачацца, калі справа тычыцца выхавання эстэтычнага густу шырокай глядацкай аўдыторыі.

Хочацца пажадаць калектыву музыкантаў ансамбля больш беражліва абыходзіцца з апрацоўкамі народных танцавальных мелодый. Магчыма, суправаджэнне варта і разнастаіць— дзеля ўзбагачэння формы і паглыблення зместу, але рабіць гэта трэба тактоўна, па-творчы, шануючы дух першакрыніцы.

Так, не ўсё ўдалося ў сённяшняй праграме ансамбля. Заўвагі, зробленыя мною аб пастаноўках танцаў, касцюмах, музычных апрацоўках, датычаць і мастацкага савета, які прымае асобныя нумары і праграму ў цэлым. Ад мастацкага савета залежыць многае ў вырашэнні творчых пытанняў: мера аб'ектыўнасці ў ацэнках, наяўнасць здаровай крытыкі, якую нельга падмяняць каскадам дыфірамбаў і захопленых эпітэтаў. Прынцыповасць і беражлівыя адносіны да стваральнікаў мастацкіх каштоўнасцей—як гэта важна! І калі б наша харэаграфія мела падобную крытыку, поспехі ансамбля былі б больш значныя, а яго праца — больш эфектыўная.

Думаю, што сапраўднага поспеху калектыў дасягне, калі ў сваім мастацтве ён панясе гледачу крынічную чысціню сапраўднай народнай творчасці. Майстэрства артыстаў ансамбля пераконвае ў тым, што гэта ў магчымасцях цяперашняга складу выканаўцаў.

Ларыса АЛЕКСЮТОВІЧ.

НА АБСЯГАХ КУЛЬТУРЫ

ДЫСКАТЭКА— ПАТРЭБА ЧАСУ

Аналіз работы многіх клубаў і іншых культурна - асветных устаноў дазваляе зрабіць вывад, што найбольш папулярнымі сярод моладзі застаюцца менавіта танцы. І гэта заканамерна, бо танцы — гэта і адпачынак, і кантакты, і неабходная эмацыянальная і фізічная разрадка. Як паказваюць даследаванні савецкіх сацыёлагаў, толькі 15 працэнтаў наведвальнікаў прыходзіць у клуб на танцавальныя вечары дзеля танцаў. Асноўным жа матывам наведвання танцаў з'яўляецца магчымасць сустрэцца з аднагодкамі. І таму зусім не выпадкова ўзнікаюць дыскусіі менавіта па праблеме: чым быць дыскатэцы — танцпляцоўкай або клубам, месцам творчых кантактаў моладзі?

Сёння ўзровень работы многіх дыскатэк яшчэ даволі нізкі. У многіх клубах, маладзёжных кафэ падышлі да арганізацыі дыскатэк як да моднай задумкі, не ўлічваючы сваіх сіл і магчымасцей. Масавы варыянт такіх дыскатэк — звычайныя танцавальныя вечары з даволі прымітыўнымі, а часам і бездапаможнымі каментарыямі вядучых і дэманстрацыяй выпадковых слайдаў.

Патрэбнасць жа ў дыскатэках, у іх змястоўнай рабоце вялікая. Пра гэта сведчаць шматлікія пісьмы моладзі ў рэдакцыі газет, на тэлебачанне. «Горад наш даволі вялікі, а пайсці моладзі няма куды,— пішуць студэнты з Гомеля. — У нас існуюць дыскатэкі ў кафэ «Маладзёжнае», у рэстаране «Журавінка», але кошт уваходнага білета — 5 рублёў... І чаму дыскатэкі наладжваюць толькі ў рэстаране або ў кафэ?».

Адной з форм актывізацыі дыскатэчнага руху ў краіне з'яўляюцца конкурсы, фестывалі дыскатэк. У нашай рэспубліцы яны дагэтуль не праводзіліся. Вось чаму такую ўвагу прыцягнуў І абласны конкурс самадзейных праграм дыскатэк і дыскаклубаў, ініцыятарам правядзення якога быў Мінскі абком ЛКСМБ. У першым адборачным туры, які праходзіў каля месяца, прыняло ўдзел 28 дыскатэк і дыскаклубаў вобласці. Трэба сказаць, што многія іх кіраўнікі паставіліся да конкурсу фармальна, без належнай адказнасці. Нялёгка было журы адабраць у фінал тыя дыскатэкі, абедзве праграмы якіх адпавядалі б конкурсным патрабаванням. Прычына — адсутнасць вопыту работы, творчага падыходу да падрыхтоўкі праграм. Большасць з іх была пабудавана ў форме лекцый або літаратурна - музычных кампазіцый, а многія цікавыя ідэі засталіся нерэалізаваныя, як, напрыклад, праграмы дыскаклубаў «Калейдаскоп» з Маладзечна, Мінскага вытворчага аб'яднання «Камсамолка» і іншыя.

І ўсё ж конкурс дапамог выявіць і нямала цікавых знаходак. У фінал конкурсу, які праходзіў у Палацы культуры трактарнага завода, было адабрана 8 абавязковых і 5 адвольных праграм. Сваё майстэрства прадэманстравалі 10 лепшых дыскатэк і дыскаклубаў вобласці.

Сярод абавязковых праграм найбольш цікавыя паказалі дыскаклубы «Натхненне» Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі імя В. Куйбышава (кіраўнік В. Заічэнка) — праграма «Моладзь спявае пра мір, дружбу і салідарнасць» і камсамольска-маладзёжнага кафэ «Сузор'е» (кіраўнік В. Калчанаў) — «Камсамол — песня мая», якія падзялілі паміж сабой 2-е месца (1-е месца журы вырашыла не прысуджаць).

Цікавую абавязковую праграму паказаў калектыў дыскатэкі клуба папярова - лесахімічнага завода г. Барысава (кіраўнік Ю. Яромкін), якая заняла на конкурсе 3-е месца. Гэта дыскатэка працуе ўсяго некалькі месяцаў, няма пакуль добрай апаратуры, але энтузіязм арганізатараў дапамагае вырашаць сур'ёзныя творчыя задачы.

Досыць цікавымі і змястоўнымі былі і адвольныя праграмы. Першае месца падзялілі паміж сабой дыскаклуб «Натхненне» з праграмай «Зварот да музыкі яго (Бах)» і дыскаклуб Інстытута цепла- і масаабмену АН БССР з праграмай «Як шкада, што цябе няма з намі», прысвечанай Джону Ленану. Своеасаблівую праграму «Бег часу» вынеслі на суд журы і гледачоў удзельнікі дыскатэкі Палаца культуры і тэхнікі Мінскага аўтазавода, якая заняла 3-е месца.

Гэты конкурс дапамог выявіць не толькі дасягненні, але і недахопы, паставіў шэраг праблем, якія неабходна вырашыць у бліжэйшы час. Калі сёння ў Мінску працуе каля 30 дыскатэк і дыскаклубаў, то ў вобласці іх значна менш (у конкурсе прыняло ўдзел усяго 6 дыскатэк). З сельскай мясцовасці на конкурсе была прадстаўлена толькі адна дыскатэка — з вёскі Сенніца Мінскага раёна.

Мне ў якасці члена журы давялося прагледзець амаль усе праграмы дыскатэк, якія прынялі ўдзел у конкурсе. Многія з іх былі вырашаны на нізкім мастацкім узроўні, нецікавыя па змесце і слабыя па рэжысуры. Тлумачыцца гэта перш за ўсё тым, што падрыхтаваны гэтыя праграмы былі энтузіястамі-адзіночкамі, якія не маюць ні вопыту, ні ведаў у гэтай галіне. А дыскатэка ж — гэта форма калектыўная, комплексная як па сваёй структуры, так і па прызначэнні. Чым шырэй будуць прыцягвацца да работы дыскатэк розныя маладзёжныя аб'яднанні (клубы аматараў музыкі, тэатра, музычныя салоны, гурткі тэхнічнай творчасці), тым цікавейшым і больш разнастайным будзе іх змест. Да стварэння праграм трэба шырэй прыцягваць рэжысёраў, сцэнарыстаў, вопытных клубных работнікаў. А між тым аналіз паказвае, што далёка не заўсёды ініцыятарамі арганізацыі дыскатэк выступаюць клубныя ўстановы. Толькі 5 з 28 прагледжаных дыскатэк створаны ў клубах або пры непасрэдным удзеле клубных работнікаў. А менавіта ж у клубах ёсць і добрыя танцавальныя залы, і пэўная матэрыяльная база, і кваліфікаваныя спецыялісты. Думаецца, тут ёсць над чым задумацца работнікам абласных навукова-метадычных цэнтраў і міжсаюзных дамоў самадзейнай творчасці аблсаўпрофа.

Многія дыскатэкі маюць у сваім арсенале цікавыя праграмы, якія не заўсёды знаходзяць шырокага гледача. Таму неабходна практыкаваць абмены дыскапраграмамі, наладжваць гарадскія фестывалі дыскатэк.

Трэба старанна падыходзіць і да падбору памяшканняў для правядзення вечароў. У дыскатэцы павінна быць утульна і крышачку таемна, як у тэатры. Ад гэтага ў многім залежыць і выбар тыпу дыскатэк. Праблемы гэтыя можна вырашаць ужо сёння. Напрыклад, дзякуючы ініцыятыве камсамольскіх арганізацый афармлены цудоўныя памяшканні ў камсамольска - маладзёжных кафэ «Калейдаскоп» г. Маладзечна, «Колас» г. Дзяржынска, «Крыніцы» г. Мінска і іншыя. На сродкі, атрыманыя ў час суботнікаў, набыта добрая апаратура. Гэтыя кафэ сталі любімымі месцамі адпачынку моладзі.

У арганізатараў дыскатэк ёсць і шэраг аб'ектыўных цяжкасцей. Перш за ўсё — гэта апаратура. Яе можа набыць не кожны клуб. Як правіла, у асноўным яна трапляе ў кафэ і бары, дзе не заўсёды выкарыстоўваецца па прызначэнні. Значыць, клубы і кафэ могуць кааперавацца сваю работу: у кафэ ёсць апаратура, а клуб можа ўзяць на сябе функцыі кваліфікаванага забеспячэння работы дыскатэк. У выніку—выйграе справа.

У газеце «Правда» была ўзнята праблема арганізацыі дыскасховішчаў пры буйных палацах культуры, дамах самадзейнай творчасці і навукова - метадычных цэнтрах. Спецыяльна падабраныя тэматычныя камплекты пласцінак маглі б выдавацца «па абанементах». Гэта дапамагло б вырашыць праблему забеспячэння дыскатэк музычным і інфармацыйным матэрыялам.

Конкурс засведчыў, што сёння неабходна пастаянная, сістэматычная работа з кадрамі дыскатэк: вядучымі, рэжысёрамі, гукааператарамі. У гэтым накірунку ўжо тое-сёе зроблена. Пры інстытуце павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры створана і працуе другі год рэспубліканская школа па падрыхтоўцы вядучых дыскатэк, у якой займаецца 55 чалавек. У Мінскім інстытуце культуры ў гэтым навучальным годзе ўпершыню ўведзены спецкурс «Практыкум па арганізацыі дыскатэк» для студэнтаў аддзялення арганізацыі і методыкі клубнай работы. Але пакуль курс абмежаваны вучэбнымі гадзінамі, няма добрай апаратуры. Думаецца, што гэты практыкум неабходна ўвесці для будучых культасветработнікаў. Вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы кіраўнікоў дыскатэк маглі б аказаць факультэты грамадскіх прафесій ВНУ.

Вось ужо трэці год ідзе гаворка пра стварэнне рэспубліканскага цэнтра дыскатэк, але пакуль канкрэтных захадаў не зроблена. А цэнтр змог бы вырашыць пытанні цэнтралізаванага забеспячэння дыскатэк апаратурай, музычным і інфармацыйным матэрыялам, арганізацыі вучобы і падбору кадраў вядучых, вывучаць і абагульняць вопыт работы. Неабходнасць стварэння цэнтра абумоўліваецца яшчэ і тым, што дасюль не вызначана прыналежнасць дыскатэк, стыхійнасць іх узнікнення на першых этапах прывяла да незвычайна шырокай «геаграфіі» іх функцыяніравання. Дыскатэкі ствараюцца ў клубных установах, ВНУ, тэхнікумах і школах, студэнцкіх і рабочых інтэрнатах, кафэ, барах, рэстаранах.

І яшчэ. Наспеў час рэгулярна праводзіць конкурсы і фестывалі дыскатэк, прытым не абмяжоўвацца толькі тэматычнымі праграмамі, але і рыхтаваць на конкурс танцавальныя, бо асноўнае прызначэнне дыскатэк — арганізацыя танцавальных вечароў.

А конкурсы дыск - жакеяў— вядучых дыскатэк? Поспех работы дыскатэк залежыць у многім ад узроўню іх падрыхтоўкі. Такія конкурсы дадуць магчымасць выявіць найбольш цікавых і вопытных вядучых, вывучыць вопыт іх работы.

Т. СТРУЖЭЦКІ.

СВЕТ ЗАХАПЛЕННЯЎ АКЦЁРАЎ

Гэта карціна пра восень. Бляклыя, тумановыя фарбы дрыжаць апошнім святлом, апошнім гарэннем. Але і гэты развітальны час мае сваю прывабнасць. Адзінокі журавель на фоне сонечнага дыска. Яшчэ раз убачыць родныя ўзгоркі, махнуць ім крылом, каб не забыцца зноў вярнуцца сюды, дзе вырас.

Дзяўчына ў белым на беразе. Марыць? Чакае? Яна ўся ва ўладзе мора, але і мора падуладна яе душы. Карціны—без назваў. Яны прымушаюць гледача самому і па-свойму знаходзіць іх. Спасцігаць працай думкі і пачуцця вобразы аўтара. Напэўна, так, як і на сцэне. Толькі ўклаўшы ў вобраз усе сілы душы, можна прымусіць гледача знайсці ў ім нешта блізкае, сваё, набалелае.

Карціны артыста Акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы Ф. Варанецкага адкрываюць выстаўку «Свет захапленняў», дзе прадстаўлены экспанаты акцёраў мінскіх тэатраў у гасцінай Дома работнікаў мастацтваў.

Што гэта? Хобі! Не. Хутчэй за ўсё своеасаблівы шлях спасціжэння «першай» прафесіі—тэатральнага мастацтва. Гэта выхаванне ў сабе ўяўлення пільнасці да праяў жыцця, развіцця пачуццяў. «Сапраўдная прыгажосць даступна толькі дзіцячай душы мастака»,— пісаў Э. Межэлайціс. Адчуць, заўважыць вобраз у карэннях дрэў, у сухіх, змярцвелых галінках можа толькі вока сапраўднага мастака. Ці не пра гэта нагадваюць нам засушаныя бадылінкі ў дзівоснай вазе з кораня? А колькі лірычнасці, напамінку аб родным полі, блакітным прасторы ў гэтых мяцёлачках? Задумваешся: якімі ж павінны быць па-мастакоўску тонкімі рукі аўтара тых вырабаў — Стэфаніі Станюты. Цяпер буду памятаць гэту артыстку і як своеасаблівага мастака. Якім багаццем узораў вылучаецца яе біжутэрыя! Зярняткі гарбуза, пшаніцы, інжыра, жалуды, каштаны, шышкі, грэцкія арэхі, з'ядноўваючыся на нітцы ў розных кампазіцыях, ператвараюцца ў пацеркі, брошкі, калье.

Творчая фантазія мастака бязмежная. Некалькі розных па памеры і форме шклянак становяцца «Пакінутай юртай», «Паўночнай фантазіяй». Работы ювелірныя, якія патрабуюць цярпення, увагі, натхнення. Поўная прыгажосці, зграбная постаць жанчыны, вытачаная з дрэва. Прыгажосць свету неаддзельная ад прыгажосці чалавека, — гавораць нам работы артысткі купалаўскага тэатра Б. Данальскай.

Разнажанравасць выстаўкі пацвярджаюць і габелены артысткі тэатра лялек Л. Мікуло. Сутыкненне колераў: чорнага, чырвонага, зялёнага, жоўтага, белага. Спляценне ўзораў. Пошукі свайго аўтарскага, неардынарнага.

Пакідаеш выстаўку з думкай: «А што гэта было?» А было імкненне яе аўтараў да людзей, да праўды, да жыцця. Місія ў творцы вялікая: выхаваць чалавека ў чалавеку. А для таго, каб выканаць яе пачэсна, трэба спасцігнуць усю складанасць яго думкі і пачуцця.

А. ДАШЧЫНСКІ.

МУЗАМ НА ПАЦЕХУ

УСМІХАЎСЯ ДЗЕД ТАЛАШ

У 1943 годзе скульптар Заір Азгур ляпіў у сваёй майстэрні партрэт Васіля Ісакавіча. У часе працы яны шмат гаварылі пра жыццёбыццё. Нарэшце зайшла гаворка пра Якуба Коласа.

— Знаю я яго! — сказаў дзед Талаш. — А як жа? Гэта ён пра мяне кніжну напісаў. Таму яго зараз усе і ведаюць.

●

Дзед Талаш вельмі любіў радыё. Асабліва яму падабалася слухаць перадачы, якія вёў Уладзімір Юрэвіч — малады тады дыктар.

Аднаго разу, калі Талашу надарылася быць у Мінску, ён загадаў: «Клічце таго, хто ўсё ведае, з ранку да вечара гамоніць...»

Да Талаша прывялі васемнаццацігадовага дзецюка, дробненькага, шчупленькага, хударлявага. Паглядзеў на яго Талаш і галавой пакруціў.

— Не, не той... Той павінен быць во... мужчына, — і намаляваў рукамі ўяўленага ім дыктара.

У той жа дзень Юрэвічу давялося весці з дзедам Талашом гаворку перад мікрафонам. Вельмі здзівіўся Талаш, калі пачуў знаёмы голас.

— Цяпер я веру, што гэта ты, — шапнуў ён і паціснуў Юрэвічу руку.

●

Жывучы ў Маскве дзед Талаш харчаваўся ў сталоўцы, што знаходзілася на Арбаце. Звычайна на абед яго адвозіла машына. Аднаго разу яе чамусьці доўга не было, і Талаш выправіўся ў дарогу на трамваі. Здарылася так, што ён сеў у вагон, які ішоў у супрацьлеглы ад Арбата бок. Заўважыўшы, што памыліўся, Талаш замітусіўся, затурбаваўся.

— Куды вам, дзядуля? — пацікавілася кандуктарка.

— Ік шаху, — не міргнуўшы вокам, адказаў дзед.

— Куды? — здзіўлена перапытала тая.

— Я ж кажу — ік шаху... Разумееш, мая галуба, на абед я спазняюся да яго.

Пасажыры і кандуктарка стрымана заўсміхаліся. Ім няўцям было, што Шахам завуць загадчыка сталоўкі на Арбаце, у якой харчаваўся стары партызан.

Сабраў У. СОДАЛЬ.

ДЫЯЛОГ

— Тата, тата! Стань сланом, а я цябе паганяць буду.

— Кінь, Воўка, дурэць, грэйся на сонейку і на машыну паглядвай. Я газету пачытаю.

— Тата, а тата? Каля машыны нейкі дзядзька ходзіць.

— Хай ходзіць. Дзе ж яму хадзіць? Па ельніку? Грэйся, загарай, а я пачытаю.

— Тата, тата! Ён колы мацае і заглядае ў сярэдзіну.

— Хай заглядае.

— Тата, ён адчыніў дзверцы ў машыне...

— На тое і дзверы, каб іх адчыняць. Ну што ты прыстаў, як смала? Дай адпачыць: дома мама не дае, а на прыродзе — ты.

— Тата, ён паехаў на нашай машыне.

— Хай едзе... Што ты сказаў? «Паехаў на нашай машыне»? Воўка! Бяжым да дзяжурнага міліцыянера: гэта ж нашу машыну ўкралі...

КУЛЬТУРНАЯ ЛАЗНЯ

— Глянь, Сымоне, як павысілася культура ў нашай лазні.

— Скуль ты ўзяў?

— А вунь паперка на дзвярах, бачыш? Знаеш, што там напісана?

— Што?

— Там, Сымоне, напісана так: «Прабачце, калі ласка! З-за адсутнасці венікаў парылка не працуе».

— Сапраўды, культурна напісана. Толькі не ўцямлю: яны што, венікамі паляць?!

М. ДУБОЎСКІ.

ШЧЫРАЯ НАТУРА

У Небасхілава было такое прозвішча, як у аднаго вялікага ў сферы сэрвісу чалавека. Яго ведалі ўсе.

Калі Небасхілаў заходзіў у магазін і называў сваё (Яго) прозвішча, вочкі прадаўшчыц зіхацелі, нібы вясёлкі. І яны адразу пыталіся:

— Скажыце, вы не сваяк нашага Небасхілава?

— Сваяк, — усміхаўся Небасхілаў, і дзверы гандлёвай кропкі шырока расчыняліся для яго.

Калі Небасхілаў наведваўся ў першакласны рэстаран і называў сваё (Яго) прозвішча, афіцыянткі млелі і ціха пыталіся:

— Прабачце, вы не сваяк нашага Небасхілава?

— Так, — з гонарам казыраў Небасхілаў сваім знакамітым цёзкам, і найлепшае віно і закусь шыкоўнага рэстарана з'яўляліся перад ім, нібы на абрусе-самабранцы.

Калі Небасхілаў спыняўся на сваіх «Жыгулях» на станцыі тэхнічнага абслугоўвання і накіроўваўся ў кабінет дырэктара, называючы сваё (Яго) прозвішча, той жыва цікавіўся сваяцкімі сувязямі наведвальніка.

— Сваяк, — сцвярджаў Небасхілаў з прымессю высакароднага металу ў голасе. — Праверце, калі ласка, стан карбюратара, а таксама задняе кола. І прашу, па магчымасці, без усялякай чаргі.

Калі Небасхілаў прыйшоў упершыню на прыём да гэтага вялікага чалавека, той выслухаў яго дробную просьбу, а потым спытаў:

— Скажыце: мы з вамі выпадкова не сваякі?

— На вялікі жаль, не, — шчыра прызнаўся Небасхілаў-двайнік.

«Навошта падманваць добрага чалавека, — падумаў ён, — калі ў тым няма ніякай карысці?»

В. ГІЛЕВІЧ.

На блакітным экране

Другая праграма

З 1 ПА 7 ЧЭРВЕНЯ

1 ЧЭРВЕНЯ, 19.20.

«ТВОРЧАСЦЬ МАЛАДЫХ».

Расказ пра народную філармонію Мінскага музычнага вучылішча імя Глінкі.

1 ЧЭРВЕНЯ, 20.15.

«ТВОРЧАЯ САДРУЖНАСЦЬ».

Прагучаць песні літоўскіх кампазітараў у выкананні беларускіх спевакоў.

2 ЧЭРВЕНЯ, 19.20.

«СПАКОЮ НЕ ВЕДАЦЬ».

Перадача расказвае аб творчым вечары А. Лойкі, які адбыўся ў Слоніме. У перадачы прымаюць удзел І. Шамякін, А. Вярцінскі, Р. Барадулін, В. Зуёнак.

4 ЧЭРВЕНЯ, 19.20.

«ТВОРЧЫЯ ПАРТРЭТЫ».

Перадача прысвечана мастаку А. Волкаву.

5 ЧЭРВЕНЯ, 22.55.

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».

Музычная праграма з удзелам В. Лявонцьева.

6 ЧЭРВЕНЯ, 10.30.

«У ЖЫВАПІСЕ, ГРАФІЦЫ, СКУЛЬПТУРЫ».

Рэпартаж з рэспубліканскай мастацкай выстаўкі, прысвечанай 36-годдзю Перамогі.

6 ЧЭРВЕНЯ, 13.50.

«ЛЯ РАСКРЫТАЙ ПАРТЫТУРЫ».

Прагучыць 9-я сімфонія Бетховена ў выкананні Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра БССР, Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы, дырыжор Удэ Нісэн (ГДР).

6 ЧЭРВЕНЯ, 15.10.

«ЭНЕРГІЧНЫЯ ЛЮДЗІ».

Спектакль Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа па п'есе В. Шукшына.

7 ЧЭРВЕНЯ, 9.40.

«У КРАІ ГОР І ЯСНЫХ ДАЛЯЧЫНЬ».

Перадача знаёміць з ташкенцкім перыядам жыцця і творчасці народнага пісьменніка Беларусі Якуба Коласа. У перадачы прымаюць удзел паэты Зульфія і Яшэн.

7 ЧЭРВЕНЯ, 15.55.

«КАМЕРТОН».

Перадача расказвае аб музычным жыцці рэспублікі.

АБ'ЯВЫ

Рэдакцыі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» тэрмінова патрабуецца машыністка. Званіць па тэлефоне 33-24-61.

Густаў КРКЛЕЦ

МІНІЯЦЮРЫ

КАМУ ШТО

Крытык мудры і цвярозы,
Вось чаму загінуў:
Аддаваў ён іншым розум,
Сабе ж — не пакінуў.

З НАШАГА ПАРНАСА

У Заграбе — ці ўсюды і заўсёды? —
Пісьменнікаў дзве групы існуе:
Адна, што прысуджае ўзнагароду,
Другая — што імкнецца да яе.

Пераклаў з сербскахарвацкай І. ЧАРОТА.

Азбука жыцця

Зайздроснік: «Ёсць жа людзі — і, памёршы, жывуць».

●

Можна сем разоў адмераць і ні разу не адрэзаць.

●

Мухамор: «І ў бары не кожны грыб баравік».

●

Крытык пачынаючаму паэту: «Ты мне глядзі, а то і ціўкнуць не паспееш».

М. МІНЧАНКА.

Смейцеся... па-балгарску

Гумар — справа сур'ёзная... Не смяецца толькі той, хто наогул нічога не ўмее... Гэтыя і многія іншыя аналагічныя сцвярджэнні, безумоўна, маюць пад сабой рэальную аснову. Тым не менш, яны нішто ў параўнанні са славутым габраўскім перакананнем: «Свет уцалеў, таму што смяяўся». А сказаць так, габраўцы маюць усе падставы. Бо хто-хто, а яны найлепш ведаюць, што сусветны цэнтр смеху знаходзіцца... у Габраве. І самыя дасціпныя людзі — у Габраве. І пачуццё гумару найлепш за ўсё развіта... у Габраве.

З такой самаўпэўненасці і пасмяяцца можна было б, калі б так не было на самой справе. Ды што Габрава, уся Балгарыя — сонечная, гасцінная, шчырая — сёння, бадай, займае першае месца ў свеце па колькасці на душу насельніцтва ўсмешак. Каб пераканацца ў гэтым, неабавязкова збірацца ў далёкую дарогу і набываць турысцкую пуцёўку. Зрабіць гэта можна значна прасцей. Проста ўзяць і адпачыць... з байкапісцам. З балгарскім, вядома.

Дастаткова зайсці ў кнігарню і, калі пашчасціць, купіць кніжку, выпушчаную выдавецтвам «Мастацкая літаратура», якая так і называецца — «Адпачынак з байкапісцам». У ёй і змешчаны лепшыя ўзоры сучаснага балгарскага гумару. Ды не аднаго аўтара, а ажно сарака васьмі чалавек. Пачынаючы ад старэйшын Чудаміра, Дамяна Калфава, Святаслава Мінкава і канчаючы маладымі.

У аўтараў зборніка «Адпачынак з байкапісцам» ёсць і сааўтары. Гэта Ванкарэм Нікіфаровіч, які не толькі выбраў творы балгарскіх сяброў, пераклаў іх, але і не паленаваўся прадмову напісаць, і Кастусь Куксо, што там-сям усмешкі паспрабаваў растлумачыць малюнкамі.

ФРАЗЫ

У сваёй дзейнасці зрабіў паварот на 180 градусаў — перавярнуўся з боку на бок.

●

У лазні ёсць штосьці ад тэатра: яна таксама пачынаецца з раздзявалкі.

●

У дуэлі слоў колькасць часам бярэ верх над якасцю.

●

Пажаўшы лаўры, удзячны паэт скармію іх заезджанаму ім Пегасу.

●

Каб нічога не рабіць, трэба гэта добра ўмець.

●

Іншаму ўзлятаць перашкаджае вага ў грамадстве.

Ю. КУЧУРА.

— Жыве ў неглыбокіх вадаёмах, перамяшчаецца на чатырох канечнасцях і размаўляе нечленападзельна...

— Якая пустая планета!

Мал. М. ЧАРНЯЎСКАГА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856
АТ 03261

1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела грамадска-палітычнага жыцця — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-22-04, аддзела культуры — 33-19-65, аддзела інфармацыі, пісем і масавай работы — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае празаічныя творы аб'ёмам не больш як друкаваны аркуш, артыкулы, нарысы—да 15 старонак, вершаваныя творы—не больш як 100 радкоў. Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Аляксей ПЫСІН, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.